Каляндар знамянальных і памятных дат на 2019 год

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

Каляндар знамянальных і памятных дат на 2019 год

Віцебск, 2018

ББК 92.5
К 17

Складальнікі: Г. Л. Канаплёва, Л. І. Рагачова

Рэдактар: Л. І. Рагачова

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Каляндар знамянальных і памятных дат на 2018 год / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; склад. Г. Л. Канаплёва, Л. І. Рагачова. – Віцебск, 2018. – 221 с. : іл.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2018

КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ
НА 2019 ГОД

2018

Складальнікі: Канаплёва Ганна Леанідаўна, Рагачова Ларыса Іванаўна
Рэдактар Л. І. Рагачова
Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай
Дызайн вокладкі К. В. Стральцовай
Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Тыраж 3 экз.
Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, Віцебск, Леніна, 8–а
E–mail: vlib@vlib.by

ПРАДМОВА

У «Каляндар» уключаны знамянальныя і памятныя даты, якія адлюстроўваюць важныя падзеі гісторыі, палітычнага, гаспадарчага, культурнага жыцця Віцебскай вобласці, а таксама юбілейныя даты выдатных землякоў і людзей, якія па месцы нараджэння не з'яўляюцца ўраджэнцамі вобласці, але пакінулі значны след у гісторыі і культуры нашага рэгіёна.

Дапаможнік адкрываецца храналагічным пералікам знамянальных і памятных дат, якія прадстаўлены па новым стылі.

«Каляндар» састаўлены на аснове даных з энцыклапедый, даведачных, перыядычных выданняў, якія знаходзяцца ў фондзе Віцебскай абласной бібліятэкі.

Наш «Каляндар» дапаможа краязнаўцам, бібліятэчным работнікам, выкладчыкам і іншым спецыялістам у вывучэнні і распаўсюджванні краязнаўчых ведаў.

У 2019 ГОДЗЕ СПАЎНЯЕЦЦА:

1045 гадоў таму (974), згодна з «Віцебскім летапісам», быў заснаваны г. Віцебск.

990 гадоў таму (1029) нарадзіўся Усяслаў Брачыславіч (Усяслаў Чарадзей; каля 1029–1101), князь полацкі, пры якім пабудаваны Полацкі Сафійскі сабор, адзін з герояў «Слова аб палку Ігаравым».

975 гадоў таму (1044) пачалося будаўніцтва Полацкага Сафійскага сабора – помніка архітэктуры XI–XVII стст. Пабудаваны (1044–1966) з плінфы і бутавага каменя (таўшчыня сцен да 1,45 м).

960 гадоў таму (1059) першае ўпамінанне ў Ніканаўскім летапісе населенага пункта Копысь. У 1116 г. – горад Смаленскага княства. Зараз – г. п. Копысь Аршанскага раёна, прыстань на левым беразе р. Дняпро.

875 гадоў таму (1144) у г. Полацку Рагвалод Барысавіч (у праваслаўі Васілій) пры падтрымцы сваіх прыхільнікаў быў выбраны вечам на княжанне.

860 гадоў таму (1159) беларускі дойлід Іаан пабудаваў па замове Еўфрасінні Полацкай Спаса–Праабражэнскую царкву як саборны храм Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.

860 гадоў таму (1159) полацкі князь Рагвалод Барысавіч (у праваслаўі Васілій) стаў князем у Друцку.

755 гадоў таму (1264) Полацк заключыў мірны гандлёвы дагавор з Рыгай і Лівонскім ордэнам.

725 гадоў таму (1294) нарадзіўся Нарымонт, Нарымунт (у праваслаўі Глеб; каля 1294–1348), князь полацкі.

4. **Віхроў, А.** Лаўрэаты прэміі знакамітага земляка [У. Караткевіча: Сяргей Рублеўскі і Анатоль Канапелька] / А. Віхроў // Віцебскі рабочы. – 2003. – 22 лістап. – С. 1.

5. **Рублевский, С.** Сергей Рублевский: «Писатель – идеалист по определению...» / С. Рублевский ; беседовала Ю. Лихверчик // Твой Город (Витебск). – 2014. – 21 авг. – С. 22.

6. **Рублеўскі** Сяргей // Пісьменнікі Віцебшчыны : даведнік / рэд. Ф. Сіўко. – Віцебск, 2001. – С. 65–66.

7. **Рублеўскі, С. В.** Здзейсніць, што наканавана / С. В. Рублеўскі ; гутарыла Г. Шпакоўская // Витебские вести. – 2014. – 11 дек. – С. 21.

8. **Рублеўскі, С. В.** Сяргей Рублеўскі: «Нічога лепшага за журналістыку няма» / С. В. Рублеўскі ; гутарыла Г. Шпакоўская // Витебские вести. – 2017. – 14 окт. – С. 7.

9. **Рублеўскі, С. В.** Творчасць адгукнецца дабрынёй / С. В. Рублеўскі ; гутарыла Г. Шпакоўская // Витебские вести. - 2013. – 23 нояб. – С. 11.

10. **Русецкі, А.** Літаратурны «азярод» ад матэматыка Сяргея Рублеўскага / А. Русецкі // Літаратура і мастацтва. – 2004. – 17 верас. – С. 6.

(2005), «Ў, тое, што мы скарацілі» (2008), «Святло лускі» (2012), «Паспець надыхацца» (2012), «Мамін шэпт пад абразамі» (2016). У 2011 годзе пабачыла свет кніга пісьменніка «Маўчанне на ўвесь Божы свет», прысвечаная маўкліваму пратэсту жыхароў Лепельскага раёна ў час усесаюзнага перапісу 1937 года.

Сяргей Рублеўскі з'яўляецца адным з аўтараў кнігі пра гістарычнае паходжанне, узнаўленне, дзяржаўнае зацвярджэнне ў нашы дні гербаў і флагаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Віцебскай вобласці (1994–2009 гг.) «Геральдычны вянок Віцебшчыны» (2010).

Сяргей Рублеўскі – аўтар многіх публікацый у рэспубліканскай перыёдыцы. Перакладаўся на рускую і нямецкую мовы. У сваіх творах імкнецца раскрыць метафізічную існасць беларускай душы, вылучыць філасофскую складніцу разнастайных праяваў чалавечага быцця. Са стылёвых адметнасцяў найбольш вылучаюцца спробы рытмічнай арганізацыі тэксту, уважлівасць да дэталяў, пераканаўчасць псіхалагічнай экспрэсіі.

У 2003 годзе за кнігу прозы «Азярод» Сяргей Рублеўскі стаў лаўрэатам «Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама. За кнігу эсэ і мініяцюр «Паспець надыхацца» пісьменнік стаў лаўрэатам літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес-2012».

Жыве ў Віцебску.

ЛІТАРАТУРА

1. **Адамушка, У. І.** Геральдычны вянок Віцебшчыны / У. І. Адамушка, М. М. Елінская, С. В. Рублеўскі ; [прадмова С. Рублеўскага]. – Віцебск : Віцеб. абл. друк., 2010. – 94, [1] с.

2. **Алейчанка, Ю.** Іспыт на трываласць / Ю. Алейчанка // Полымя. – 2016. – № 5. – С. 187–188.

3. **Весялуха, М.** «Жыццё – не рукапіс» / М. Весялуха // Звязда. – 2016. – 2 чэрв. – С. 16.

665 гадоў таму (1354) нарадзіўся Скіргайла (у праваслаўі Іван; 1354–1394), князь полацкі, трокскі і кіеўскі. У 1377 г. пасля выгнання з Полацка князя Андрэя вялікі князь Ягайла пасадзіў там княжыць Скіргайла. У 1381 г. незадаволеныя палачане выгналі яго з княжання.

610 гадоў таму (1409) першае ўпамінанне ў гістарычных крыніцах в. Пасаднік, на месцы якой пазней узнік г. Паставы.

580 гадоў таму (1439) упершыню згадваецца горад Лепель, цэнтр Лепельскага раёна на беразе Лепельскага возера. У Лівонскую вайну (1558–1583) быў пабудаваны замак, у 1563 г. – асноўны горад.

535 гадоў таму (1484) упершыню згадваецца вёска Аршанскага раёна Смальяны як маёнтак у Аршанскім намесніцтве (з 16 ст. – у Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства ВКЛ), уладанне князя С. І. Бельскага.

515 гадоў таму (1504) упершыню ў пісьмовых крыніцах згадваецца населены пункт Ветрына Полацкага раёна.

515 гадоў таму (1504) утварылася Полацкае ваяводства.

515 гадоў таму (1504) першыя пісьмовыя звесткі пра Чашнікі.

515 гадоў таму (1504) закладзены Іказненскі замак браслаўскім старастам Я. Сапегам. Існаваў у XVI–XVII стст. у в. Іказнь Браслаўскага раёна.

505 гадоў таму (1514) упершыню ў летапісах Дуброўна ўпамінаецца як горад.

505 гадоў таму (1514) у літоўскай метрыцы ўпершыню ўпамінаецца Глыбокае.

505 гадоў таму (1514) упершыню згадваецца горад Мёры (цэнтр Мёрскага раёна) як маёнтак ў Браслаўскім павеце ВКЛ на беразе возера Мёрскае.

485 гадоў таму (1534) нарадзіўся Гваньіні, Гвагнін Аляксандр (1534–1614), польскі гісторык, камендант Віцебска. З 1561 г. удзельнічаў у Інфлянцкай вайне (1558–1583). Ураджэнец г. Верона (Італія).

485 гадоў таму (1534) упершыню згадваецца горад Сянно як мястэчка ў ВКЛ.

475 гадоў таму (1544) нарадзіўся Глябовіч Ян Янавіч (1544–1590), ваенны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ герба «Ляліва». У Інфлянцкую вайну 1558–1582 вызначыўся пры абароне Полацка ад войска Івана IV, трапіў у палон.

465 гадоў таму (1554) складзены інвентар (апісанне) Браслава.

455 гадоў таму (1564) адбылася Аршанская бітва 1564 у канцы студзеня або пачатку лютага паміж авангардам арміі Маскоўскай дзяржавы і атрадам войска ВКЛ падчас Лівонскай вайны 1558–1583.

440 гадоў таму (1579) адбылася асада і ўзяцце г. Полацка войскамі ВКЛ.

440 гадоў таму (1579) адбылася асада Езярышчанскага замка войскамі Стэфана Баторыя.

420 гадоў таму (1599) была пабудавана Белацаркоўская Троіцкая царква на месцы драўлянага храма пры базыльянскім манастыры ў в. Белая Царква Чашніцкага раёна – помнік архітэктуры ранняга барока. У 1830–я гады разбурана.

415 гадоў таму (1604) заснаваны Львом Сапегам касцёл у Талачыне, які потым быў пераўтвораны ва ўніяцкую царкву.

415 гадоў таму (1604) пабудавана Пакроўская царква. У 1768–1769 гг. заснаваны Талачынскі Пакроўскі манастыр базыльянаў, на месцы былой царквы пачата ўзвядзенне новага каменнага храма, а побач з ім – каменнага кляштарнага корпуса (будаўніцтва завершана ў 1779 г.). У 2004 г. у захаваных будынках адкрыты Пакроўскі жаночы манастыр.



РУБЛЕЎСКІ СЯРГЕЙ ВАСІЛЕВІЧ

65 год з дня нараджэння (1954)

Рублеўскі Сяргей Васілевіч нарадзіўся 24 снежня 1954 года ў в. Бабча Лепельскага раёна. Празаік і паэт, журналіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (2001).

Вучыўся ў Бароўскай сярэдняй школе, на фізіка-матэматычным факультэце Віцебскага педінстытута. Пасля вучобы працаваў настаўнікам у Капыльскім раёне. З 1978 года ў журналістыцы. Працаваў у Бешанковіцкай раённай газеце «Зара», у Талачынскай – «Сцяг Ільіча», у абласной – «Віцебскі рабочы». У 1990–2008 гг. – галоўны рэдактар віцебскай абласной газеты «Народнае слова», у 2008–2013 гг. – загадчык аддзела па архівах і справаводству галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама.

Літаратурнай творчасцю пачаў займацца са школьных гадоў. Аўтар кніг прозы «Апостраф» (2000), «Азярод» (2003), «Абмытыя валуны»

5. **Мароз, М.** Сын крыніцы і вольхі шэрай... / М. Мароз // Герой працы (Шуміліна). – 2009. – 17 лістап. – С. 5.

6. **Сакалоў, А.** Узнагарода – шумілінскаму пісьменніку / А. Сакалоў // Герой працы (Шуміліна). – 2017. – 26 верас. – С. 4.

7. **Улютенко, В. В.** Врач с литературной прививкой / В. Улютенко ; беседовала Г. Шпаковская // Витебские вести. – 2017. – 7 окт. – С. 11.

8. **Фондаренко, Н.** «Письмена не умеют молчать» / Н. Фондаренко // Витебские вести. – 2013. – 17 дек. – С. 6.

410 гадоў таму (1609) нарадзіўся Сапега Павел Ян (1609–1665), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ, у 1646–1656 гг. – ваявода віцебскі.

410 гадоў таму (1609) нарадзіўся Андрайкевіч Ян Андрэй (сапр. Гінтаўт-Андрайкевіч; 1609–1673), беларускі рэлігійны дзеяч, пісьменнік, педагог, прэфект бібліятэкі Полацкага калегіума (1631–1633), рэктар Полацкага калегіума (1650–1653).

390 гадоў таму (1629) нарадзіўся Сімяон Полацкі (сапр. Пятроўскі-Сітняновіч Самуіл Гаўрылавіч; 1629–1680), пісьменнік, філосаф-асветнік, паэт, драматург, грамадскі і царкоўны дзеяч, ураджэнец г. Полацка.

380 гадоў таму (1639) у Глыбокім было пачата будаўніцтва касцёла Успення Багародзіцы кляштара ордэна кармелітаў босых з каменю на паўночным беразе возера Вялікае па фундацыі мсціслаўскага ваяводы І. Корсака. У 1867 г. рэканструяваны, у 1878 г. пераасвечаны ў царкву. Зараз – Глыбоцкі кафедральны Сабор Раства Багародзіцы – помнік архітэктуры позняга барока.

375 гадоў таму (1644) у Віцебску пабудаваны драўляны Пушкінскі («Рынкаўскі», «Гарадскі», «Езуіцкі») мост.

370 гадоў таму (1649) складзена адзінае вядомае апісанне Браслаўскага замка.

370 гадоў таму (1649) князь Геранім Друцкі-Саколінскі ўзвёў у г. Оршы мураваны касцёл дамініканцаў (касцёл Святога Іосіфа Абручніка).

365 гадоў таму (1654) у Віцебску драўляны касцёл езуітаў на тэрыторыі Ніжняга замка перабудаваны ў праваслаўны Аляксееўскі манастыр.

365 гадоў таму (1654) адбылася асада і штурм царскімі войскамі г. Дуброўна.

365 гадоў таму (1654) Віцебск наведаў цар Аляксей Міхайлавіч.

365 гадоў таму (1654) згадваецца як мястэчка гарадскі пасёлак Лёзна – цэнтр Лёзненскага раёна.

355 гадоў таму (1664) нарадзіўся Грабніцкі Фларыян (1664–1762), уніяцкі царкоўны дзеяч Рэчы Паспалітай, доктар тэалогіі, каад'ютар (намеснік) архіепіскапа полацкага, епіскап віцебскі (1716–1719), архіепіскап полацкі (1719–1762), мітрапаліт кіеўскі (1748–1762). Паходзіў са шляхецкай сям'і Полацкага ваяводства.

350 гадоў таму (1669) заснавана праваслаўнае брацтва пры віцебскай царкве Успення Прасвятой Багародзіцы.

345 гадоў таму (1674) нарадзіўся Дзягілевіч Уладзіслаў (1674–1714), беларускі архітэктар. Скончыў Полацкі езуіцкі калегіум (1695–1698). Працаваў у Оршы (1704–1705; 1707–1709).

315 гадоў таму (1704) Баранская Спаса–Праабражэнская царква была пабудавана ў мястэчку Барань (зараз горад Аршанскага раёна).

305 гадоў таму (1714) у в. Губіна Лепельскага раёна пабудаваны Губінскі Антоніеўскі касцёл з цэглы – помнік архітэктуры барока.

305 гадоў таму (1714) пабудаваны мураваны кляштар трынітарыяў у г. Оршы.

285 гадоў таму (1734) нарадзіўся Лісоўскі Іраклій (свецкае імя Іосіф; 1734–1809). У 1784–1809 гг. – полацкі уніяцкі архіепіскап, у 1806–1809 гг. – мітрапаліт уніяцкай царквы ў Расійскай імперыі, ураджэнец Полацкага ваяводства.

280 гадоў таму (1739) нарадзіўся Бжастоўскі Павел Ксаверы (1739–1827), дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, рэфарматар, мецэнат, перакладчык, заснавальнік першай у Еўропе «сялянскай рэспублікі», ураджэнец Глыбоцкага раёна.

Аўтар кніг «Пятенка. Православные храмы Шумилинщины» (2007), «Светлозор» (2008), «Православие на Шумилинщине» (2009), «Августовская купель» (2010), «В краю каменных исполинов» (2012), «Камни говорят» (2013), «Камнецвет не увядает» (2016), «Валуны родной сторонки» (2017), «По следам месяцеслова» (2018 г.). У суаўтарстве з Фрыдрыхам Анапрыенкам была выдадзена кніга «Богатыри Приобольского края» (2017 г.). Аўтар серыі дзіцячых праваслаўных кніг «Детям о…». З'яўляецца адным з аўтараў зборнікаў «Наша Шуміліншчына. Шуміліназнаўства» (2010), «Письмена не умеют молчать» (2013), «Это было…» (2015).

Многія творы Віктара Васільевіча прысвечаныя духоўным каштоўнасцям, праваслаўным святыням. За літаратурную дзейнасць ён узнагароджаны памятным знакам «2000 лет Христианству», Граматай Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяя Беларусі Філарэта.

Віктар Улюценка – лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2015). У 2017 годзе пісьменнік адзначаны вышэйшай узнагародай Саюза пісьменнікаў Беларусі – медалём «За вялікі ўклад у літаратуру».

Жыве ў г. п. Шуміліна.

ЛІТАРАТУРА

1. **Григорьева, Л.** «По следам месяцеслова» / Л. Григорьева // Герой працы (Шуміліна). –2018. – 11 верас. – С. 4.

2. **Дзяхцяр, М.** Ісціна и родны дом: філасофия беларускіх публіцыстаў / М. Дзяхцяр // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 25 жн. – С. 10.

3. **Ермалаеў, С.** Прэмія імя Петруся Броўкі – у Антона Параскевіна. / С. Ермалаеў // Герой працы (Шуміліна). – 2016. – 3 мая. – С. 1.

4. **Краснова-Гусаченко, Т.** Камни берегут память о прошлом / Т. Краснова-Гусаченко // Народнае слова. – 2013. – 13 чэрв. – С. 15.

Лістапад

УЛЮЦЕНКА
ВІКТАР ВАСІЛЬЕВІЧ
(АНТОН ПАРАСКЕВІН)

70 год з дня нараджэння

Улюценка Віктар Васільевіч (псеўданім Антон Параскевін) нарадзіўся 22 лістапада 1949 года ў г. п. Шуміліна. Краязнаўца, калекцыянер, урач, паэт, празаік, член Беларускага саюза журналістаў, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Скончыў Шумілінскую сярэднюю школу № 1, Полацкае медыцынскае вучылішча (1971), Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (1982), клінічную ардынатуру пры Віцебскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце (1988). У 1983–1986 гг. – галоўны ўрач Шумілінскай гарпасялковай бальніцы, з 1986 г. – загадчык тэрапеўтычнага аддзялення Шумілінскай цэнтральнай райбальніцы, урач-кардыёлаг.

Як краязнаўца даследуе гісторыю і культуру Шуміліншчыны, помнікі гісторыі і архітэктуры.

275 гадоў таму (1744) у в. Лужкі Шаркаўшчынскага раёна пабудаваны касцёл Святога Міхаіла Архангела пры кляштары піяраў, помнік архітэктуры позняга барока. У 1843 г. – перабудаваны.

270 гадоў таму (1749) упершыню згадваеца вёска Дабрамыслі Лёзненскага раёна на рацэ Чарніца як сяло Аршанскага павета ВКЛ.

260 гадоў таму (1759) у Верхнядзвінскім раёне пры манастыры міласэрных сясцёр пабудаваны Асвейскі манастырскі шпіталь, помнік архітэктуры з элементамі стылю барока.

255 гадоў таму (1764) нарадзілася Карніцкая Магдалена (па мужу і сцэнічнае прозвішча Дырэнталь), танцоўшчыца, ураджэнка г. Паставы.

255 гадоў таму (1764) у Глыбокім было пачата будаўніцтва касцёла Святой Тройцы – помніка архітэктуры віленскага барока. У 1902–1908 гг. – перабудаваны.

250 гадоў таму (1769) быў закладзены Бачэйкаўскі парк на ўсходнім беразе ракі Ула Бешанковіцкага раёна.

250 гадоў таму (1769) пачата будаўніцтва Дунілавіцкага Троіцкага касцёла на месцы былога драўлянага храма ў в. Дунілавічы Пастаўскага раёна. Завершана ў 1773 г.

250 гадоў таму (1769) заснаваны Талачынскі Пакроўскі манастыр базыльянаў, помнік архітэктуры віленскага барока. На месцы былой Пакроўскай царквы пачата ўзвядзенне новага каменнага храма (будаўніцтва завершана у 1779 г.). У 2004 г. у захаваных будынках адкрыты Пакроўскі жаночы манастыр.

245 гадоў таму (1774) акадэмікам І. Е. Старавым распрацаваны першы план развіцця і рэканструкцыі г. Віцебска.

245 гадоў таму (1774) узведзены мураваны базыльянскі кляштар у г. Оршы.

245 гадоў таму (1774) утворана Полацкая ўніяцкая духоўная кансісторыя – орган царкоўна–адміністрацыйнага кіравання, які існаваў у Полацкай ўніяцкай архідыяцэзіі ў 1774–1839 гг.

245 гадоў таму (1774) у в. Лявонпаль Мёрскага раёна пабудавана Лявонпальская Троіцкая царква, помнік драўлянага дойлідства з рысамі стылю барока.

240 гадоў таму (1779) нарадзіўся Маеўскі Сяргей Іванавіч (1779–1849), военачальнік, мемуарыст, генерал-маёр, ураджэнец Полацкага раёна.

230 гадоў таму (1789) адбылося адкрыццё народнага вучылішча ў Полацку.

230 гадоў таму (1789) нарадзіўся Лужынскі Васіль (свецкае імя Бенядзікт Стафанавіч; 1789–1879), доктар багаслоўя (1825). Уніяцкі, потым праваслаўны царкоўны дзеяч, адзін з ініцыятараў Полацкага царкоўнага сабора (1839). Ураджэнец в. Старая Рудня Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці.

225 гадоў таму (1794) нарадзіўся Баршчэўскі Ян (1794–1851), пісьменнік, ураджэнец Расонскага раёна.

225 гадоў таму (1794) у в. Лужкі Шаркаўшчынскага раёна пабудавана з цэглы Лужкоўская царква Раства Багародзіцы, помнік архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму.

225 гадоў таму (1794) нарадзіўся Сухазанет Мікалай Ануфрыевіч (1794–1871), расійскі ваенны дзеяч, генерал артылерыі. У Айчынную вайну 1812 удзельнічаў у баях каля в. Клясціцы Расонскага раёна, на рацэ Сівошына, у Свольненскім баі каля Полацка, Чашнікаў, Віцебска.

225 гадоў таму (1794) нарадзіўся Хршчановіч Казімір Вікенцій (1794–1871), беларускі архітэктар, ураджэнец маёнтка Бястроск каля былой в. Шунеўка Докшыцкага раёна.

6. **Кокштыс** Тадеуш Антонович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 502–503.

7. **Кокштыс** Тадеуш Антонович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2007. – Т. 4 : Картография–Миноговые. – С. 132.

8. **Кокштыс** Тадэвуш Антонавіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал.: У. Ю. Аляксандраў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2013. – Т. 4 : З–Л. – С. 524.

9. **Леонович, Ю**. Талант живет в Витебске / Ю. Леонович // Советская Белоруссия. – 2014. – 28 марта. – С. 1, 4.

10. **Пастернак, Т**. Выход на бис / Т. Пастернак // Витебские вести. – 2014. – 6 нояб. – С. 15.

11. **Пастернак, Т.** Обладатель «Хрустальной Павлинки» / Т. Пастернак // Витебские вести. – 2014. – 29 марта. ‑ С. 24.

12. **Плешчанка, М.** Пражытыя ролі Тадэвуша Кокштыса. Не апошнія / М. Плешчанка // Витебский проспект. – 2013. – 7 февр. – С. 6.

13. **Сцяпура, Н**. «Паўлінка» для Труфальдзіна / Н. Сцяпура // Рэспубліка. – 2014. – 29 сак. – С. 9.

14. **Тадэвуш Кокштыс** // І смех, і слёзы, і любоў... (ад ранку да вечара ў тэатры): да 85-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа / рэд.: С. М. Дашкевіч, М. Л. Пятрова ; фота Г. А. Жыгур. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2011. – [С. 33].

15. **Тадэвуш Кокштыс** // Коласаўцы: да 80-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа : альбом / рэд.: Л. Грамыка, С. Дашкевіч. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2006. – С. 40–41.

16. **Цімошык, Л**. Пануе Тадэвуш / Л. Цімошык // Звязда. – 2014. – 1 лістап. – С. 3.

В. Дуніна-Марцінкевіча, дзе высока быў ацэнены тэатральнай грамадскасцю створаны акцёрам вобраз архібіскупа Іосіфа III.

Тадэвуш Антонавіч здымаўся ў кіно і тэлефільмах: «Палеская хроніка» (1982), «Знак бяды» (1986), «Чырвоны востраў» (1991), «Маленькі баец» (1998), «Зорка Венера» (2000), «Фабрыка мрояў» (2004), «Нядзеля ў жаночай лазні» (2005), «Талаш» (2011).

Кокштыс Тадэвуш Антонавіч узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, ордэнам «Знак пашаны», медалём «Ветэран працы», ганаровымі граматамі і граматамі Вярхоўнага Савета БССР, знакамі і ганаровай граматай Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, падзякай прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», прэміяй імя Ігната Буйніцкага Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускага саюза тэатральных дзеячаў, дыпломам Міжнароднага тэатральнага фестывалю «Прыбалтыйская тэатральная вясна» (Вільнюс, Літва), прызам Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка».

ЛІТАРАТУРА

1. **Грамыка, Л**. Чалавек, цікавы сам сабе / Л. Грамыка // Мастацтва.. – 2005. – № 6. – С. 30–33.

2. **Іваноўск**і, **В. С**. Кокштыс Тадэвуш Антонавіч / В. С. Іваноўскі // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2002. – Т. 1 : А–К. – С. 530–531.

3. **Кокштыс, Т.** Пакуты ўзнясення / Т. Кокштыс // Літаратура і мастацтва. – 2009. – 20 лістап. – С. 10.

4. **Кокштыс, Т**. «Вы не ролю сыгралі, а лёс...» / Т. Кокштыс ; гутарыў Ю. Іваноўскі // Культура. – 2014. – 25 кастр. – С. 6.

5. **Кокштыс, Т. А**. Служыць тэатру, адзінаму ў жыцці / Т. А. Кокштыс ; гутарыў В. Сянькоў // Витьбичи. – 2014. – 6 нояб. – С. IV.

220 гадоў таму (1799) Свяцейшы Сінод Рускай Праваслаўнай Царквы заснаваў сабор у Оршы.

220 гадоў таму (1799) была пабудавана Віцебская Мікалаеўская царква (1799–1904). У 1853 г. – перабудавана.

210 гадоў таму (1809) пабудаваны Верхнядзвінскі касцёл Нараджэння Дзевы Марыі з цэглы – помнік архітэктуры класіцызму (у 1867 г. – адноўлены, у 1980–я гг. – рэстаўрыраваны).

210 гадоў таму (1809) пабудавана Дубровенская Троіцкая царква з цэглы, помнік архітэктуры класіцызму.

210 гадоў таму (1809) пабудаваны ў г. Дуброўна на месцы былога драўлянага манастыра Дубровенскі касцёл і манастыр бернардзінцаў.

210 гадоў таму (1809) нарадзіўся Паклеўскі-Козел Альфонс Фаміч (1809–1890), расійскі прадпрымальнік, мецэнат, ураджэнец в. Быкаўшчына Полацкага раёна.

205 гадоў таму (1814) у Віцебску пры трынітарскім кляштары пачалося будаўніцтва мураванага касцёла ў гонар Ісуса. Пабудаваны ў 1821 г.

205 гадоў таму (1814) пабудаваны першы мураваны мост цераз р. Віцьбу ў г. Віцебску.

200 гадоў таму (1819) у г. Верхнядзвінску пабудавана Мікалаеўская царква з цэглы – помнік архітэктуры класіцызму.

200 гадоў таму (1819) у Полацку створана пажарная служба.

195 гадоў таму (1824) быў пабудаваны Браслаўскі касцёл Нараджэння Дзевы Марыі – помнік архітэктуры неараманскага стылю.

190 гадоў таму (1829) у г. Віцебску жыў і працаваў Грыгаровіч Іван Іванавіч (1790–1852), настаўнік Аляксандраўскай гімназіі, рэктар павятовага і прыходскага вучылішчаў, археограф і гісторык царквы, протаіерэй.

190 гадоў таму (1829) нарадзіўся Карчэўскі Мікалай Фёдаравіч (1829–1897), беларускі архітэктар, ганаровы член Віцебскага губернскага папячыцельства дзіцячых прытулкаў (1873–1884). У 1870–1885 гг. працаваў губернскім архітэктарам у г. Віцебску.

185 гадоў таму (1834) заснавана Віцебская настаўніцкая семінарыя – першая на Беларусі спецыяльная навучальная ўстанова. Існавала да 1839 г.

185 гадоў таму (1834) заснавана Гарадоцкае пачатковае вучылішча.

180 гадоў таму (1839) адбыўся Полацкі царкоўны сабор, сход іерархаў уніяцкай царквы на Беларусі і Украіне (у межах Расійскай імперыі), які прыняў рашэнне аб яе далучэнні да Рускай Праваслаўнай Царквы.

175 гадоў таму (1844) быў створаны Віцебскі балет Піёна (1844–1847).

175 гадоў таму (1844) пабудаваны каменны Праабражэнскі сабор у г. Лепелі.

165 гадоў таму (1854) нарадзілася Гардзялкоўская Тэрэза (1854–1933), беларуская перакладчыца, выдавец. У 1908 г. арганізавала ў сядзібе Габрылёва-Папоўка (зараз – Талачынскі раён) беларускую школу, у якой настаўнікам працаваў Я. Колас.

165 гадоў таму (1854) пабудавана дарога Віцебск–Смаленск.

155 гадоў таму (1864) узведзена мураваная Аляксееўская царква ў в. Смаляны Аршанскага раёна.

155 гадоў таму (1864) пачаў будавацца Храм Уваскрасення Хрыстовага з цэглы ў г. Дзісне на Мёршчыне – помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

155 гадоў таму (1864) у в. Цвеціна Мёрскага раёна было пачата будаўніцтва Цвецінскай Крыжаўздзвіжанскай царквы з цэглы (1864–1867), помніка архітэктуры рэтраспектыўнага стылю.

150 гадоў таму (1869) у Оршы адкрыта тэлеграфная станцыя.

«Летась у Чулімску» А. Вампілава), Пан Сюч («Тэлевізійныя перашкоды» А. Сакані), Расплюеў («Вяселле Крачынскага» А. Сухаво-Кабыліна), Эўгеніюш («Танга» С. Мрожака), граф Шэндорф («Рэцэпт Макропуласа» К. Чапека).

Створаныя ім вобразы вылучаюцца завершанасцю, дакладнымі сцэнічнымі дэталямі, глыбокім драматызмам, жыццёвай верагоднасцю і пераканаўчасцю: Станіслаў Касінскі («Званы Віцебска» У. Караткевіча), Жабрак («Сымон-музыка» паводле Я. Коласа), Салянік («Радавыя» А. Дударава), Ютка Казубоўскі («Вежа» Дударава і У. Някляева), Земляніка («ЧП-1» і «ЧП-2» паводле М. Гогаля), Жалтухін («Касатка» А. Талстога), Блазан («Кароль Лір» У. Шэкспіра), Качкароў («Жаніцьба» Гогаля), Кашон («Жаваранак» Ж. Ануя), Стары («Кацігарошак» В. Маслюка), Сыракваш («Плошча перамогі» А. Паповай), Сганарэль («Лекар мімаволі» Ж. Б. Мальера).

Высокім майстэрствам, глыбінёй вызначыўся створаны Кокштысам Т. А. трагікамічны вобраз Гастрыта ў спектаклі «Вечар» А. Дударава.

Сярод роляў: Марат («Мой бедны Марат» А. Арбузава), Гаспадар, Яўмен («Жарты» («Конскі партрэт» Л. Радзевіча, «Мікітаў лапаць» М. Чарота), Жамгуліс («Клеменс» К. Саі), Тарас («Тарас на Парнасе» К. Вераніцына), Качкароў («Вяселле» М. Гогаля), Капулецці («Чума на абодва вашых дамы» Г. Горына), Лекар («Бацька» А. Стрындберга), Саша Суэцін, Вася Саўльчанка («Апошнія сведкі» па аднайменнай дакументальна-мастацкай кнізе С. Алексіевіч), Круціцкі («Мудрацы…» па п’есе А. Астроўскага «На кожнага мудраца даволі прастаты»), Стары («Бездань» па п’есе Р. Брэдбері «Чыкагская бездань») і іншыя.

Ролі ў рэпертуары: Юстын, бурмістр («Хрыстос прызямліўся ў Гародні» па аднайменнаму раману У. Караткевіча), Мацье («Самая жаданая» па п’есе С. Гіргеля «Самая-самая» па матывах французскай драматургіі), Стары, Курыла, Жабрак, дзед Даніла («Сымон-музыка» па аднайменнай паэме Я. Коласа).

Са спектаклем «Кракаўскі студэнт» Тадэвуш Кокштыс удзельнічаў у Міжнародным тэатральным фестывалі нацыянальнай драматургіі імя

КОКШТЫС

ТАДЭВУШ АНТОНАВІЧ

85 год з дня нараджэння (1934)

Кокштыс Тадэвуш Антонавіч нарадзіўся 31 кастрычніка 1934 года ў вёсцы Хоўхлава Маладзечанскага раёна. Беларускі акцёр. Народны артыст Беларусі (1984). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986).

Тадэвуш Кокштыс працуе ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа з 1958 года пасля сканчэння Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (курс прафесара Д. Арлова). На Коласаўскай сцэне сыграў больш за 150 роляў.

Яго творчасці ўласціва спалучэнне вострасатырычных фарбаў і прыёмаў падкрэсленага камізму, набліжанага да гратэску і буфанады, з арганічнай агульнай мяккай манерай выканання. Стварыў па-мастацку закончаныя, каларытныя характары: Другі шляхцюк («Несцерка» В. Вольскага), Лапчанка («Іркуцкая гісторыя» А. Арбузава), Дыдзіс («Ветрык, вей!» Я. Райніса), Салдат («Вайна пад стрэхамі» паводле А. Адамовіча), Вартавы («Шостага ліпеня» М. Шатрова), Кічкайла («Амністыя» М. Матукоўскага), Шаргаёў («Парог» А. Дударава), Мордка («Залёты» В. Дуніна-Марцінкевіча).

З лёгкасцю, артыстызмам, камедыйным бляскам выконваў ролі Труфальдзіна («Слуга двух гаспадароў» К. Гальдоні), Благае («Доктар філасофіі» Б. Нушыча), Угараў і Мячоткін («Правінцыяльныя анекдоты» і

150 гадоў таму (1869) нарадзіўся Пшчолка Аляксандр Раманавіч (1869–1943), пісьменнік, публіцыст, этнограф, фалькларыст. Ураджэнец в. Чарсцвяды Ушацкага раёна.

150 гадоў таму (1869) адкрыта Ёдскае народнае вучылішча ў Шаркаўшчынскім раёне.

150 гадоў таму (1869) нарадзіўся Малянтовіч Павел Мікалаевіч (1869–1940), палітычны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, юрыст, ураджэнец г. Віцебска.

145 гадоў таму (1874) нарадзіўся Суліма-Самойла Андрэй Фаміч (1874–1933), вучоны–гігіеніст, доктар медыцынскіх навук, ураджэнец г. Полацка.

145 гадоў таму (1874) нарадзіўся Сумарокаў Аляксандр Аляксандравіч (1874–1969), акцёр, рэжысёр. У 1919–1921 гг. жыў і працаваў у Віцебску.

145 гадоў таму (1874) пачало дзейнічаць Таварыства віцебскіх урачоў, створанае па ініцыятыве выконваючага абавязкі інспектара ўрачэбнай управы Ф. П. Купчынскага. З перапынкамі дзейнічала да 1914 г.

145 гадоў таму (1874) пачала выдавацца газета Полацкай праваслаўнай духоўнай кансісторыі «Полоцкие епархиальные ведомости». Выдавалася да 1917 г.

145 гадоў таму (1874) створана Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя як Віцебскае медыцынскае таварыства. У пачатку 1917 г. створаны прафесійны саюз урачоў г. Віцебска і Віцебскай губерні, у пачатку 1905 г. створаны прафсаюз аптэчных работнікаў Віцебска, у красавіку 1917 г. – прафсаюз сясцёр міласэрнасці г. Віцебска і Віцебскай губерні, які існаваў да студзеня 1919 г. У сувязі з заснаваннем адзінага саюза медыцынскіх работнікаў «Всемедикосантруд» у Віцебску у

1919 г. створаны губернскі аддзел гэтага саюза, у жніўні 1924 г. – Віцебскае акруговае аддзяленне прафсаюза работнікаў медыка–санітарнай справы, у 1948 г. абласны камітэт прафсаюза медыцынскіх работнікаў увайшоў у склад Віцебскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў.

140 гадоў таму (1879) пабудавана Расонская царква ў гонар Узнясення Гасподняга з бутавага каменя, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю. У 1990-я гг. – адрэстаўрыравана.

135 гадоў таму (1884) выйшла ў свет кніга А. П. Сапунова «Историческая записка 75-летия Витебской гимназии».

135 гадоў таму (1884) першае згадванне пра Полацкі вінаробны завод як «Полацкая вінакурня».

130 гадоў таму (1889) Віцебск наведаў рускі пісьменнік Іван Бунін (1870–1953).

130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Калнін Аўгуст Янавіч (1889–1941), дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, старшыня Віцебскага губпрафсавета (1922–1923), загадчык аддзела мясцовай гаспадаркі Віцебскага губкама партыі (1923–1924), ураджэнец в. Відземе (Латвія).

130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Фогт Фёдар Адольфавіч (1889–1939), мастак-графік, акварэліст, педагог. З 1928 г. – у Віцебскім мастацкім вучылішчы (намеснік дырэктара, кіраўнік майстэрні графічнага мастацтва), ініцыятар і арганізатар графічнага аддзялення, ураджэнец г. Санкт–Пецярбурга.

125 гадоў таму (1894) у Віцебску быў пракладзены вадаправод.

125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Лагун Іосіф Васілевіч (1894–1920), удзельнік барацьбы за савецкую ўладу на Беларусі, ураджэнец Шаркаўшчынскага раёна.

лістапада 2012 г., Віцебск / рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2013. – С. 214–215.

5. **Коллекция** Антона Бродовского (1859–1928) = Antono Brodovskio (1859–1928) kolekcija = Antonas Brodovskis' (1859–1928) collection : каталог выставки, проходившей с 16 мая до 2 июня 2015 г. в музее Зарасайского края / [сост. И. Вайткявичене]. – Utena : Leidykla Spaustuve, 2015. – 63 с.

6. **Падліпскі, А. М**. Брадоўскі Антон Рафаілавіч / А. М. Падліпскі // Энцыклапедыя гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя Петруся Броўкі, 1994. – Т. 2 : Беліцк–Гімн. – С. 64–65.

7. **Падліпскі, А. М**. Заснавальнік віцебскага музея / А. М. Падліпскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 2. – С. 19–20.

8. **Рудёнок, А**. Орден для элиты / А. Рудёнок // Витебские вести. – 2018. – 18 окт. – С. 21.

9. **Соловьева, С. В**. Предметы еврейского костюма из коллекции А. Р. Бродовского / С. В. Соловьева // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага, Віцебск, 22–23 кастр. 2009 г. / рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 246–251.

10. **Шишанов, В**. «Плюшкин» из Петронишек / В. Шишанов // Витебский проспект. – 2006. – 1 июня. – С. 3.

11. **Шишанов, В. А**. Штрихи к биографии А. Р. Бродовского / В. А. Шишанов // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага, Віцебск, 22–23 кастр. 2009 г. / рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 236–240.

12. **Шишанов, В. А**. Музей и нумизматическая коллекция А. Р. Бродовского / В. А. Шишанов // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2009. – С. 184–199.

музей ужо прымаў наведвальнікаў. У 1921 годзе Брадоўскаму было прысвоена званне Героя працы.

У 1924 годзе музею было перададзена памяшканне віцебскай ратушы, дзе Антон Рафаілавіч атрымаў пасаду навуковага супрацоўніка. Ён актыўна ўдзельнічаў у асветніцкай і краязнаўчай працы: чытаў лекцыі ў клубах, воінскіх часцях, навучальных установах. У 1919–1924 гадах – член Віцебскай камісіі па ахове помнікаў гісторыі і мастацтва. У 1924–1928 гадах – член Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства.

У пачатку сакавіка 1928 года Брадоўскі Антон Рафаілавіч цяжка захварэў і 17 сакавіка памёр у Віцебску.

ЛІТАРАТУРА

1. **Акуневич, О. И**. Художественные произведения в коллекции А. Р. Бродовского / О. И. Акуневич // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага, Віцебск, 22-23 кастр. 2009 г. / рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 252–258.

2. **Ануфриева, О. В.** Часы из собрания А. Р. Бродовского / О. В. Ануфриева // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага, Віцебск, 22-23 кастр. 2009 г. / рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 240–245.

3. **Бамбешка, І. І**. Фарміраванне прыватных калекцый на Віцебшчыне ў канцы XVIII – пачатку XX ст. / І. І. Бамбешка // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковых канферэнцый, [20–21 кастрычніка 2011 г., 14–15 лістапада 2012 г., г. Віцебск] / рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2013. – С. 106–110.

4. **Колесинский, В. Ф.** Рубль Иоанна Антоновича из коллекции А. Р. Бродовского / В. Ф. Колесинский // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковых канферэнцый, [20–21 кастрычніка 2011 г., 14–15

125 гадоў таму (1894) была пабудавана мураваная Пастаўская Мікалаеўская царква – помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

125 гадоў таму (1894) Віцебскае аддзяленне Расійскага таварыства веласіпедыстаў-турыстаў правяло ў горадзе спаборніцтвы на лепшага ездака.

120 гадоў таму (1899) адбыўся першы з'езд урачоў Віцебскай губерні.

120 гадоў таму (1899) Віцебская група РСДРП выдала сваю першую лістоўку «К витебским рабочим».

120 гадоў таму (1899) у Оршы адкрылася публічная гарадская бібліятэка імя А. Пушкіна.

120 гадоў таму (1899) пачаў дзейнічаць цагельны завод «Зархі». У 1908 г. на прадпрыемстве працавала 35 рабочых.

120 гадоў таму (1899) пад уплывам Віцебскага сацыял-дэмакратычнага камітэта Бунда ў Віцебску адбыліся выступленні рабочых. Побач з экалагічнымі выстаўляліся і палітычныя патрабаванні.

120 гадоў таму (1899) пачаў дзейнічаць Віцебскі тэатр Дзянісава (1899–1900).

120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Рыскін Арон Барысавіч (1899–1984), прафсаюзны і партыйны дзеяч. З 1923 г. – сакратар Магілёўскіх павятовага і акруговага, Віцебскага акруговага камітэтаў КП(б)Б. Ураджэнец в. Ціхінічы Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці.

120 гадоў таму (1899) нарадзілася Марусевіч Алена Карлаўна (1899–?), прафсаюзны і дзяржаўны дзеяч. З 1915 г. – матальшчыца, у 1925–1928 гг. – арганізатар Віцебскай ільнапрадзільнай фабрыкі «Дзвіна». Ураджэнка г. Вільнюс (Літва).

115 гадоў таму (1904) у Віцебску заснавана бібліятэка-філіял № 4 імя А. Пушкіна.

115 гадоў таму (1904) у Віцебску адбыліся гастролі актрысы Малога тэатра А. А. Яблачкінай (1866–1964).

115 гадоў таму (1904) у Віцебску адбыліся гастролі спявачкі А. Д. Вяльцавай (1817–1913).

115 гадоў таму (1904) зняты натурны план г. Віцебска (склаў каморнік Г. А. Маісееў), які ў якасці дадатка з каментарыямі А. П. Сапунова быў змешчаны ў «Памятной книжке Витебской губернии на 1905 год».

115 гадоў таму (1904) Д. П. Яфімаў выдаў у Маскве серыю паштовак з выявамі Оршы.

115 гадоў таму (1904) на Браслаўшчыне было пачата будаўніцтва Відзаўскага касцёла Нараджэння Дзевы Марыі з чырвонай цэглы на месцы былога храма 1481 года.

110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Маісееў Стэфан Сяргеевіч (1909–1988), географ, астраном. У 1940–1941, 1945–1974 гг. працаваў у Магілёўскім педагагічным інстытуце (з 1997 года – Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова). Стварыў адзін з першых у СССР пункт па назіранні за штучнымі спадарожнікамі Зямлі (1957), вынаходнік дзясяткаў мадэляў, у т.л. нябеснай сферы для адначасовай дэманстрацыі сучаснага і гадавога руху Зямлі. Ураджэнец м. Копысь Аршанскага раёна.

110 гадоў таму (1909) у Віцебску выдавалася інфармацыйна-рэкламная газета «Витеблянин». Вядомы 4 нумары.

110 гадоў таму (1909) выдадзена першая каляровая паштоўка «Орша. Мост цераз Дняпро».

110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Канашэнка Сцяпан Мікалаевіч (1909–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец в. Узніцы Полацкага раёна.

ваеннай акругі. У 1897–1898 гадах прымаў удзел у будаўніцтве помнікаў Кацярыне II і М. Мураўёву ў Вільні.

З дзяцінства А. Р. Брадоўскі займаўся збіраннем прадметаў даўніны, навукі, мастацтва, рукадзелля. За 37 гадоў службы ў ваенна-інжынерным ведамстве ў якасці будаўнічага тэхніка значна папоўніў свае калекцыі па геалогіі, мінералогіі, палеанталогіі, карыстаючыся масай зробленых зямельных работ.

Прафесійная дзейнасць і шырокае кола знаёмстваў спрыялі папаўненню збору, які размясціўся ў двух пакоях кватэры на вуліцы Завальная ў Вільнюсе. У 1906 годзе пад назвай «Музей старажытнасцей і мастацкай прамысловасці» быў адкрыты для публікі.

У 1915 годзе ў сувязі з Першай сусветнай вайной разам са штабам акругі і часткай свайго збору Брадоўскі А. Р. пераехаў у горад Віцебск. Тут памёрла жонка Антона Рафаілавіча, і ён звольніўся са службы па стане здароўя.

Брадоўскі А. Р. прапанаваў заснаваць у Віцебску музей, для якога згаджаўся перадаць свае калекцыі. Прапанова была прынятая. З лістапада 1918 года Антон Рафаілавіч – загадчык Віцебскага губернскага музея (зараз – Віцебскі абласны краязнаўчы музей).

У 1920 годзе была складзена Брадоўскім справаздача пра працу музея, у якой прыводзіцца пералік 40 калекцый, якія галоўным чынам складаліся з прадметаў яго збору: курганныя старажытнасці, мінералы, званочкі, гадзіннікі, курыльныя трубкі, зброя, карціны, аўтографы. Усяго больш за 10 тысяч прадметаў.

Захапляўся А. Р. Брадоўскі і калекцыянаваннем кніг. На паліцах яго бібліятэкі налічвалася 2200 тамоў: руская класіка, папулярныя творы замежных пісьменнікаў, працы вядомых вучоных Брэма, Ціміразева, выданні трохсотгадовай даўніны.

Антон Рафаілавіч вельмі шмат намаганняў прыклаў для рамонту памяшкання музея, пошуку вітрын, абсталявання. У чэрвені 1919 года

Кастрычнік



БРАДОЎСКІ

АНТОН РАФАІЛАВІЧ

Да 160-годдзя з дня нараджэння

(1859)

Брадоўскі Антон Рафаілавіч (1859–1928) нарадзіўся 8 кастрычніка 1859 года ў засценку Пятронішкі каля горада Новааляксандраўск Ковенскай губерні (зараз – горад Зарасай, Літва). Віцебскі калекцыянер, музейны работнік.

У 1875 годзе скончыў Новааляксандраўскае павятовае вучылішча. Працаваў пісьмаводам, даваў прыватныя ўрокі па агульнаадукацыйных дысцыплінах. Антон Рафаілавіч шляхам самаадукацыі вывучаў розныя дысцыпліны: геалогія, геадэзія, мінералогія, біялогія, палеанталогія, касмаграфія, архітэктура, фартыфікацыя, археалогія, нумізматыка, сфрагістыка, геральдыка.

У 1881–1882 гадах – загадчык Васільеўскай казённай цагельні ў Коўне (зараз – Каўнас). У 1882–1892 гадах – дзесятнік на будаўніцтве крэпасці ў Коўне і ваеннага порта ў Лібаве (зараз – Ліепая). У 1893–1918 гадах – будаўнічы тэхнік і чарцёжнік у інжынерным упраўленні Віленскай

110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Хандогін Мікалай Іванавіч (1909–1989), франтавы карэспандэнт, ураджэнец в. Валынцы Верхнядзвінскага раёна.

110 гадоў таму (1909) адкрылася Верхнядзвінская СШ № 1.

110 гадоў таму (1909) у в. Празарокі Глыбоцкага раёна пабудавана царква ў імя святых апосталаў Пятра і Паўла з цэглы, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

105 гадоў таму (1914) пачалося будаўніцтва чыгуначнай лініі Орша–Унеча. Уведзена ў строй у 1923 г.

105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Сямашка Мікола (сапр. Мікалай Пятровіч; 1914–1941), паэт, ураджэнец в. Барылы Полацкага раёна.

105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Краўчанка Міхаіл Панцялеевіч (1914–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец с. Галоўшчына Белгародскай вобласці (Расія).

105 гадоў таму (1914) у в. Галубічы Глыбоцкага раёна пабудавана царква ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы – помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

105 гадоў таму (1914) на Браслаўшчыне быў пабудаваны Відзаўскі касцёл Нараджэння Дзевы Марыі – помнік архітэктуры неаготыкі.

105 гадоў таму (1914) у в. Забор'е Глыбоцкага раёна пабудавана на месцы былога храма царква ў імя святіцеля Мікалая Цудатворца.

105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Плякін Іван Антонавіч (1915–1944), вызначыўся ў баях пры вызваленні Бешанковіцкага раёна ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец с. Равенькі Белгародскай вобласці (Расія).

100 гадоў таму (1919) у г. Полацку адкрылася цэнтральная бібліятэка.

100 гадоў таму (1919) у г. Віцебску адкрылася дзіцячая музычная школа № 1.

100 гадоў таму (1919) у г. Віцебску адбылася першая губернская спартыўная алімпіяда.

100 гадоў таму (1919) у г. Віцебску пачалі выдавацца плакаты «Окна «РОСТА». Апошні выйшаў у 1921 г.

100 гадоў таму (1919) у Віцебску пачаў выдавацца часопіс «Коммунистическая мысль» (да № 17), з 1922 г. – «Коммунистический труд» (з № 18). Выдаваўся ў 1919–1923 гг.

100 гадоў таму (1919) у г. Віцебску праведзена першая дзяржаўная выстава карцін мясцовых і маскоўскіх мастакоў.

100 гадоў таму (1919) тэрыторыя сучаснага Гарадоцкага раёна ўвайшла ў склад РСФСР.

100 гадоў таму (1919) у г. Віцебску заснаваны вучэбна-паказальны сад на аснове прыватнага саду. З 1924 г. – батанічны сад Ветэрынарнага інстытута, з 1931 г. – гарадскі школьны, з 1954 г. – аграбіястанцыя, з 1979 г. – вучэбнае і навуковае падраздзяленне Віцебскага педагагічнага інстытута. Зараз – Батанічны сад Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

100 гадоў таму (1919) ліквідавана Віцебская вучоная архіўная камісія.

100 гадоў таму (1919) Віцебскі педагагічны інстытут перайменаваны ў інстытут народнай адукацыі.

100 гадоў таму (1919) створаны Віцебскі тэатр рэвалюцыйнай сатыры, Віцебскі тэрэвсат, агітацыйна-прапагандысцкі тэатр мініяцюр (1919–1920).

100 гадоў таму (1919) у г. Віцебску пры Доме культуры чыгуначнікаў створаны драматычны гурток. З 1977 г. – Віцебскі народны тэатр.

4. **Кузіна, А**. Непарадны Віцебск / А. Кузіна // Витебский проспект. – 2012. – 28 июня. – С. 2.

5. **Мемус, А**. Акварэля : [альбом] / Алесь Мемус. – Віцебск : [б. в.], 2012. – 26 с.

6. **Мемус** Алесь: акварэль : каталог / рэд.: Т. І. Рабіновіч, А. Мемус. – Віцебск : Друкарня імя Камінтэрна, 1993. – 22 с.

7. **Мемус, А**. Двое : серыя міні-нацюрмортаў / Алесь Мемус. – Віцебск : [б. в.], 2012. – [24 с.].

8. **Мемус, А**. Мой мадэрн : [фотаальбом] / Алесь Мемус. – Віцебск : [б. в.], 2013. – 43 с.

9. **Пастернак, Т.** «Двое» Алеся Мемуса / Т. Пастернак // Народнае слова. – 2012. – 26 мая. – С. 7.

10. **Піавар, М.** Мемус Алесь Іосіфавіч / Мікалай Піавар // Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст. : біябібліяграфічны даведнік . – Мінск : Кнігазбор, 2010. – С. 210–211.

11. **Строгіна, С. В**. Калекцыя жывапісных і графічных твораў А. І. Мемуса і І. В. Магучай у зборы Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П. В. Масленікава : каталог / С. В. Строгіна. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2014. – 52 с.

12. **Строгіна, С**. Рэалізм падсвядомасці / С. Строгіна // Культура. – 2014. – 20 снеж. – С. 9.

13. **Сцепаненка, В**. Мая муза / В. Сцепаненка // Витебские вести. – 2013. – 19 сент. – С. 22.

14. **Фандарэнка, Н.** Пра што «маўчаць» келіхі / Н. Фандарэнка // Віцебскі рабочы. – 2012. – 19 мая. – С. 8.

15. **Цыбульский, М. Л**. Мемус Александр Иосифович / М. Л. Цыбульский // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 123–124.

агні» (2005); пастэлі «Дзве чорныя ружы» (1985), «Лучоса» (1987); малюнкі – алоўкавыя: «Віцяблянка» (1984), «Вулачка ў Полацку» (1989); пяром тушшу – серыя «Гатычныя рэмінісцэнцыі» (2003–2010); жывапісная кампазіцыя «Наш Караткевіч», серыя міні-нацюрмортаў «Двое» (2004–2010) і іншыя.

З 1974 года некалькі дзясяткаў гадоў праводзіў росшукі рэшткаў матэрыяльнай культуры на берагах Дзвіны, Віцьбы, Палаты, у Віцебску і Полацку. Алесь Мемус вывучаў старажытную і сярэднявечную архітэктуру Беларусі: сабраў значную колькасць матэрыялу, а таксама калекцыю фотаздымкаў аб'ектаў архітэктурнай спадчыны краю. Выдаў шэраг артыкулаў на гэту тэму ў мясцовым перыядычным друку: праект «Стары горад» у газеце «Выбар». Аўтар значнай колькасці артыкулаў у перыядычным друку: часопісах «Полацак» (Кліўленд), «Мастацтва», «Маладосць»; газетах «Літаратура і мастацтва», «Культура», «Ніва» (Беласток), «Выбар» і іншыя.

У 1980-я гады ўдзельнічаў у археалагічных раскопках пад кіраўніцтвам М. Ткачова (Віцебск, Навагрудак, Мір). Адзін з заснавальнікаў і актыўных удзельнікаў віцебскага культурна-асветніцкага клуба «Узгор'е»

У 2013 годзе Алесь Мемус падарыў Нацыянальнаму мастацкаму музею Беларусі больш за 300 сваіх графічных лістоў і 39 твораў сваёй жонкі – віцебскай мастачкі Ірыны Віктараўны Магучай (1963–2010). Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею – каля 1300 археалагічных знаходак з берагоў ракі Дзвіны і амаль 600 прадметаў з прыватнай калекцыі, у якую ўваходзілі манеты, сталовыя прыборы больш чым стогадовай даўніны і прыватныя рэчы, упрыгажэнні яго жонкі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Аляксандр** Мемус (выбраныя малюнкі) : [альбом]. – Віцебск : Друкарня імя Камінтэрна, 1990. – 23 с.

2. **Каўчэг**: альбом фатаграфіяў былое майстэрні Алеся Мемуса (1982–2010 гг.). – Витебск : Ювалан, 2011. – 22 с.

3. **Крупица, Н**. Слуга королевы / Н. Крупица // Вечерний Витебск. – 1999. – 20 нояб. – С. 1.

100 гадоў таму (1919) у г. Віцебску заснаваны Дом кнігі на базе бібліятэкі-чытальні. У 1928 г. прысвоена імя М. Горкага, у 1975 г. атрымаў статус цэнтральнай бібліятэкі. Зараз – Віцебская цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага.

100 гадоў таму (1919) створана Віцебскае раённае ўпраўленне Заходне-Дзвінскага ўчастка воднага транспарту, у распараджэнні якога знаходзілася 19 параходаў, якія здзяйснялі перавозкі.

100 гадоў таму (1919) у Віцебску створана прадстаўніцтва цэнтральнага інфармацыйнага органа Рэспублікі Саветаў – Віцебскае аддзяленне Расійскага тэлеграфнага агенцтва «ВіцРОСТА». З 1924 г. – у складзе БЕЛТА.

100 гадоў таму (1919) створана раённая арганізацыя Беларускага прафсаюза чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў ТРУП «Віцебскае аддзяленне Беларускай чыгуначнай дарогі».

100 гадоў таму (1919) пачалася работа па стварэнні Полацкага краязнаўчага музея. У 1926 г. – адкрыты для наведвальнікаў, з 1985 г. – філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

100 гадоў таму (1919) у Полацку заснавана цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны.

100 гадоў таму (1919) у Оршы заснавана бібліятэка-філіял № 3.

100 гадоў таму (1919) у Лёзне заснавана цэнтральная раённая бібліятэка.

100 гадоў таму (1919) у Шуміліне заснавана цэнтральная раённая бібліятэка.

100 гадоў таму (1919) у Ветрыне заснавана гарпасялковая бібліятэка-філіял № 2.

100 гадоў таму (1919) у Коханаве заснавана гарпасялковая бібліятэка.

95 гадоў таму (1924) у Чашніках заснавана цэнтральная раённая бібліятэка.

95 гадоў таму (1924) заснаваны Віцебскі мясакамбінат, з 1998 г. – ААТ.

95 гадоў таму (1924) у Оршы заснавана турысцка-аздараўленчае прыватнае УП «Орша» як дом адпачынку. З 1990 г. – турысцка-экскурсійны комплекс, з 1996 г. – турысцка-аздараўленчы комплекс, з 2004 г. – сучасная назва.

95 гадоў таму (1924) у Оршы заснавана метэаралагічная станцыя «Орша».

95 гадоў таму (1924) Віцебск наведаў беларускі пісьменнік Янка Купала (1882–1942).

95 гадоў таму (1924) ва Ушачах адбылася першая раённая настаўніцкая канферэнцыя.

95 гадоў таму (1924) ва Ушачах адкрылася першая раённая сельгасвыстава.

95 гадоў таму (1924) пачата будаўніцтва Бігосаўскага чыгуначнага вакзала Верхнядзвінскага раёна на чыгуначнай лініі Полацк – Даўгаўпілс.

95 гадоў таму (1924) у г. Віцебску пры ветэрынарным інстытуце арганізаваны першы ў рэспубліцы энтамалагічны музей.

95 гадоў таму (1924) Полацк і Полацкі павет увайшлі ў склад БССР.

95 гадоў таму (1924) у г. Віцебску адкрыты навукова-даследчы санітарна-бактэрыялагічны інстытут.

95 гадоў таму (1924) Віцебскі вышэйшы педагагічны інстытут аб'яднаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

95 гадоў таму (1924) быў створаны Высачанскі раён у Віцебскай акрузе – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–1931).

95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Грыгор'еў Георгій Сцяпанавіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую

У 1986 годзе адбылася першая персанальная выстава ў магазіне «Мастацтва», якая паклала шэраг выстаў у розных музеях і галерэях Беларусі. З 1996 года – замежныя выставы ў галерэі Алы Паўлавай (Дордрэхт, Галандыя), у Польшчы і Расіі, удзел у Трэцім Трыенале аўтапартрэту (Радам, Польшча).

Аўтапартрэты – асабістае адлюстраванне і цікавы аспект творчасці А. Мемуса. Гэта мастацкія вопыты па стварэнні індывідуальнай асобы сродкамі мімікі твару, выразнасці ліній, гульні святла і ценю «Аўта» (1987), «Аўта» (1981), «Аўта» (1983). Ён паказвае ў сваіх партрэтах меланхалічныя, паэтычныя вобразы і выконвае іх на высокім прафесійным узроўні.

Выявы яго каханай з’яўляюцца чымсьці больш, чым простае партрэтаванне: «Іша з чытвом» (1985), «Іша» (1984), «Меланхолія» (1992), «Профіль» (1984), «Венскі стул» (1984), «Музыка» (1984), «Экспрэсіўны малюнак» (1984), «Іша заснула» (1984), «Іша ў міноры» (1984), «Роздум» (1984), «Росшук стылю» (1985), «Ірына» (1986), «Засмучоная» (1986) і іншыя.

Нацюрморты вельмі вытанчаныя па тэхніцы выканання і глыбокія па філасафічнасці адчування. Іх персанажы – засохлыя кветкі: «Букет канюшыны» (1990), «Сухая ружа» (1996), «Сонечныя ружы» (1996), «Засохлы букет» (2001); старыя рэчы ў карціне «Чатыры ключы» (1995); рэшткі старога шкла – «Аптэчнае шкло» (1992).

Пейзажы А. Мемуса будуюцца на рэальных вобразах, але відавочнае ператвараецца ў свет фантастычны і загадкавы: «Новадзявочы манастыр» (1982), «Сквер ля Вялікага тэатра» (1989), «Маскоўскі крэмль у вечары» (1989). Падчас удзелу ў Міжнародным мастацкім пленэры ў Ружынстоку (Польшча) быў напісаны твор «Драпежнік» (2005). Мастак адлюстроўвае пераходны стан у прыродзе: змярканне, вечар, ранняя восень, апошні прамень сонца.

Сярод твораў: акварэлі «Прыходзім і сыходзім» (2002), дыптых «Час тэрору» (2002), цыклы «Уздоўж берага» (1987–1992), «Сведкі» (1992–1995), «Знак часу» (1995–1999); кампазіцыі ў гуашы і змешанай тэхніцы «Вечар у Шклове» (1986), «Цывілізацыя» (2002), дыптых «Неабходнасць у



МЕМУС
АЛЯКСАНДР ІОСІФАВІЧ

80 год з дня нараджэння

(1939)

Мемус Алесь Іосіфавіч (Алесь Прускі**)** нарадзіўся 13 верасня 1939 года ў вёсцы Прусы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Мастак, выкладчык, краязнаўца. Член Беларускага саюза мастакоў (2008). Жыве ў Віцебску.

У 1941–1958 гадах жыў з бацькамі на Камчатцы. У 1966 годзе скончыў Уладзівастоцкую мастацкую вучэльню. У 1974 годзе – Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна Акадэміі мастацтваў СССР у Ленінградзе.

У 1974–1999 гадах – выкладчык жывапісу, малюнку, кампазіцыі на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (зараз – Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава).

Алесь Мемус працуе ў розных графічных тэхніках: алоўкавы малюнак, пастэль, туш, змешаная тэхніка; у акварэлі, жывапісу: партрэт, нацюрморт, пейзаж, тэматычная і абстрактная кампазіцыя.

Да ранніх можна аднесці творы, намаляваныя падчас вучобы ў Ленінградзе: афорты «Па Дзюрэру» (1969), «Копія з Рэмбрандта» (1970); лінгравюры: «Сон» (1971), «Партрэт жонкі за чытаннем» (1972).

З 1978 года мастак удзельнічае ў гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных выставах Саюза мастакоў. Сведчаннем гэтага перыяду з'яўляюцца творы ў графіцы і лінгравюры: «Галя за чытаннем» (1976), «Партрэт студэнткі» (1979), «Краявід з крыжам» (1988), «Аўтапартрэт» (1981).

Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец в. Лашкі Маскоўскай вобласці (Расія).

95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Ермалаеў Рыгор Дзмітрыевіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец в. Шылаўка Саратаўскай вобласці.

95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Дароўскі Мікалай Сцяпанавіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец в. Старое Рагавое Курскай вобласці (Расія).

90 гадоў таму (1929) заснавана Віцебскае аддзяленне Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі. З 1938 г. – Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна

90 гадоў таму (1929) адкрыты Аршанскі чыгуначны тэхнікум.

90 гадоў таму (1929) адкрыты Лепельскі педтэхнікум (з 1944 г. – педвучылішча). Было закрыта ў 1956 г.

90 гадоў таму (1929) ва Ушачах адкрыліся раённыя курсы піянерважатых.

90 гадоў таму (1929) выдаў першую прадукцыю Верхнядзвінскі льнозавод.

90 гадоў таму (1929) у Віцебску заснавана арцель «8 Сакавіка», пазней – Віцебская фабрыка мастацкіх вырабаў «Купава».

90 гадоў таму (1929) у г. п. Обаль Шумілінскага раёна заснаваны Обальскі керамічны завод як цагляны завод № 37, камунальнае вытворчае унітарнае прадпрыемства, вядучае прадпрыемства галіны па вытворчасці высокаякаснай цэглы, з 1969 г. – сучасная назва. У 1974–1977 гг. пабудаваны завод керамічных вырабаў са шкілернай падрыхтоўкай глінамасы, у 1980 г. абодва прадпрыемствы аб'яднаны ў адно з сучаснай назвай. З 2002 г. – КУПП.

90 гадоў таму (1929) быў ліквідаваны Валынецкі раён у Полацкай акрузе – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–1929).

90 гадоў таму (1929) у г. Віцебску заснавана лесагаспадарчае прадпрыемства Беларускага дзяржаўнага трэста лясной прамысловасці. З 1984 г. – Віцебскае вытворчае лесанарыхтоўчае аб'яднанне «Віцебсклес», з 1995 г. – ААТ.

90 гадоў таму (1929) у г. п. Багушэўск Сенненскага раёна заснавана арцель «Чырвоны шавец», з 1959 г. – «Шлях камунізму», з 1960 г. – Багушэўскі КБА, з 1992 г. – КУП бытавога абслугоўвання насельніцтва «Прэстыж».

90 гадоў таму (1929) заснавана Віцебская акруговая прафтэхшкола медыцынскіх сясцёр. З 1930 г. – медыцынскі тэхнікум, з 1939 г. – фельчарска–акушэрская школа, у 1941 г. – ліквідавана, у 1953 г. – зноў створана пры Віцебскім медыцынскім інстытуце, з 1954 г. – самастойная навучальная ўстанова, з 1955 г. – Віцебскае медыцынскае вучылішча, у 1959 г. – ліквідавана, у 1963 г. – адноўлена. Зараз – Віцебскі дзяржаўны медыцынскі каледж.

90 гадоў таму (1929) пабудаваны Дрысвяцкі Петрапаўлаўскі касцёл (архітэктар Л. Вітан-Дубейкаўскі), помнік драўлянага дойлідства ў в. Дрысвяты Браслаўскага раёна. У 1991 г. – рэканструяваны.

90 гадоў таму (1929) нарадзілася Фянько Марыя Антонаўна, мастачка (жывапіс), ураджэнка в. Мярэцкія Глыбоцкага раёна.

90 гадоў таму (1929) у Аршанскім раёне выяўлены С. А. Дубінскім археалагічны помнік – гарадзішча Вусце, у 1971 і 1981 гг. – даследаваны.

85 гадоў таму (1934) у Віцебску пабудаваны ваенны аэрадром, у 1978 г. грамадзянскі аэрапорт быў перанесены за межы

Джумантаева Т. А. – аўтар тэксту (разам з М. М. Ільніцкім) да фотаальбома «Полацк музейны» (2006), у якім асвятляецца гісторыя музейнага будаўніцтва ў Полацку на працягу XVIII–XXI стагоддзяў. змяшчаюцца звесткі пра 11 музеяў, якія ўваходзяць у склад запаведніка. У 2015 годзе выйшаў фотаальбом «Музеі Полацка», аўтарам тэксту і ўкладальнікам якога з'яўляецца Тамара Джумантаева.

З 2010 года – член «Музеялагічнай рады» Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

ЛІТАРАТУРА

1. **Джумантаева, Т. А**. С историей города в сердце / Т. А. Джумантаева ; беседовала Н. Дроздова // Віцьбічы. – 2009. – 28 мая. – С. VII. – (Прилож.: «Вечерний Витебск»).

2. **Джумантаева** Тамара Александровна // Человек года Витебщины [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://people.vlib.by/index.php/personalii/kultura-iskusstvo-dukhovnoe-vozrozhdenie/dzhumantaeva-tamara-aleksandrovna. – Дата доступа: 24.11.2018.

3. **Малашеня**, **Л**. Тамара Джумантаева: «Горжусь, что я полочанка» / Л. Малашеня // Витебские вести. – 2015. – 19 марта. – С. 10.

4. **Півавар, М.** Джумантаева Тамара Аляксандраўна / Мікалай Півавар // Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст. : біябібліяграфічны даведнік. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – С. 95.

Джумантаева Т. А. – дацэнт кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Навуковыя інтарэсы: музеефікацыя культурнай прасторы, інфармацыйныя тэхналогіі ў музеі, менеджмент у сферы культуры, метадалогія навуковых даследаванняў, метадалогія гісторыі. Выкладаемыя дысцыпліны: метадалогія навуковых даследаванняў, навуковыя даследаванні ў турызме, планаванне і кіраўніцтва культурнымі праектамі.

З 1985 года Тамара Джумантаева працуе ў навукова-даследчай і асветніцкай установе культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. З 2012 года – дырэктар культурнай установы.

У 2014 годзе Джумантаевай Т. А. прысвоена ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны». Пад яе кіраўніцтвам калектыў Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка дасягнуў высокіх творчых вынікаў. У 2012 годзе прыняў удзел у міжнародным фестывалі музеяў «Інтэрмузей-2012» у Маскве, у праекце «Музеефікацыя комплексу насценнага жывапісу XII–XIII стагоддзяў Спаса-Праабражэнскага храма Еўфрасіньева манастыра ў Полацку» стаў пераможцам у намінацыі «Прастора культуры – прастора даверу».

Пад непасрэдным кіраўніцтвам Джумантаевай Т. А. створана новая экспазіцыя стацыянарнай выставы «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай», удасканалены экспазіцыі Прыродна-экалагічнага музея, Музея гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора. Створана новая экспазіцыя стацыянарнай выставы «Сценапісы XII–XIX стагоддзяў Спаса-Праабражэнскага храма» ў Мастацкай галерэі.

Штогод Тамара Джумантаева прымае ўдзел у міжнародных навуковых канферэнцыях па тэмах захавання спадчыны і музеялогіі. Яна аўтар шэрагу навуковых прац і артыкулаў, якія апублікаваны ў навуковых зборніках, зборніках матэрыялаў навукова-практычных канфэрэнцый, шматтомных энцыклапедычных выданнях Рэспублікі Беларусь, Расійскай федэрацыі і Польшчы, перыядычных выданнях.

горада (з 1996 г. – міжнародны), з 2000 г. – аэрапорт «Віцебск» – Віцебскі філіял дзяржаўнага прадпрыемства паветранага руху «Белаэранавігацыя».

85 гадоў таму (1934) нафтасклад у г. Віцебску перайменаваны ў нафтабазу.

85 гадоў таму (1934) у г. Віцебску прайшла першая алімпіяда дзіцячай самадзейнасці.

85 гадоў таму (1934) у г. Дрысе Верхнядзвінскага раёна пабудавана электрастанцыя.

85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Вальшонак Захарый Сямёнавіч, прафесар Расійскай акадэміі ваенных навук, ураджэнец г. Віцебска.

85 гадоў таму (1934) быў выяўлены Гарадоцкі курганны могільнік – археалагічны помнік на паўднёва-заходняй ускраіне горада.

85 гадоў таму (1934) нарадзілася Краско Антаніна Аляксееўна, вучоны ў галіне льнаводства, кандыдат сельскагаспадарчых навук (1977). З 1967 г. – малодшы навуковы супрацоўнік у Віцебскай абласной сельскагаспадарчай вопытнай станцыі (зараз Віцебскі занальны інстытут сельскай гаспадаркі НАН Беларусі), ураджэнка Варанкоўскага раёна Бранскай вобласці.

85 гадоў таму (1934) нарадзілася Кукрэш Лідзія Міхайлаўна, вучоны ў галіне льнаводства, доктар сельскагаспадарчых навук (1992), кандыдат сельскагаспадарчых навук (1969). З 1961 г. – у доследна-паказальнай гаспадарцы «Межава» Аршанскага раёна, ураджэнка Днепрапятроўскай вобласці (Украіна).

85 гадоў таму (1934) у Оршы заснавана прадпрыемства «Элуіз» грамадскага аб’яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» як майстэрні грамадства сляпых, з 1991 г. – Аршанскае

навучальнае вытворчае прадпрыемства, з 2000 г. – УП з сучаснай назвай, з 2004 г. – ПУП з сучасным статусам.

80 гадоў таму (1939) адбыўся першы выпуск Гарадоцкай СШ № 1.

80 гадоў таму (1939) адбылося ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

80 гадоў таму (1939) Шаркаўшчына ўвайшла ў склад БССР.

80 гадоў таму (1939) адкрыта Лепельскае пяхотнае вучылішча. Зараз не існуе.

80 гадоў таму (1939) заснавана СШ № 1 у г. Паставы.

80 гадоў таму (1939) пабудаваны з цэглы і бутавага каменю Ідоўцкі касцёл Божай Маці Шкаплернай у в. Ідоўта (Ідолта) Мёрскага раёна.

80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Кашыцкі Эдуард Сцяпанавіч, вучоны-медык, акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец Ушацкага раёна.

80 гадоў таму (1939) у Браславе заснаваны Дом сацыялістычнай культуры, з 1990 г. – Браслаўскі раённы Дом культуры.

80 гадоў таму (1939) была створана Вілейская вобласць (1939–1944) – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, у якую ўваходзіла частка тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці.

80 гадоў таму (1939) заснавана Браслаўская цэнтральная бібліятэка.

80 гадоў таму (1939) заснавана Відзаўская гарпасялковая бібліятэка.

80 гадоў таму (1939) у Віцебску заснаваны Дом народнай творчасці. З 1980 г. – абласны навукова-метадычны Цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы, з 2006 г. – Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці.

80 гадоў таму (1939) у Віцебску створаны ДЭУ для абслугоўвання дарог абласнога значэння. Зараз – прадпрыемства па праектаванні, будаўніцтву, утрыманні і рамонту мясцовых аўтамабільных дарог агульнага карыстання «Витебскоблдорстрой».

ДЖУМАНТАЕВА
ТАМАРА АЛЯКСАНДРАЎНА
60 год з дня нараджэння (1959)

Джумантаева Тамара Аляксандраўна нарадзілася 3 верасня 1959 года ў г. Полацку. Спецыяліст у галіне музеязнаўства, кандыдат культуралогіі (2011), дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

У 1983 годзе скончыла гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (зараз – Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка) па спецыяльнасці «Гісторыя і англійская мова». У 1993 годзе – Санкт-Пецярбургскую дзяржаўную акадэмію культуры па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры».

У 2011 годзе абараніла ступень кандыдата культуралогіі па тэме «Музеефікацыя культурнай прасторы Полацка: традыцыі і інавацыі».

ЛІТАРАТУРА

1. **Беларускія** пісьменнікі (1917–1990) : даведнік / склад. А. Э.Гардзіцкі ; рэд. А. Л. Верабей. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – С. 362–363.

2. **Канапелька, А.** Яўгенія Мальчэўская / А. Канапелька // Народнае слова. – 2001. – 29 мая. – С. 5.

3. **Мальчэўская** Яўгенія Еўдакімаўна // Памяць: Чашніцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: М. Ц. Добрыш [і інш.] ; аўт.-уклад. Н. Т. Кіндзяева ; рэд. А. І. Валахановіч, В. І. Марціновіч ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – С. 453.

4. **Пісьменнікі** Віцебшчыны : даведнік / рэд. Ф. І. Сіўко. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2001. – С. 48–50.

5. **Урупіна, Г. М.** Мальчэўская Яўгенія / Г. М. Урупіна // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса ; рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : БелЭН імя Петруся Броўкі, 1994. –. Т. 4 : Лазарук–Перкін. – С. 203–204.

80 гадоў таму (1939) утвораны Дзісненскі павет, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка (1922–1939) у складзе Польшчы.

80 гадоў таму (1939) нарадзілася Мацецкая Вера Уладзіміраўна, полацкі майстар народнай творчасці па вязанні на прутках і кручком, ураджэнка в. Забалацце Мёрскага раёна.

80 гадоў таму (1939) заснавана Шаркаўшчынская цэнтральная раённая бібліятэка як публічная. У 1944 г. пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў зноў створана як раённая, у 1978 г. набыла сучасны статус, з 1983 г. знаходзіцца ў будынку раённага Дома культуры.

80 гадоў таму (1939) у Пастаўскім раёне на базе памешчыцкай карпавай гаспадаркі (плошча 114 га) на рацэ Плісаўка заснавана рыбная гаспадарка «Навінкі».

80 гадоў таму (1939) адкрыта Пастаўская цэнтральная раённая бібліятэка. З 1978 г. узначальвае сетку бібліятэк раёна і набыла статус цэнтральнай раённай.

80 гадоў таму (1939) заснаваны Пастаўскі малочны завод, з 1949 г. – галаўны маслазавод Маладзечненскага абласнога трэста «Маслапром», у 1963 г. уведзены ў эксплуатацыю новы завод сухога абястлушчанага малака, у 1988–1992 гг. – вытворчы участак Глыбоцкага малочнакансервавага камбіната, з 1992 г. – ААТ з сучаснай назвай.

75 гадоў таму (1944) адкрыта Пастаўскае педагагічнае вучылішча. Існавала да 18.08.1955 г.

75 гадоў таму (1944) у адкрыта школа фабрычна-завадскога навучання № 14 у г. п. Сураж (праз месяц пераведзена ў Віцебск). З 1946 года – рамесніцкае вучылішча № 20 тэкстыльшчыкаў, з 1949 – школа фабрычна-завадскога навучання № 92, з 1954 – Віцебская школа фабрычна-завадскога навучання № 3 будаўнікоў, з 1955 – Віцебская будаўнічая школа № 3, з 1957 –

Віцебскае будаўнічае вучылішча № 3, з 1963 – Віцебскае гарадское прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 59 будаўнікоў, з 1979 – Віцебскае сярэдняе гарадское прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 59 будаўнікоў, з 1985 – Віцебскае сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 59 будаўнікоў, з 1989 – Віцебскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 59 будаўнікоў, з 2002 – УА «Віцебскае дзяржаўнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 59 будаўнікоў». З 2003 года сучасная назва – УА «Віцебскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 2 будаўнікоў».

75 гадоў таму (1944) у гады Вялікай Айчыннай вайны партызаны Ушацкага раёна здзейснілі аперацыю «Прарыў».

75 гадоў таму (1944) створаны Віцебскі філіял Саюза мастакоў Беларусі.

75 гадоў таму (1944) у Полацку створаны аблрэмбудтрэст. З 2001 г. – аб'яднанне «Полацксельбуд», камунальнае унітарнае вытворчае праектна-будаўнічае прадпрыемства.

75 гадоў таму (1944) у Паставах заснавана СШ № 2.

75 гадоў таму (1944) у Пастаўскім раёне заснаваны «Дунілавіцкі райпрамкамбінат». Зараз – Варапаеўскі дрэваапрацоўчы камбінат, прадпрыемства па вытворчасці мэблі.

75 гадоў таму (1944) у г. Глыбокае на месцы бойні заснаваны мясакамбінат. У 1949 г. аб'яднаны з міжраённай нарыхтоўчай канторай у Глыбоцкі птушкакамбінат, з 1964 г. – Глыбоцкі мясакамбінат, з 1997 г. – ААТ.

75 гадоў таму (1944) у г. Дрысе (зараз – г. Верхнядзвінск) была заснавана раённая бібліятэка. У 1977 г. было прысвоена імя беларускага пісьменніка-земляка Т. Хадкевіча, у 1979 г. набыла статус цэнтральнай раённай бібліятэкі. Зараз – Верхнядзвінская цэнтральная раённая бібліятэка імя Т. Хадкевіча.

Мальчэўская Я. Е. вучылася спачатку ў Замошскай пачатковай, потым у Дварэцкай васьмігадовай, затым у Заслонаўскай сярэдняй школах.

У 1965 годзе паступіла ў Бабруйскі тэхнікум гумавай прамысловасці, пасля заканчэння якога атрымала спецыяльнасць тэхніка-тэхнолага. У 1965–1970 гадах – прэсаўшчыца-вулканізатаршчыца на Бабруйскім заводзе гумавых вырабаў. З 1970 года – карэктар рэдакцыі бабруйскай аб'яднанай газеты «Камуніст». У 1972–1973 гадах – літсупрацоўнік рэдакцыі чашніцкай раённай газеты «Чырвоны прамень».

У 1973–1978 гадах вучылася на беларускім аддзяленні філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску. У 1978–1980 гадах выкладала беларускую мову і літаратуру ў Раванічскай сярэдняй школе Чэрвеньскага раёна, у 1980–1987 гадах – у Талачынскай школе працоўнай моладзі, у 1987–1989 гадах – у СШ № 2 г. Талачына, з 1989 года – у СШ № 40 г. Віцебска.

У 1991–1992 гадах – карэспандэнт абласной газеты «Віцебскі рабочы». З 1993 года – уласны карэспандэнт па Віцебскай вобласці рэспубліканскай газеты «Белорусская нива».

Першыя вершы паэткі («Залатая мяцеліца», «Серабрыліся ля хат таполі…» і іншыя) з'явіліся ў 1965 годзе ў бабруйскай аб'яднанай газеце «Камуніст». Затым змяшчаліся ў калектыўных зборніках «Вёсны» (1976), «Нашчадкі» (1979), «Люблю будзённы дзень» (1976), «Дзень добры, мама» (1977), «Ад ніў Прыдзвінскіх» (), у літаратурных альманахах «Дзень паэзіі» (1976, 1977), «Дзвіна: Віцебшчына літаратурная» (1992, 2000, 2005), у раённым, абласным і рэспубліканскім друку.

Мальчэўская Я. Е. – аўтар паэтычнага цыкла «Святло асенняе зярнят» у зборніку «Нашчадкі» (1979), аўтар паэтычнага зборніка «Залежнасць» (1989).

Асноўнае ў яе вершах – любоў да Радзімы і яе народа, пачуцці кахання і сяброўства, узаемаадносіны паміж людзьмі, іх заклапочанасць праблемамі сучаснасці.

Аўтар апавяданняў «Мачаха», «Яраслаўна».

Жыццё паэткі абарвалася 19 студзеня 2008 года.

5. **Нацыянальны** акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа / склад.: С. Дашкевіч, А. Ганчароў, Л. Грамыка. – Мінск : Альтыёра, 2001. – 60 с.

6. **Шкуратаў** Генадзь Васілевіч // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2003. – Кн. 2. – С. 504.

7. **Шкуратов** Геннадий Васильевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. – Т. 7 : Снегирь–Ящерицын – С. 606.

МАЛЬЧЭЎСКАЯ ЯЎГЕНІЯ ЕЎДАКІМАЎНА

Да 70-годдзя з дня нараджэння (1949)

Мальчэўская Яўгенія Еўдакімаўна (сапр. Крыжаноўская Яўгенія Еўдакімаўна**,** 1949–2008) нарадзілася 25 жніўня 1949 года ў вёсцы Замошша Чашніцкага раёна ў сялянскай сям'і. Беларуская паэтэса і журналістка. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1990).

75 гадоў таму (1944) была ліквідавана Вілейская вобласць (1939–1944) – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, у якую ўваходзіла частка тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці.

75 гадоў таму (1944) у гады Вялікай Айчыннай вайны быў створаны Віцебскі «кацёл» – акружэнне войскамі 3-га Беларускага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў групоўкі нямецка-фашысцкіх войскаў у Віцебскім раёне ў ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі 1944 года ў Вялікую Айчынную вайну.

75 гадоў таму (1944) у Віцебску заснавана абласная кінарамонтная майстэрня. З 1955 г. – «Аблкультрамснаб», з 1962 г. – абласны рамонтна-прамысловы камбінат, з 1968 г. – рамонтна-вытворчы камбінат, з 1988 г. – вытворчы камбінат ВА «Белпрамкультура». Зараз – прадпрыемства па вытворчасці металічных вырабаў «Віцебск-Белпрамкультура».

75 гадоў таму (1944) у г. Докшыцы створана машынна-трактарная станцыя. З 2003 г. – ААТ «Докшыцкі райаграсэрвіс».

75 гадоў таму (1944) у Віцебску створаны зямельны аддзел. З 1947 г. – упраўленне сельскай гаспадаркі, з 1953 г. – упраўленне сельскай гаспадаркі і нарыхтовак, з 1954 г. – Віцебскае абласное ўпраўленне сельскай гаспадаркі, з 1962 г. – упраўленне вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў, з 1965 г. – упраўленне сельскай гаспадаркі выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, з 1997 г. – камітэт сельскай гаспадаркі і харчавання Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

75 гадоў таму (1944) нарадзілася Якушэнка Галіна Віктараўна, мастачка, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, жыхарка в. Гуркі Гарадоцкага раёна, ураджэнка г. Кіева (Украіна).

75 гадоў таму (1944) нарадзілася Крупская Дзіна Іванаўна, народны майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з г. п. Ушачы. Працуе ў тэхніцы выцінанкі.

75 гадоў таму (1944) нарадзілася Швед Людміла Мікалаеўна, член народнага клуба аматараў фларыстыкі «Анюта» і клуба аматараў рукадзелля «Натхненне» Цэнтра народных рамёстваў і мастацтваў «Дзвіна» г. Віцебска. Ураджэнка г. Хабараўска на Дальнім Усходзе (Расія).

75 гадоў таму (1944) створаны Браслаўскі народны тэатр пры раённым Доме культуры як тэатральны гурток. У 1959 г. прысвоена званне «Народны аматарскі тэатр» і сучасная назва.

75 гадоў таму (1944) адкрыты Шаркаўшчынскі раённы Дом культуры. З 1982 г. знаходзіцца ў спецыяльна пабудаваным будынку.

75 гадоў таму (1944) нарадзілася Піліпеня Яўгенія Ніканаўна (1944–2014), заслужаны дзеяч культуры Беларусі (2008), музыкантка, ураджэнка в. Залессе Лёзненскага раёна.

70 гадоў таму (1949) у Віцебску быў адкрыты абласны анкалагічны дыспансер.

70 гадоў таму (1949) заснаваны Докшыцкі тэатр раённага Дома культуры, з 1982 г. мае званне народнага.

70 гадоў таму (1949) адкрыта школа механізацыі сельскай гаспадаркі ў в. Боркавічы Верхнядзвінскага раёна. З 1953 года – Боркавіцкае СПТВ № 33 механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1984 года – СПТВ-170. З 2001 года – Боркавіцкае ДПТВ-170. З 2005 года перайменавана ў УА «Боркавіцкі дзяржаўны прафесійны ліцэй сельскагаспадарчай вытворчасці».

70 гадоў таму (1949) у Віцебску заснаваны вучэбна-вытворчыя майстэрні. З 1999 г. перайменаваны ў «Галант» – прадпрыемства па вытворчасці швейных вырабаў,

Старо («Сняданак з невядомымі» У. Дазорцава), Клеменс («Час быка» паводле «Клеменса» К. Саі).

У больш позні перыяд артыст значна пашырыў свой жанравы і выяўленчы дыяпазон. У ролях, асабліва класічнага рэпертуару, умела спалучаліся псіхалагічныя прыёмы з вострай характарнасцю і часам гратэскам: Меркуцыо, Эдгар, Петручыо («Рамэо і Джульета», «Кароль Лір», «Утаймаванне свавольніцы» У. Шэкспіра), Ян («Непаразуменне» А. Камю), Антоніо («Чума на вашы дзве сям'і» Р. Горына), Рычард Уіллі («Ён. Яна. Акно. Нябожчык» Р. Куні), Лэйзер («Памінальная малітва» Р. Горына), Жэронт («Лекар мімаволі» Ж. Б. Мальера), Хітры («І быў дзень…» А. Дударава, Маўрысіо («І паміраючы дрэвы стаяць» А. Касоны).

Генадзь Шкуратаў шмат здымаўся ў кіно, акцёр удзельнічаў у 17 кінапраектах: «Пад сузор'ем Блізнят» (1978), «Цяжкая вада» (1979), «Пятля Арыёна» (1980), «Страх» (1980), «Пяшчота да равучага звера» (1982), «Вадзіцель аўтобуса» (1983), «Хам» (1990), «Сівая легенда» (СССР, Польшча; 1991), «Хэпі-энд» (1991), «Чорны бусел» (1993), «Бег ад смерці» (1997), «Пракляты ўтульны дом» (1998), «Вам – заданне» (2004) і іншых.

Генадзь Васілевіч Шкуратаў памёр 28 лютага 2007 года ў Віцебску.

ЛІТАРАТУРА

1. **Беларускі** дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа / аўт. тэксту А. В. Сабалеўскі ; склад. С. М. Дашкевіч. – Мінск : Беларусь, 1986. – 95 с.

2. **Генадзь** Шкуратаў // Коласаўцы: да 80-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа : альбом / рэд.: Л. Грамыка, С. Дашкевіч. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2006. – С. 61.

3. **Дашкевіч, В.** Вырай Шкуратава / В. Дашкевіч // Витебский проспект. – 2010. – 11 марта. – С. 6.

4. **Іваноўскі, Ю. У**. Шкуратаў Генадзь Васілевіч / Ю. У. Іваноўскі // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 2 : Л–Я. – С. 535.



ШКУРАТАЎ

ГЕНАДЗЬ ВАСІЛЕВІЧ

Да 70-годдзя з дня нараджэння

(1949)

Шкуратаў Генадзь Васілевіч (1949–2007) нарадзіўся 7 жніўня 1949 года ў Мінску. Беларускі акцёр тэатра і кіно, заслужаны артыст Беларусі (1996).

У 1976 годзе скончыў акцёрскі курс Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (педагог А. І. Бутакоў). У 1976–2007 гадах – у трупе Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.

Генадзь Шкуратаў дэбютаваў у ролі Князя («Сымон-музыка» паводле Я. Коласа). Стылявой манеры артыста ўласцівы знешняя стрыманасць, змястоўнасць, абгрунтаванасць мыслення ў вобразе, інтэлектуальнасць: Красоўскі, Дугін («Парог», «Радавыя» А. Дударава), Нязнамаў («Без віны вінаватыя» А. Астроўскага), Ілья Быкаў («Касатка» А.Талстога), Валодзька («Адпачынак пасля ранення» В. Кандрацьева),

тэкстыльнай галантарэі, мэблі, радыётэхнічнай вытворчасці ГА «Беларускае грамадства глухіх», з 2004 г. – ПУП.

70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Пшонка Уладзімір Іванавіч, лепельскі мастак-жывапісец, ураджэнец в. Свядзіца Лепельскага раёна.

70 гадоў таму (1949) нарадзілася Кушнярова Вера Паўлаўна, мастачка (жывапіс), майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (вышыўка). Жыхарка в. Дабрамыслі Лёзненскага раёна, ураджэнка г. Уладзімір (Расія).

70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Плыгаўка Іван Парфір'евіч, кіраўнік гуртка разьбы па дрэве Докшыцкага Дома рамёстваў, ураджэнец в. Лапліна Докшыцкага раёна.

70 гадоў таму (1949) у Віцебскім раёне адкрыты санаторый прыватнага санаторна-курортнага УП «Белпрафсаюзкурорт» Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

65 гадоў таму (1954) пачала працаваць Віцебская ЦЭЦ.

65 гадоў таму (1954) пачалося будаўніцтва Лепельскай гідраэлектрастанцыі. Уступіла ў строй у 1956 г.

65 гадоў таму (1954) у Оршы адкрыты кінатэатр «Перамога».

65 гадоў таму (1954) у Віцебску ўпершыню з'явілася легкавое таксі.

65 гадоў таму (1954) заснаваны Бягомльскі гарадскі Дом культуры Докшыцкага раёна.

65 гадоў таму (1954) у Віцебску створаны ансамбль танца «Лявоніха» пры гарадскім Доме культуры (з 2007 г. – Цэнтр культуры «Віцебск»). У 1971 г. прысвоена званне «народны», у 2007 г. – «Заслужаны аматарскі калектыў».

65 гадоў таму (1954) у Браславе заснавана раённая нарыхтоўчая кантора. З 1986 г. – кааператыўнае нарыхтоўчае прамыслова–гандлёвае прадпрыемства, з 1996 г. – кааператыўнае нарыхтоўча-вытворча-гандлёвае аб'яднанне «Каапнарыхтпрам»,

з 1999 г. – прыватнае вытворча-нарыхтоўчае УП «Браславский коопзаготпром».

65 гадоў таму (1954) упраўленне сельскай гаспадаркі і нарыхтовак перайменавана ў Віцебскае абласное ўпраўленне сельскай гаспадаркі. Зараз – камітэт сельскай гаспадаркі і харчавання Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

65 гадоў таму (1954) у Віцебску ўзведзены новы будынак чыгуначнага вакзала.

65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Гільніч Міхаіл Паўлавіч, майстар па лозапляценні, удзельнік наваполацкага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў «Прамень», ураджэнец г. Докшыцы. З 1997 г. – працуе на заводзе «Палімір» ААТ «Нафтан».

65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Чэрнін Міхаіл Давыдавіч, віцебскі народны майстар па лозапляценні, ураджэнец г. Арэнбург (Расія).

65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Пасюцін Анатоль Яўгенавіч. Займаецца разьбой па дрэве, такарскай справай і жывапісам. Жыхар в. Ламіншчына Талачынскага раёна, ураджэнец в. Славені Талачынскага раёна.

65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Абраменка Мікалай Адамавіч, майстар разьбы па дрэве, ураджэнец г. Полацка.

65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Палаценка Уладзімір Мікалаевіч, вучоны ў галіне льнаводства. Працаваў аграномам насенняводам калгаса «Прагрэс» Дубровенскага раёна, следчым Віцебскай абласной пракуратуры па захаванні закону ў турмах, намеснікам старшыні калгаса імя Кірава і старшынёй калгаса «Ленінская іскра» Аршанскага раёна, ураджэнец г. Крычаў Магілёўскай вобласці.

13. **Кривошеева, Н.**. Геннадий Гарбук. «Человеку свойственно стремление к свету, добру и красоте» / Нелли Кривошеева // На экранах. – 2018. – № 2. – С. 10–11.

14. **Купалавец** па званні : якім Беларусь запомніць Генадзя Гарбука // Звязда. – 2018. – 10 лют. – С. 9.

15. **Орлова, Т.**. «Друзей моих прекрасные черты...» / Татьяна Орлова // На экранах. – 2018. – № 2. – С. 8–9.

16. **Саенкова, Л**. Народный / Л. Саенкова // Советская Белоруссия. – 2014. – 7 авг. – С. 14.

17. **Свірко, І.** З кожнай роляй гатовы вучыцца нанова / І. Свірко // Рэспубліка. – 2014. – 24 ліп. – С. 10.

18. **Сильванович, О.** Геннадий Гарбук. Наша легенда / Олег Сильванович // На экранах. – 2014. – № 5. – С. 24.

2. **Бунцэвіч, Н**. Верны сцэне да апошняга / Н. Бунцэвіч // Культура. – 2018. – 10 лют. – С. 6–7.

3. **Гарбук, Г. М**. Акцёр Генадзь Гарбук: «Любоў вернецца да вас сто разоў» / Г. М. Гарбук ; гутарыла А. Мінчукова // Настаўніцкая газета. – 2009. – 21 крас. – С. 4.

4. **Гарбук, Г. М**. Геннадий Гарбук: «Белорусская земля дает мне силы» / Г. М. Гарбук ; беседовал С. Климкович // Армия. – 2009. – № 3. – С. 62–64.

5. **Гарбук, Г. М.** «З кожнай новай узнагародай адказнасць перад гледачамі толькі павялічваецца» / Г. М. Гарбук ; гутарыла І. Свірко // Рэспубліка. – 2009. – 19 лістап. – С. 8.

6. **Гарбук, Г. М**. Юбілей. Прыемная рэч у двух актах / Г. М. Гарбук ; гутарыў Б. Крэпак // Культура. – 2009. – № 31 (жн.). – С. 6.

7. **Гарбук, Г. М**. Генадзь Гарбук: «Я і сёння згадзіўся б на ролю Васіля...» / Г. М. Гарбук ; гутарыў А. Каско // Звязда. – 2012. – 23 кастр. – С. 1, 5.

8. **Гарбук, Г. М.** «Хадзілі чуткі, вам увесь Парыж апладзіраваў» / Г. М. Гарбук ; гутарыла Н. Бунцэвіч // Культура. – 2014. – 9 жн. – С. 6.

9. **Гарбук** Геннадий Михайлович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 291–292.

10. **Гарбук** Генадзь Міхайлавіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Б–Г. – С. 528–529.

11. **Гарбук** Генадзь Міхайлавіч // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2002. – Т. 1 : А–К. – С. 250–251.

12. **Гнілазуб, В**. Шчыры беларус з Ушаччыны : сёння спаўняецца 80 гадоў народнаму артысту Беларусі Генадзю Гарбуку / В. Гнілазуб // Сельская газета. – 2014. – 24 июля. – С. 14.

65 гадоў таму (1954) нарадзілася Чэрніна Наталля Аляксандраўна, віцебскі майстар па лозапляценні.

65 гадоў таму (1954) заснаваны Полацкі гарадскі Палац культуры як Дом культуры, з 1994 г. – сучасная назва.

65 гадоў таму (1954) заснавана праграма радыёвяшчання «Полацкае раённае радыё».

65 гадоў таму (1954) у Оршы заснаваны вячэрні тэхнікум пры Аршанскім ільнокамбінаце, з 1956 г. – вячэрні тэкстыльны тэхнікум, з 1973 г. – Аршанскі механіка-тэхналагічны тэхнікум, з 2002 г. – Аршанскі дзяржаўны механіка-эканамічны каледж.

60 гадоў таму (1959) створана Віцебскае абласное аддзяленне Саюза журналістаў БССР. Зараз – Віцебская абласная арганізацыя Беларускага саюза журналістаў.

60 гадоў таму (1959) у Віцебску ўпершыню на тэрыторыі Беларусі знойдзена берасцяная грамата XII–XIV стст.

60 гадоў таму (1959) адкрыты Віцебскі раённы Дом культуры, зараз – ДУК «Віцебскі раённы цэнтр культуры і творчасці».

60 гадоў таму (1959) у г. Полацку на базе аўтарамонтнага завода створаны ААТ «Полацкі завод «Праммашрамонт».

60 гадоў таму (1959) у г. п. Варапаева Пастаўскага раёна адкрыта музычная школа.

60 гадоў таму (1959) у Полацку заснаваны ААТ «Нафтазаводмантаж».

60 гадоў таму (1959) быў адкрыты Бешанковіцкі раённы Дом культуры ў спецыяльна пабудаваным будынку.

60 гадоў таму (1959) заснаваны клуб прафсаюзнага камітэта студэнтаў Віцебскага ветэрынарнага інстытута. З 1994 г. – Віцебская акадэмія ветэрынарнай медыцыны, з 1998 г. – Віцебскі Дом культуры акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

60 гадоў таму (1959) створаны Віцебскі народны хор народнай песні пры Доме культуры чыгуначнікаў. У 2006 г. – Культурна-спартыўны цэнтр Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі, у 2006 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

60 гадоў таму (1959) у г. Віцебску заснаваны завод сантэхдэталяў № 2, з 1964 г. – завод санітарна–тэхнічных загатовак, з 1997 г. пераўтвораны ў філіял ААТ «Трэст Белсантэхмантаж № 1» – Віцебскі завод сантэхзагатовак.

60 гадоў таму (1959) у Лепельскім раёне было выяўлена радовішча пясчана-гравійных матэрыялаў «Бароўка».

60 гадоў таму (1959) у в. Валынцы Верхнядзвінскага раёна заснавана Валынецкая машынна-меліярацыйная станцыя. З 1960 г. – рамонтна-тэхніка-меліярацыйная станцыя. Зараз – Валынецкае ПМС, Валынецкае прадпрыемства меліярыйных сістэм.

60 гадоў таму (1959) заснаваны завод «Зааветінструмент» у в. Бігосава Верхнядзвінскага раёна. З 1993 г. – ААТ «Інвет».

60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Савельеў Мікалай Сцяпанавіч, вучоны ў галіне льнаводства, кандыдат сельскагаспадарчых навук (1989), з 1986 г. – намеснік дырэктара, галоўны аграном саўгаса «Днепр» Аршанскага раёна Віцебскай вобласці, ураджэнец в. Земцы Шклоўскага раёна.

60 гадоў таму (1959) нарадзілася Рамушкевіч Наталля Мікалаеўна, метадыст-майстар Аршанскага Дома рамёстваў. Мастацкую апрацоўку скуры засвоіла самастойна.

60 гадоў таму (1959) нарадзілася Навічкова Таццяна Аляксееўна, майстар народнай творчасці. З 1995 г. – кіраўнік гуртка «Вышыўка» ДУ «Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо г. Віцебска «Дзвіна», ураджэнка в. Новыя Лаўкі Чашніцкага раёна.

СССР акцёр стаў пасля выхаду на экраны кінафільма «Белыя росы», дзе выканаў ролю старэйшага сына сям'і Ходасаў – Андрэя. Стужка Міхаіла Пташука «Знак бяды» (1986), дзе ён. сыграў Петрака, увайшла ў першую дзесятку еўрапейскіх фільмаў пра вайну, а партрэт Генадзя Гарбука з'явіўся ў Лонданскім музеі кінамастацтва. Ролі ў кіно: «Людзі на балоце», «Белыя росы», «Подых навальніцы», «Чорны замак Альшанскі», «Знак бяды», «Ворагі», «Я памятаю», «Бусляня», «Талаш» і іншыя. Генадзь Гарбук увасобіў на сцэне і ў кіно герояў твораў Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава, Алеся Адамовіча, Янкі Купалы, Івана Мележа, Вінцэнта Дуніна-Марцынкевіча, Андрэя Макаёнка, Аляксея Дударава.

У 1966 годзе за выкананне ролі Васіля Дзятліка ў тэлевізійным спектаклі «Людзі на балоце» паводле Івана Мележа ўзнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі. У 1984 годзе за выкананне ролі Цімоха Чарнушкі ў мастацкім фільме «Людзі на балоце» – Дзяржаўнай прэміяй СССР.

У 1995 годзе Генадзь Гарбук быў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. У 2004 годзе акцёр атрымаў Спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у 2007 годзе – прэмію «За духоўнае адраджэнне», у 2010 годзе – прэмію Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка».

У 2014 годзе Генадзь Міхайлавіч Гарбук адзначыў свой 80-гадовы юбілей творчым вечарам «Песні майго жыцця», дзе публіка ўбачыла яго ў ролі чулага спевака-выканаўцы. 7 мая 2017 года акцёр у апошні раз выйшаў на сцэну ў вобразе Цімоха Чарнушкі ў спектаклі «Людзі на балоце».

Генадзь Міхайлавіч памёр 7 лютага 2018 года. Артыст быў пахаваны на Алеі зорак Усходніх могілак у Мінску.

ЛІТАРАТУРА

1. **Аўсяннікаў, Г. С**. «Не трэба быў яму той Рычард...» / Генадзь Сцяпанавіч Аўсяннікаў ; слухала і натавала Жана Лашкевіч // Мастацтва. – 2018. – № 2. – С. 37.

В. Шукшына), Дункан Макфі («Умовы дыктуе жанчына» Э. Эліса, Р. Рыза), Гастрыт («Вечар» А. Дударава), Сымон («Раскіданае гняздо» Я. Купалы), дзед Курыла («Сымон-музыка» Я. Коласа), Андрэй Буслай («Парог» А. Дударава), Ціхан Пратасавіцкі («Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча), Кучэра («Не мой» паводле А. Адамовіча).

Вострая характарнасць, гумар, выразная пластыка, багатая шматфарбовая жанравая палітра, майстэрскае выкарыстанне яркай сцэнічнай дэталі, гратэску выявілася ў ролях характарных: Зёлкін («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы), Яўмень («Ажаніцца – не журыцца» М. Чарота і Далецкіх, Прокусаў («Верачка» А. Макаёнка), Бацька («Дзверы стукаюць» М. Фермо), Сілан Клёпкін («Пагарэльцы» Макаёнка), Манілаў («Чычыкаў» паводле М. Гогаля), Жыгалаў («Вяселле» паводле А. Чэхава), Палкоўнік («Лістапад. Андэрсен» паводле Алены Паповай) і іншыя. Псіхалагічна насычанай і складанай тэхнічна стала роля Бацькі ў спектаклі «Тата» Дзмітрыя Багаслаўскага.

Імкненнем да арыгінальнай інтэрпрэтацыі пазначаны яго ролі рускага рэпертуару: Акцёр («На дне» М. Горкага, Ціхан («Навальніца» А. Астроўскага), Добчынскі («Рэвізор» М. Гогаля), Сіпаты («Аптымістычная трагедыя»У. Вішнеўскага).

Ролі ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі: Понцій Пілат (аднайменная п’еса А. Курэйчыка), Кароль Лір (аднайменная п’еса У. Шэкспіра) і іншыя.

Значныя работы Гарбука Г. М. у тэлевізійных пастаноўках: «Трэцяе пакаленне» паводле К. Чорнага (Міхал Тварыцкі), «Трывожнае шчасце» паводле І. Шамякіна (Пятро Шапятовіч), «Завеі, снежань» паводле І. Мележа (Апейка), «Крыло цішыні» паводле Я. Сіпакова (дзед Басыла), «Плач перапёлкі» паводле І. Чыгрынава (Радзівон Чубар), «Ткачы» Г. Гаўптмана (Морыц Егер) і іншыя.

З 1970 года артыст пачаў здымацца ў кіно. Усяго ўдзельнічаў у 73 кінапраектах. Першая роля ў вялікім кіно – камандзір партызанскага атрада ў кінафільме «Паланэз Агінскага» Льва Голуба (1971). Вядомым ва ўсім

60 гадоў таму (1959) нарадзілася Сяляева Святлана Леанідаўна, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва па вязанні на прутках і кручком. З 2007 г. – член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, ураджэнка г. Віцебска.

60 гадоў таму (1959) адкрыты Ушацкі раённы Дом культуры.

60 гадоў таму (1959) у г. Наваполацку на базе структурнага падраздзялення завода жалезабетонных вырабаў будаўнічага трэста № 16 «Нефтестрой» створана шматпрофільнае прамысловае прадпрыемства «Наваполацкжалезабетон». З 2001 г. – ВРУП з сучаснай назвай.

60 гадоў таму (1959) адкрыты Лёзненскі раённы Дом культуры.

60 гадоў таму (1959) адкрыты Лепельскі раённы Дом культуры.

60 гадоў таму (1959) у г. Браславе тэатральнаму гуртку пры раённым Доме культуры прысвоена званне «Народны аматарскі тэатр» і сучасная назва.

55 гадоў таму (1964) у Віцебску адкрыты Палац культуры чыгуначнікаў.

55 гадоў таму (1964) арганізаваны Ушацкі раён электрасетак.

55 гадоў таму (1964) у Лепелі быў адкрыты філіял Аршанскага медвучылішча. Закрыты ў 1969 г.

55 гадоў таму (1964) у Віцебску пры Доме культуры чыгуначнікаў створаны ансамбль народнага танца. З 2000 г. – Віцебскі дзіцячы ансамбль танца «Ладачкі», у 2005 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

55 гадоў таму (1964) створаны Віцебскі ўзорны цымбальны аркестр пры абласным Палацы піянераў і школьнікаў (з 1992 г. – абласное аб'яднанне па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі). У 1983 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

55 гадоў таму (1964) у Віцебску заснаваны участак рэспубліканскага камбіната «Белгандальмантаж». З 1974 г. – філіял № 1 рэспубліканскага вытворчага комплексу «Белгандальтэхніка», з 1988 г. – камбінат рэспубліканскага ВА «Белгандальпрагрэс». З 2000 г. – прадпрыемства па аказанні паслуг для забеспячэння бесперабойнай работы халадзільнага, тэхналагічнага абсталявання РВУП «Віцебскаргтэхніка».

55 гадоў таму (1964) у Віцебску на тэрыторыі дрэваапрацоўчага камбіната заснаваны завод буйнапанэльнага домабудавання трэста № 2 «Будіндустрыя». З 1992 г. – філіял РУП «Віцебскі домабудаўнічы камбінат», у 1992 г. аб'яднаны з заводам буйнапанэльнага домабудавання № 2. Зараз – Віцебскі завод буйнапанэльнага домабудавання.

55 гадоў таму (1964) у Чашніцкім раёне заснавана Лукомская ДРЭС – самая вялікая цеплавая электрастанцыя беларускай энергетычнай сістэмы, якая выпрацоўвае каля 40 % усёй электраэнэргіі ў РБ. З 1989 г. – філіял РУП «Віцебскэнерга».

55 гадоў таму (1964) нарадзілася Арэхва Жанна Сяргееўна, народны майстар па лозапляценні, ураджэнка г. Глыбокае.

55 гадоў таму (1964) нарадзілася Чарняўская Таццяна Іванаўна, кіраўнік гуртка па лозапляценні ў Аршанскім раённым Доме культуры, жыве ў г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна, ураджэнка г. п. Лёзна.

55 гадоў таму (1964) нарадзілася Бараўцова Алена Міхайлаўна, кераміст і майстар па мастацкім роспісе, член Беларускага Саюза майстроў народнай торчасці, ураджэнка г. Масквы.

55 гадоў таму (1964) нарадзіўся Шмак Андрэй Іванавіч, беларускі вучоны ў галіне анкалогіі, доктар медыцынскіх навук (2006), ураджэнец г. Віцебска.

2. **Лісаў** Аляксандр Генадзевіч // Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст. : біябібліяграфічны даведнік / Мікалай Півавар. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – С. 187–188.

3. **Пастернак, Т**. Наше слово в энциклопедии / Т. Пастернак // Витебские вести. – 2013. – 16 нояб. – С. 6.



ГАРБУК
ГЕНАДЗЬ МІХАЙЛАВІЧ

Да 85-годдзя з дня нараджэння

(1934)

Гарбук Генадзь Міхайлавіч нарадзіўся 24 ліпеня 1934 года ў вёсцы Глыбачка Ушацкага раёна. Народны артыст Беларусі (1980).

У 1958 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут па спецыяльнасці «Акцёр драматычнага тэатра» (курс народнага артыста Беларускай ССР Дзмітрыя Арлова). У 1958–1962 гадах працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа. У 1962–2017 гадах – праца ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы, дзе Генадзь Гарбук сыграў звыш 80 разнастайных вобразаў. Псіхалагічнай эмацыянальнай глыбінёй вызначаюцца створаныя ім вобразы: Келін («Святая святых» І. Друцэ), Бярозкін («Залатая карэта» Л. Лявонава), Марозаў («Начное дзяжурства» А. Дзялендзіка), Андрэй Ерын («Характары» паводле

Вобласць навуковых інтарэсаў: беларускае мастацтва XIX–XX стагодзяў, гісторыя мастацтва рускага авангарду. Даследуе творчасць М. Шагала, К. Малевіча, Л. Лісіцкага, П. Мансурава.

Аўтар звыш 150 публікацый, у тым ліку манаграфій «Художник Исаак Боровский» (1997), «Краязнавец Мікалай Каспяровіч» (2000), «Историк В. А. Вейгер-Рейдемейстер» (2004), «Сапуновские места Витебска и окрестностей» (2001, 2004) (усё ў сааўтарстве), сааўтар калектыўнай працы «Малевич о себе. Современники о Малевиче. Письма. Документы. Критика» ў 2-х тамах (2004), альбома-каталога «Исаак Боровский» (2007).

Аўтар артыкулаў, прысвечаных мастацкаму жыццю і персаналіям горада Віцебска, у энцыклапедычных выданнях («Беларуская энцыклапедыя», «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі», «Витебск: энциклопедический словарь»), зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, часопісаў, на старонках мясцовага перыядычнага друку.

У 2003–2007 гадах – намеснік рэдактара і аўтар альманаха «Шагаловский международный ежегодник», аўтар публікацый у альманаху «Малевич. Классический авангард. Витебск».

Лісаў А. Г. – удзельнік міжнародных кангрэсаў, канферэнцый, выставачных праектаў у Францыі, Фінляндыі, Германіі, Нідэрландах, Канадзе, Літве, Украіне, Расіі.

З 2017 года – дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

ЛІТАРАТУРА

1. **Кафедра** всеобщей истории и мировой культуры // Витебский государственный университет имени П. М. Машерова. Витебский государственный университет имени П. М. Машерова (1910–2010) / редкол.: А. П. Солодков [и др.]. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2010. – С. 74–75.

55 гадоў таму (1964) нарадзілася Гаравая Людміла Генадзеўна, кіраўнік гурткоў «Абрадавая фларыстыка» і «Спіральнае пляценне» Гарадоцкага раённага Дома рамёстваў і фальклору, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, ураджэнка в. Свір Мядзельскага раёна Мінскай вобласці.

55 гадоў таму (1964) заснаваны Міёрскі мясакамбінат, з 1996 г. – ААТ з сучаснай назвай.

55 гадоў таму (1964) у Оршы створана прамыслова-гандлёвая фірма «Світанак» як аб’яднанне «Праца-калектыў». З 1967 г. фабрыка спецыялізавалася на пашыве дзіцячага адзення, з 1991 г. – арэнднае прадпрыемства, з 1996 г. – ЗАТ.

55 гадоў таму (1964) створаны Віцебскі навучальны цэнтр прафсаюзаў як прафсаюзныя курсы для навучання і інфармавання прафсаюзнага актыву. З 1990 г. – навучальна-метадычны цэнтр Віцебскага абласнога савета прафсаюзаў, з 1991 г. – навучальны цэнтр Віцебскага абласнога аб’яднання прафсаюзаў, з 2000 г. – УП «Навучальны цэнтр Віцебскага абласнога аб’яднання прафсаюзаў Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай», з 2004 г. – ПУП з сучаснай назвай.

55 гадоў таму (1964) створаны горад Новалукомль на беразе возера Лукомскае ў сувязі з будаўніцтвам Лукомскай ДРЭС на месцы рабочага пасёлка Піянерны Бешанковіцкага раёна, з 1965 г. – у Чашніцкім раёне.

55 гадоў таму (1964) у г. Новалукомлі заснавана будаўнічае ўпраўленне Лукомскай ДРЭС, з 1997 г. – філіял будаўнічага ўпраўлення Лукомскай ДРЭС ААТ «Белэнергострой». У 2000 г. далучаны ААТ «Белэнергострой» – аўтакалона № 4 і завод аб’ёмнага домабудавання. З 2003 г. – Упраўленне будаўніцтвам Лукомскай ДРЭС (Лукомльскай ДРЭС).

50 гадоў таму (1969) у Віцебску заснаваны індустрыяльна-педагагічны тэхнікум. З 1996 г. – індустрыяльна-педагагічны каледж, з 2001 – УА «Віцебскі дзяржаўны індустрыяльна-педагагічны каледж», з 2015 – Індустрыяльна-педагагічны каледж УА «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт».

50 гадоў таму (1969) ва Ушачах адкрылася дзіцячая музычная школа.

50 гадоў таму (1969) выйшла ў свет кніга Н. І. Пахомава, Н. І. Дарафеенкі, Н. В. Дарафеенкі «Витебское подполье».

50 гадоў таму (1969) пачалося будаўніцтва Ушацкай раённай бальніцы.

50 гадоў таму (1969) у Віцебску створана службовая гарадская пошта.

50 гадоў таму (1969) у Оршы знесены будынкі езуіцкіх касцёлаў па вуліцах Савецкая і Энгельса.

50 гадоў таму (1969) у Віцебску пачаў працаваць Завод керамічных дрэнажных труб.

50 гадоў таму (1969) у Віцебску адкрыты помнік М. П. Шмырову.

50 гадоў таму (1969) ва Ушачах адкрылася дзіцячая школа мастацтваў.

50 гадоў таму (1969) у Чашніцкім раёне адбыўся пуск першага энергаблока Лукомскай ДРЭС.

50 гадоў таму (1969) археолаг Г. В. Штыхаў выявіў археалагічны помнік Захарнічы – курганны могільнік полацкіх крывічоў каля в. Захарнічы Полацкага раёна.

50 гадоў таму (1969) у г. Наваполацку створаны цырк «Юнацтва» Палаца культуры ААТ «Нафтан», лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. У 1972 г. прысвоена найменне «узорны».

50 гадоў таму (1969) у в. Малыя Лётцы Віцебскага раёна быў адчынены санаторый «Железнодорожник» транспартнага РУП «Витебское отделение Белорусской железной дороги».

ЛІСАЎ

АЛЯКСАНДР ГЕНАДЗЕВІЧ

60 год з дня нараджэння

(1959)

Лісаў Аляксандр Генадзьевіч нарадзіўся 7 ліпеня 1959 года ў г. Шчучын Гродзенскай вобласці. Гісторык, педагог, кандыдат мастацтвазнаўства (1998), член Беларускага Саюза мастакоў (2014).

У 1976 годзе Лісаў А. Г. скончыў Акцябрскую СШ Віцебскага раёна. У 1981 годзе – фізічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава. У 1981–1986 гадах працаваў настаўнікам у сярэдніх школах Вілейскага раёна Мінскай вобласці, 1992–1994 гадах – у Віцебскім мастацкім музеі.

У 1986–2017 гадах – выкладчык Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. У 1992 годзе скончыў аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора АН БССР. Лісаў А. Г. абараніў дысертацыю на тэму «Мастацкае жыццё Беларусі другой паловы XIX–XX стст..». У 1992–1999 гадах – выкладчык, старэйшы выкладчык, з 1999 года – дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры ВДУ імя П. М. Машэрава.

университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2010. – № 1. – С. 52–56.

7. **Клепікаў, М. Я.** Віцебская вучоная архіўная камісія і ахова старажытных помнікаў даўніны / М. Я. Клепікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 4. – С.37–39.

8. **Паўлавіцкая, С.** Адкрываем Віцебшчыну / С. Паўлавіцкая // Краязнаўчая газета. – 2014. – № 19 (май). – С. 7.

9. **Паўлавіцкая, С.** Толькі тры выпускі / С. Паўлавіцкая // Культура. – 2014. – 31 мая. – С. 14.

10. **Ширма, В.** Яркий след – через века / В. Ширма // Віцьбічы. – 2009. – 20 июня. – С. 5, 11.

45 гадоў таму (1974) заснавана Віцебская абласная СДЮШАР прафсаюзаў па гульнявых відах спорту «Дзвіна».

45 гадоў таму (1974) выйшаў бібліяграфічны паказальнік Д. Генінай «Витебск в десяти веках».

45 гадоў таму (1974) выйшаў у свет альбом «Витебск».

45 гадоў таму (1974) выйшла ў свет кніга «Витебск. Историко–экономический очерк».

45 гадоў таму (1974) у г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна адкрыта дзіцячая музычная школа.

45 гадоў таму (1974) у Віцебску была адкрыта абласная дзіцячая бальніца.

45 гадоў таму (1974) у Оршы заснаваны малочны завод. У 1958, 1976–1978 гг. на прадпрыемстве праведзены рэканструкцыі, з 1996 г. – ААТ «Аршанскі малочны камбінат».

45 гадоў таму (1974) заснаваны Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей. Адкрыты з 1976 г.

45 гадоў таму (1974) у Віцебску адкрыты Палац урачыстых абрадаў.

45 гадоў таму (1974) заснаваны Лепельскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж як гідрамеліярацыйны тэхнікум, з 2002 г. – устанава адукацыі з сучаснай назвай.

45 гадоў таму (1974) заснаваны Пастаўскі раённы краязнаўчы музей, у 1976 г. – адкрыты для наведвальнікаў.

45 гадоў таму (1974) заснаваны Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей.

45 гадоў таму (1974) у Гарадку створаны мемарыяльны комплекс на вайсковых могілках.

45 гадоў таму (1974) створана Віцебская абласная арганізацыя Беларускага саюза архітэктараў.

45 гадоў таму (1974) створаны Докшыцкі хлебазавод – філіял РУВП «Віцебскхлебпрам».

45 гадоў таму (1974) у Гарадку створаны вакальна-танцавальны ансамбль «Яблынька» пры раённым Доме культуры (з 1991 г. – гарадскі Дом культуры). З 1983 г. – Гарадоцкі народны ансамбль песні і танца «Яблынька».

45 гадоў таму (1974) заснаваны Віцебскі карданажна-паліграфічны камбінат – прадпрыемства па вытворчасці ўпакоўкі з кардону для харчовай і лёгкай прамысловасці, з 2009 г. – ААТ.

45 гадоў таму (1974) створаны Глыбоцкі камбікормавы завод. У 2000 г. у склад прадпрыемства ўвайшла птушкафабрыка «Полацкая», з 2001 г. – УСВП у складзе Дэпартамента па хлебапрадуктах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

45 гадоў таму (1974) у Полацкім раёне выяўлена радовішча будаўнічага пяску і пясчана-гравійнай сумесі «Канашы». Дэталёва разведана ў 1985–1988 гг.

45 гадоў таму (1974) знойдзены ананімны беларускі празаічны твор сярэдзіны XVII стагоддзя «Казане руске схизматичне», які, верагодна, узнік у г. Віцебску і стылізаваны пад праваслаўную («схізматычную» – раскольніцкую) пропаведзь.

45 гадоў таму (1974) заснавана Віцебская абласная цэнтральная СДЮШАР прафсаюзаў па барацьбе «Богатырь» пры ДФСА «Чырвоны сцяг».

45 гадоў таму (1974) адкрыты Пастаўскі раённы Дом культуры як Дом культуры Савецкай Арміі. З 1991 г. – сучасная назва.

45 гадоў таму (1974) створаны Наваполацкі палац воднага спорту «Садко» як спартыўны комплекс нафтаперапрацоўчага завода «Нафтан». З 2002 г. – Палац воднага спорту «Садко» сацыяльна–жыллёвага комплексу ААТ «Нафтан».

45 гадоў таму (1974) заснаваны Наваполацкі хакейный клуб «Хімік» як спартыўны комплекс «Хімік», з 1989 г. – спартыўны клуб «Хімік» ВА «Палімір», з 1994 г. – Палац спорту і культуры, з

вывучэнні і ахове помнікаў спынілася. Частка найбольш актыўных работнікаў была закліканая ў войска.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў канцы сакавіка 1917 года ў Віцебску быў створаны грамадскі камітэт па ахове помнікаў даўніны, у склад якога Віцебская вучоная архіўная камісія дэлегавала свайго прадстаўніка.

У 1919 годзе ў сувязі са стварэннем губернскага архіўнага ўпраўлення Віцебская вучоная архіўная камісія была ліквідавана, а яе музей, архіў і бібліятэка былі перададзены Віцебскаму аддзяленню Маскоўскага археалагічнага інстытута.

ЛІТАРАТУРА

1. **Баўдзей, В. М.** Дзейнасць Віцебскай вучонай архіўнай камісіі па ўвекавечанні падзей кампаніі 1812 года на Беларусі / В. М. Баўдзей // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2012. – № 8. – С. 27–32.

2. **Витебская** ученая архивная комиссия // Из истории архивов в Беларуси (1860-е гг. – 1960 г.) : документы и материалы / сост.: С. В. Жумарь, М. Ф. Шумейко ; [ред. Т. В. Соловей, Е. В. Хмелевская]. Минск : БелНИИДАД, 2015. – С. 73–91.

3. **Деятельность** Витебской ученой архивной комиссии (1909–1919): документы и материалы [Электронный ресурс] / авт.-сост.: Т. В. Кузьминич [и др.] ; под науч. ред. Т. В. Кузьминич ; Национальная библиотека Беларуси [и др.]. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2017. – 1 электронный оптический диск (DVD-R).

4. **Казакевіч, З.** Архіўная камісія ў святле сучаснасці / З. Казакевіч // Витебский проспект. – 2009. – 14 мая. – С. 5.

5. **Камінскі, М. І**. Віцебская вучоная архіўная камісія / М. І. Камінскі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Сачанка [і інш.] ; мастак Э. Э. Жакевіч . – Мінск. : БелЭн імя Петруся Броўкі, 1994. –. Т. 2 : Беліцк – Гімн. – С. 322–323.

6. **Клепікаў, М. Я.** Ахова віцебскіх помнікаў даўніны ў пачатку XX стагоддзя / М. Я. Клепікаў // Вестник Полоцкого государственного

Акрамя гэтых зборнікаў быў выпушчаны шэраг асобных выданняў супрацоўнікаў камісіі: публікацыя В. Арсеньева пра асабовы склад камісіі, К. Змігродскім падрыхтаваны каталог манет і медалёў музея, М. Мельнікавай складзены каталог архіва камісіі і іншыя.

У сувязі са стагоддзем разгрому Напалеона ў Расіі камісія правяла вялікую работу па ўшанаванні памяці герояў Айчыннай вайны 1812 года, адшуканні брацкіх магіл, устаноўцы помнікаў на Віцебшчыне. Быў створаны спецыяльны камітэт з 18 чалавек. На сабраныя сродкі пабудаваны помнік у гонар герояў Айчыннай вайны 1812 года ў Віцебску.

У 1910 годзе па ініцыятыве камісіі быў адкрыты Віцебскі настаўніцкі інстытут, у 1911 годзе – Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. Камісія мела кантакты больш чым з 100 навуковымі ўстановамі Расіі і замежных краін.

У 1912 годзе Віцебская вучоная архіўная камісія паставіла за мэту спыніць знішчэнне архіўных матэрыялаў. Пры ёй была камісія для разгляду архіўных спраў ва ўстановах. Справы, якія мелі гістарычнае, этнаграфічнае і іншае навуковае значэнне, падлягалі захаванню ў архіве камісіі. Перашкодай у рабоце Віцебскай архіўнай камісіі была адсутнасць сваіх памяшканняў для гістарычнага архіва, археалагічнай калекцыі і бібліятэкі. З кастрычніка 1910 года маёмасць камісіі размяшчалася ў інстытуце. Спачатку ў асобным пакоі, а потым у настаўніцкай і прыёмнай.

У 1915 годзе Віцебская вучоная архіўная камісія ўзгадніла з губернатарам пытанне пра перадачу ёй двух памяшканняў пры архіве губернскага праўлення. Быў нават складзены каштарыс на рамонт. Але ў канцы ліпеня ўсе працы спыніліся па распараджэнні губернскай улады. У гэтых памяшканнях пачалі размяшчаць вайсковыя архівы, якія эвакуіравалі з Вільні і Дзвінска. А ў жніўні 1915 года Віцебская вучоная архіўная камісія была вымушана пакінуць і будынак настаўніцкага інстытута. У ім размясціўся штаб Дзвінскай вайсковай акругі. Бібліятэчныя і архіўныя шкафы былі пакінуты на месцы, але карыстацца імі было немагчыма. Археалагічныя калекцыі былі пакладзены ў скрыні. Праца па збору,

2003 г. – камунальнае спартыўна-культурнае прадпрыемства «Палац спорту і культуры г. Наваполацка», у 2005 г. рэарганізаваны шляхам далучэння да камунальнага спартыўнага УП «Хакейны клуб «Хімік».

45 гадоў таму (1974) створаны помнік вызваліцелям у Віцебску (архітэктар Ю. Шпіт, скульптар Б. Маркаў, Я. Печкін), мемарыяльны комплекс у гонар воінаў-вызваліцеляў, партызын і падпольшчыкаў Віцебшчыны ў Вялікую Айчынную вайну.

40 гадоў таму (1979) уведзены ў эксплуатацыю Аршанскі завод жалезабетонных вырабаў, спецыялізаваўся на вытворчасці вырабаў, якія выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы. З 1994 г. – ВРУП, з 1996 г. – даччынае КУПП у распараджэнні «Віцебскаблсельбуд».

40 гадоў таму (1979) у Віцебску ўстаноўлены бюст С. М. Кіраву.

40 гадоў таму (1979) заснаваны і адкрыты Бешанковіцкі гісторыка-краязнаўчы музей.

40 гадоў таму (1979) у Віцебску створана аб'яднанне «Рамбыттэхніка». Зараз – дзяржаўнае камунальнае УП «Вітрамбыт».

40 гадоў таму (1979) створаны Віцебскі хор «Вясёлка» пры СШ № 27. У 1989 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

40 гадоў таму (1979) створаны азёрны (зараз – гідралагічны) заказнік рэспубліканскага значэння «Белае» ў Глыбоцкім і Ушацкім раёнах.

40 гадоў таму (1979) у Полацкім раёне заснаваны азёрны заказнік. З 2007 г. – гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Глыбокое – Вялікае Астравіта».

40 гадоў таму (1979) у Віцебскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Запольскі».

40 гадоў таму (1979) ва Ушацкім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Крывое».

40 гадоў таму (1979) у Полацкім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Лонна».

40 гадоў таму (1979) у Віцебскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Мошна».

40 гадоў таму (1979) у Браслаўскім раёне заснаваны азёрны заказнік, з 2007 г. – гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Рычы».

40 гадоў таму (1979) у Шумілінскім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Сосна».

40 гадоў таму (1979) у Расонскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Фаміно».

40 гадоў таму (1979) у Віцебскім раёне заснаваны заказнік–журавіннік. З 2007 г. – біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Чысцік».

40 гадоў таму (1979) было адкрыта Віцебскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву.

40 гадоў таму (1979) Верхнядзвінская раённая бібліятэка была рэарганізавана ў цэнтральную раённую бібліятэку.

40 гадоў таму (1979) у г. п. Бешанковічы быў заснаваны музей баявой славы. Зараз – Бешанковіцкі раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

40 гадоў таму (1979) быў адкрыты Віцебскі абласны псіханеўралагічны дыспансер.

40 гадоў таму (1979) у Оршы пры дзіцячай музычнай школе № 1 (з 2004 г. – пры гарадскім Цэнтры культуры) быў створаны Аршанскі народны духавы аркестр. У 1986 г. было прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

26 лютага 1909 года віцебскаму губернатару барону Б. Б. Гершаў-Флотаву было перададзена прашэнне Е. Р. Раманава, А. П. Сапунова, В. С. Арсеньева аб заснаванні ў губерні архіўнай камісіі. Прашэнне падпісалі 52 чалавекі, сярод якіх М. М. Багародзкі, В. С. Арсеньеў, М. Я. Нікіфароўскі і іншыя.

Першым яе старшынёй быў абраны саветнік губернскага праўлення В. С. Арсеньеў (1883–1947). Спачатку камісія змяшчалася ў будынку губернскага праўлення, а потым – у памяшканні Віцебскага настаўніцкага інстытута па вуліцы Гогалеўскай. У пастаянны штат новай арганізацыі ўвайшлі восем чалавек. У канцы 1910 года камісія налічвала 28 членаў-заснавальнікаў, 99 ганаровых членаў (Я. Ф. Карскі, А. А. Шахматаў, Б. І. Эпімах-Шыпіла і іншыя) і 325 правадзейных членаў (сярод іх мясцовыя гісторыкі і краязнаўцы М. В. Анцаў, У. А. Кадыгробаў, М. Я. Нікіфароўскі, К. І. Ціхаміраў і ішыя).

У жніўні 1910 года замест В. Арсеньева, які пераехаў у Тулу, старшынёй камісіі быў абраны таварыш пракурора Віцебскага акруговага суда У. А. Кадыгробаў. У 1912 годзе – дырэктар Віцебскага настаўніцкага інстытута К. І. Ціхаміраў.

Віцебская вучоная архіўная камісія мела праўленне, савет, гістарычны архіў (314 спраў), музей (1069 манет і 39 медалёў), бібліятэку (3700 тамоў). Камісія існавала на субсідыі ўрада (адначасова 500 рублёў і 200 рублёў штогод), членскія ўносні, грашовыя ахвяраванні ад прыватных асоб і устаноў, зборы з лекцый.

Паводле статута камісія мела на мэце ахову помнікаў гісторыі і культуры, вывучэнне і папулярызацыю гісторыі роднага краю, збіранне прадметаў старажытнасці, правядзенне археалагічных раскопак, збор і вывучэнне старадаўніх рукапісаў і дакументаў, арганізацыю экскурсій па гістарычных месцах, выданне навуковых і папулярных прац па гісторыі, геаграфіі, археалогіі і этнаграфіі Віцебшчыны.

У 1910 годзе выйшаў першы том «Труды Витебской ученой архивной комиссии». Потым назва змянілася на «Полоцко-Витебская старина». Выдадзена было тры выпускі перыядычнага часопіса.

7. **Анісенка, В. Д**. Віцебскі перыяд – гэта песня / В. Д. Анісенка ; гутарыла Н. Сцяпура // Рэспубліка. – 2014. – 29 лістап. – С. 7.

8. **Навуменка,** В. Т. Анісенка Валерый Данілавіч / В. Т. Навуменка // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2002. – Т. 1 : А–К. – С. 41–42.

9. **Пастернак, Т**. Признание режиссера / Т. Пастернак // Витебские вести. – 2014. – 27 марта. – С. 23.

10. **Шнэйдар, А**. У што верыць Анісенка? / А. Шнэйдар // Культура. – 2013. – 24 жн. – С. 9.

11. **Шымук, Т**. Макбет у Мінску / Т. Шымук // Літаратура і мастацтва. – 2014. – 13 чэрв. – С. 13.

ВІЦЕБСКАЯ ВУЧОНАЯ АРХІЎНАЯ КАМІСІЯ

Да 110-годдзя з дня заснавання (1909)

13 чэрвеня 1909 года была створана Віцебская вучоная архіўная камісія (1909–1919) – гістарычнае таварыства, якое займалася збіраннем архіўных, фальклорна–этнаграфічных і археалагічных матэрыўялаў.

40 гадоў таму (1979) заснаваны Адаменскі народны фальклорны гурт «Медуніца» сельскага Дома культуры Лёзненскага раёна.

40 гадоў таму (1979) створаны Віцебскі духавы аркестр пры СШ № 1 (з 2007 г. – гімназія № 3 імя А. С. Пушкіна). У 1982 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

40 гадоў таму (1979) створаны Віцебскі хор пры школе мастацтваў № 1 на базе харавога аддзялення. У 1983 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў». Зараз – Віцебскі ўзорны хор.

40 гадоў таму (1979) у г. Глыбокае створана будаўнічае прадпрыемства СПМК–176 (з 1986 г. – СПМК-26, з 2001 г. – будаўнічае РУП «СПМК-26»). З 2003 г. – даччынае камунальнае ўнітарнае будаўнічае прадпрыемства Глыбоцкая СПМК-26.

40 гадоў таму (1979) у Віцебску заснаваны завод ВА «Саюзэнергааўтаматыка», з 2009 г. – філіял навукова-даследчага і праектнага РУП «БЕЛТЭЙ» (Беларускі цеплаэнергетычны інстытут). Зараз – Віцебскі вопытна-эксперыментальны завод.

40 гадоў таму (1979) у Полацкім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Глыбокае–Чарбамысла».

40 гадоў таму (1979) у Глыбоцкім раёне заснаваны азёрны заказнік «Доўгае». З 2007 г. – гідралагічны.

40 гадоў таму (1979) у Браслаўскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Забалацце».

35 гадоў таму (1984) выйшла кніга В. М. Ляўко «Экскурсия по древнему Витебску».

35 гадоў таму (1984) у г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна быў створаны Арэхаўскі народны хор.

35 гадоў таму (1984) у Браславе заснаваны гісторыка-краязнаўчы музей на базе школьнага музея. Зараз – Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў.

35 гадоў таму (1984) у Оршы заснаваны гарадскі Дом культуры. З 2004 г. – Аршанскі гарадскі Цэнтр культуры.

35 гадоў таму (1984) створаны Віцебскі камерны хор пры тэлевізійным заводзе (з 2007 г. – пры Цэнтры культуры «Віцебск»). У 1989 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

35 гадоў таму (1984) заснаваны Шумілінскі гісторыка-краязнаўчы музей, у 1986 г. адкрыты для наведвальнікаў.

35 гадоў таму (1984) на тэрыторыі Полацкага Ніжняга замка знойдзены Полацкі рэчавы скарб.

35 гадоў таму (1984) заснаваны Лёзненскі лясгас як дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова на тэрыторыі Лёзненскага раёна.

35 гадоў таму (1984) у Аршанскім раёне выяўлены археалагічны помнік – стаянка каменнага веку «Берасценава». У 1987–1988 гг. У. П. Ксяндзоў даследаваў 829 м^2.

30 гадоў таму (1989) у Віцебску адкрыты Літаратурны музей. Спыніў сваю дзейнасць у 2009 годзе.

30 гадоў таму (1989) у Віцебску здадзены ў эксплуатацыю Палац культуры і тэхнікі лёгкай прамысловасці. Зараз КЗ «Віцебск» Цэнтра культуры «Віцебск».

30 гадоў таму (1989) заснаваны Полацкі ўзорны ансамбль народнай музыкі «Таўкачыкі» дзіцячай школы мастацтваў.

30 гадоў таму (1989) адноўлена Полацкая праваслаўная епархія – найстарэйшая ў Беларусі, датай заснавання якой лічыцца 992 год.

30 гадоў таму (1989) у Полацку быў адноўлены Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр.

Валерый Данілавіч сыграў мноства роляў у тэатры і кіно. У 1986 годзе выйшаў міні-серыял «Паляванне на апошняга жураўля», рэжысёрам якога з’яўляецца В. Д. Анісенка.

У 2012–2014 гадах – дырэктар-мастацкі кіраўнік, у 2014–2017 гадах – мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. На коласаўскай сцэне ім пастаўлены спектаклі: «Кракаўскі студэнт» Г. Марчука (2008), «Песні ваўка» В. Паніна (2012), «Ліфт» Ю. Чарняўскай (2012), «Што баліць?» Л. Агулянскага (2013), «Макбет» У. Шэкспіра (2013), «Пахавайце мяне за плінтусам» П. Санаева (2013), «Матылёк… Матылёк…» А. Нікалаі (2016).

У 2018 годзе мастацкі кіраўнік Мінскага абласнога драматычнага тэатра, рыжысёр і выканаўца галоўнай ролі Валерый Данілавіч Анісенка паставіў спектакль «Дырыжор» па п’есе ізраільскага драматурга Л. Агулянскага, прэм’ера якога адбылася ў Белаусі і Ізраілі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Анисенко, В**. «Воля крепка и есть цель в творчестве!» / Валерий Анисенко // Нёман. – 2014. – № 6. – С. 195–207.
2. **Анисенко, В. Д.** Валерий Анисенко: «Мне жаль людей, которые не любят театр» / В. Д. Анисенко ; беседовала Т. Пастернак // Витебские вести. – 2014. – 7 июня. – С. 12.
3. **Анисенко, В. Д**. Исповедь дилетанта / Валерий Анисенко. – Минск. : Четыре четверти, 2011. – 168 с.
4. **Анисенко** Валерий Данилович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 18–19.
5. **Анісенка** Валерый Данілавіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 1 : А–Б. – С. 164.
6. **Анісенка, В. Д**. Валерый Анісенка: «Тэатр – мой храм і маё жыццё» / В. Д. Анісенка ; гутарыў З. Прыгодзіч // Звязда. – 2013. – 17 крас. – С. 11.

Караткевіча, «Мёртвым не баліць» паводле Быкава (1990). Анісенка В. Д. зрабіў радыёверсіі спектакляў «Мудрамер» Матукоўскага Беларускага тэатра імя Я. Купалы, «Знак бяды» паводле Быкава Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра (1989). У 1990 годзе за апошнюю Валерый Данілавіч атрымаў дыплом на радыёфестывалі тэатраў СССР. Іншыя радыёпастаноўкі: «Гаспадар (1983) і «Дыягназ» А. Дзялендзіка, «Вячэра Я. Шабана і «Паляванне на апошняга жураўля» паводле А. Жука (абедзве 1984), «Дарога ў Хатынь» паводле Б. Сачанкі і «Злавеснае рэха» Петрашкевіча (абедзве 1985), «Загад № 1» (1987), «Таямніца чорных гор» (1988) і «Сыны» (1989) паводле М. Чаргінца.

У 1997 годдзе – дацэнт Беларускага ўніверсітэта культуры.

У 2000–2012 гадах – дырэктар і мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра Беларускай драматургіі. Рэжысёрскай манеры Анісенка В. Д. ўласцівы прафесіяналізм, імкненне да актуальнасці, спалучэння гісторыі і сучаснасці. Сярод пастановак «Жанчыны Бергмана» М. Рудкоўскага (2001), «Понцій Пілат» (2002) і «П'емонцкі звер» (2004) А. Курэйчыка, «Кабала святош» («Мальер») М. Булгакава (з С. Кавальчыкам, і роля Мальера) і «Трыбунал» А. Макаёнка (абодва 2005), «Белы анёл з чорнымі крыламі» Дз. Балыка (2006), «Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіча (2008), «Чайка» А. Чэхава (2009), літаратурна-вакальная кампазіцыя «Прызнанне» (2007) і іншыя.

Асобны перыяд у яго рэжысёрскай дзейнасці складае праца над трагедыямі У. Шэкспіра: «Рычард» (1995) і «Макбет» (1996; лаўрэаты 49-га і 50-га Міжнароднага Эдынбургскага фестывалю) – у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, «Гамлет» (1997) – на Малой сцэне Нацыянальнага тэатра імя Я. Купалы, якія вызначаліся неардынарным падыходам і мелі эксперыментальны характар.

Анісенка В. Д. – аўтар тэкста лекцый «Канспект па Шэкспіры» на рускай, іспанскай і англійскай мовах (1997), кніг «Нататкі пачаткоўца» (2004), «Споведзь дылетанта» (2011), «Спроба асэнсавання» (2012), а таксама шэрагу артыкулаў у рэспубліканскай і замежнай прэсе.

30 гадоў таму (1989) Віцебская абласная філармонія была створана на базе гастрольна-канцэртнага аддзялення Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

30 гадоў таму (1989) адкрыты Глыбоцкі Дом рамёстваў.

30 гадоў таму (1989) створаны Верхнядзвінскі народны клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў пры раённым Доме культуры. З 2005 г. дзейнічае пры раённым Доме рамёстваў.

30 гадоў таму (1989) у в. Валынцы Вернядзвінскага раёна быў заснаваны Валынецкі краязнаўчы музей імя І. Д. Чэрскага. З 2009 г. – філіял «Валынецкі краязнаўчы музей імя І.Д. Чэрскага» дзяржаўнай установы культуры «Верхнядзвінскі гісторыка-краязнаўчы музей».

30 гадоў таму (1989) у Віцебску заснаваны завод харчовых канцэнтратаў. Сучасная назва – Камунальнае вытворчае унітарнае прадпрыемства «Кандытарская фабрыка «Віцьба».

30 гадоў таму (1989) заснаваны Дрысвяцкі фальклорны гурт «Вярба» сельскага Дома культуры Браслаўскага раёна, у 1998 г. прысвоена званне «народны».

30 гадоў таму (1989) у Віцебску створаны аркестр народных інструментаў пры Палацы культуры і тэхнікі прафсаюзаў. З 1993 г. дзейнічае пры СШ № 44. У 1993 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў», з 2000 г. – Віцебскі ўзорны аркестр народных інструментаў «Расінка».

30 гадоў таму (1989) заснаваны Каўшэлеўскі фальклорны ансамбль «Купалінка» сельскага Дома культуры Шаркаўшчынскага раёна, у 1999 г. прысвоена званне «народны».

30 гадоў таму (1989) створана Гарадоцкае народнае аматарскае аб'яднанне «Зялёная альтанка» пры раённай бальніцы (з 2001 г. – пры раённым краязнаўчым музеі). Зараз – пры

Доме рамёстваў і фальклору. У 1995 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

30 гадоў таму (1989) створаны Віцебскі тэатр гульні на базе гарадскога Цэнтра культуры (з 2007 г. – Цэнтр культуры «Віцебск»). У 1995 г. прысвоена званне «Народны аматарскі тэатр».

30 гадоў таму (1989) у Віцебску створаны гурток «Фальклор» пры гімназіі № 7. У 1999 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў» і сучасная назва. Зараз – Віцебскі ўзорны фальклорны тэатр «Пралеска».

30 гадоў таму (1989) створаны Віцебскі фальклорны калектыў «Зорачкі» пры СШ № 15 (з 1994 г. – гімназія № 1). У 2006 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

30 гадоў таму (1989) створаны народны клуб ветэранаў «Красная гвоздика» пры гарадскім Цэнтры культуры г. Дзісна Мёрскага раёна. У 2003 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

30 гадоў таму (1989) у г. Полацку заснаваны будаўніча-мантажны трэст № 22, з 1996 г. – РУП у распараджэнні Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь.

30 гадоў таму (1989) у Полацку пры гарадскім Палацы культуры створана народнае літаратурнае аб'яднанне «Полоцкая ветвь». У 2005 г. – прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

30 гадоў таму (1989) створаны Лепельскі ўзорны тэатр-студыя «Сюрпрыз» пры дзіцячай школе мастацтваў на базе тэатральнага і харэаграфічнага аддзяленняў. У 2000 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі тэатр».

30 гадоў таму (1989) створаны Лепельскі народны клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў «Скарбонка». У 1991 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

тэатральныя курсы пры Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва ў Маскве (педагогі Р. Сіманаў, А. Ганчароў).

У 1965–1967 гадах – акцёр Беларускага тэатра імя Я. Коласа, дзе ў адной з першых роляў Улдыса («Ветрык, вей!» Я. Райніса) звярнуў на сябе ўвагу тэмпераментам, павышанай эмацыянальнасцю. Сыграў таксама ролі Павала Няміры («Бацькаўшчына» К. Чорнага), Славіка («Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна).

У 1969–1977 гадах – акцёр Беларускага тэатра імя імя Я. Купалы. Найбольш значныя ролі: Хаценьчык («Амністыя» М. Матукоўскага), Камкоў («Пратакол аднаго пасяджэння» А. Гельмана), Зёлкін («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы).

У 1979–70-я гады актыўна займаўся канцэртна-выканальніцкай дзейнасцю як чытальнік, у тым ліку оперы «Джардана Бруна» С. Картэса (Дзяржаўны тэатр оперы і балета Беларусі, персанаж – ад Аўтара), у араторыі «Мая Радзіма» Дз. Смольскага (Беларуская філармонія).

У 1979–1980 гадах – галоўны рэжысёр Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, у якім паставіў спектакль «Спытай сябе» М. Саенкі (1979).

У 1981–1982 гадах – галоўны рэжысёр Тэатра-студыі кінаакцёра (спектаклі «Усё яго жыццё» паводле Я. Габрыловіча, «Сам-насам з усімі» Гельмана). У Брэсцкім абласным тэатры паставіў спектакль «Машэка» паводле аднайменнай п'есы М. Арахоўскага (1989).

У 1989–2000 гадах – галоўны рэжысёр Беларускага радыё, дзе паставіў каля 100 радыёспектакляў пераважна паводле твораў беларускіх аўтараў: «Нельга забыць» (1986), «Чорны замак Альшанскі» (1988) паводле У. Караткевіча, «Родныя дзеці» паводле Н. Гілевіча (1988), «Кар'ер» (1987), «У тумане» (1989) В. Быкава (Дзяржаўная прэмія Беларусі, 1990), «Апошняя пастараль» паводле А. Адамовіча (1989).

Больш за 15 пастановак прайшлі на Усесаюзным радыё. Сярод іх «Расплата» паводле У. Цендракова (1985), «Мой друг, вялікі Чалавек» А. Петрашкевіча (1986), «Катастрофа» Э. Скобелева (1988), «Кола шчасця» паводле А. Купрына (1989), «Каласы пад сярпом тваім» паводле

Чэрвень



АНІСЕНКА
ВАЛЕРЫЙ ДАНІЛАВІЧ
75 год з дня нараджэння
(1944)

Анісенка Валерый Данілавіч нарадзіўся 5 чэрвеня 1944 года ў горадзе Талачын Віцебскай вобласці. Беларускі акцёр, рэжысёр, педагог. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1991). лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2002), прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2005), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2011), кавалер ордэна Ф. Скарыны. У 1965–1977 гг. – акцёр беларускіх тэатраў імя Я. Коласа і Я. Купалы, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, акадэмік Міжнароднай Кірыла-Мяфодзіеўскай акадэміі славянскай асветы. У 2012–2017 гг. – мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа.

У 1965 годзе Анісенка В. Д. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (курс Д. Арлова), у 1978 годзе – Вышэйскія рэжысёрскія

25 гадоў таму (1994) створаны артыстычны калектыў у в. Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна. Зараз – народны драматычны калектыў Дзеркаўшчынскага цэнтра культуры.

25 гадоў таму (1994) у Віцебску адбыўся I Міжнародны Шагалаўскі пленэр, творчая сустрэча мастакоў. У 1997 г. адбылася другая сустрэча.

25 гадоў таму (1994) створаны Віцебскі дзіцяча-юнацкі тэатр моды «Наш стыль» пры абласным аб'яднанні па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі. У 2004 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

25 гадоў таму (1994) заснаваны Аршанскі гарадскі Дом рамёстваў пры гарадскім Палацы культуры. З 1997 г. – самастойная арганізацыя, з 2008 г. размяшчаецца ў рэканструяваным будынку былой бурсы калегіума езуітаў.

25 гадоў таму (1994) створаны Верхнядзвінскі народны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Ярыца» пры раённым Доме культуры. У 1996 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

25 гадоў таму (1994) створаны Віцебскі Цэнтр народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінне». З 2010 –Цэнтр народных рамёстваў і мастацтваў «Дзвіна», з 2011 – ДУ «Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна».

25 гадоў таму (1994) створана Аршанская ўзорная студыя эстраднай песні «Рафлезія» пры гарадскім Доме культуры (з 2004 г. – гарадскі Цэнтр культуры). У 1996 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

25 гадоў таму (1994) створана Віцебская мастацкая студыя «Тюбики» пры Мастацкім музеі. У 1998 г. прысвоена званне «Узорная мастацкая студыя».

25 гадоў таму (1994) створана Віцебская пачатковая студыя-школа выяўленчага мастацтва «Парасткі» пры абласным аб'яднанні па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі. У 2001 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

25 гадоў таму (1994) у Віцебску пры СШ № 3 створаны гурток «Паэтычны тэатр». У 2006 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў» і сучасная назва. Зараз – Віцебскі ўзорны тэатральны калектыў «Прэм'ера».

25 гадоў таму (1994) у Віцебску заснавана ЗАТ са спецыялізацыяй па забеспячэнска-збытавай дзейнасці ў галіне малой і сярэдняй энергетыкі. З 2000 г. – прадпрыемства па вытворчасці і рэалізацыі вадаачышчальнага абсталявання.

25 гадоў таму (1994) створана Наваполацкае АГА фірма «Белсэрвіс» – будаўніча-мантажнае і праектнае прадпрыемства.

25 гадоў таму (1994) у Віцебску заснавана вытворчае рамонтна-будаўнічае прадпрыемства АТ «Дэльта». З 2001 г. – АГА.

25 гадоў таму (1994) швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» пераўтворана ў ААТ.

25 гадоў таму (1994) у Аршанскім раёне створаны Андрэеўшчынскі народны сямейны клуб «Надзея» пры сельскай бібліятэцы-філіяле № 34 Аршанскай раённай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы.

25 гадоў таму (1994) у Полацку Дом культуры быў перайменаваны ў Полацкі гарадскі Палац культуры.

25 гадоў таму (1994) адкрыты Полацкі гарадскі Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур.

25 гадоў таму (1994) у г. Віцебску заснавана ТАА «Рубікон» – прадпрыемства па вытворчасці і рэалізацыі ветэрынарных прэпаратаў, інструментаў і абсталявання.

3. **Дашкевіч, С**. Падарунак да дня нараджэння / С. Дашкевіч // Народнае слова. – 1999. – 20 мая. – С. 2.

4. **Замкоўскі, А**. Яе лёс – тэатр / А. Замкоўскі // Витебские вести. – 2014. – 22 мая. – С. 23.

5. **Іваноўскі, Ю**. Яна не іграе – яна жыве / Ю. Іваноўскі // Віцебскі рабочы. – 1999. – 22 мая. – С.3.

6. **Катовіч, Т**. Ціхая і глыбокая годнасць чалавека / Т. Катовіч // Культура. – 1999. – № 26–27 (ліп.). – С. 13.

7. **Котович, Т.** ...И тайное страдание в глазах / Т. Котович // Вечерний Витебск. – 1999.– 22 мая.– С. 3.

8. **Маркіна, Г. М**. Петрачкова Валянціна Цімафееўна / Г. М. Маркіна // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 2 : Л–Я. – С. 253–254.

9. **Петрачкова, В**. Са скарбонкі памяці / В. Петрачкова // Народнае слова. – 2006.– 17 кастр. – С. 5.

10. **Петрачкова** Валянціна Цімафееўна // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал.: У. У. Андрыевіч [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2015. – Т. 6 : М–Я. – С. 166.

11. **Петрачкова** Валентина Тимофеевна // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 293–294.

12. **Петрачкова** Валянціна Цімафееўна // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2003. – Кн. 2. – С. 501.

(«Будзьце здаровы!» П. Шэно», Куліна («Залёты» В. Дуніна-Марцінкевіча), Ліка («Маскоўскі хор» Л. Петрушэўскай), Старая («Крэслы» Э. Іанеска), Памела («Дарагая Памела Кронкі!» Д. Патрыка), Філіцата («Праўда – добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага), Яўдакія Піліпаўна («За двума зайцамі» М. Старыцкага), Вяшчунка («Пакрыўджаныя» Л. Родзевіча), Пелагея («Тры мяхі засмечанай пшаніцы» У. Цендракова), Марфа («Улада цемры» Л. Талстога), Цыепа («Ветрык, вей!» Я. Райніса), Смеральдзіна («Слуга двух гаспадароў» К. Гальдоні), Сойка («Доктар філасофіі» Б. Нушыча), Баба-аднавочка («Клеменс» К. Саі), Марыя-Хасэфа («Дом Бернарды Альбы» Федэрыка Гарсія Лойкі). Тонкім псіхалагізмам і ўнутранай засцяроджанасцю вылучаюцца ролі Ганны («Вечар» А. Дударава), Жэні («Варвара і яе блудны муж» паводле Г. Марчука), Жонкі унтэр-афіцэра («ЧП-1» і «ЧП-2» паводле «Рэвізор» М. Гогаля).

Ролі ў кіно: «Подых навальніцы» (1982), «Людзі на балоце» (1981), «Палеская хроніка» (1981–1982), «Новая зямля» (1982), «Трывогі першых птушак» (1985), «Знак бяды» (1986), «Паляванне на апошняга жураўля» (1986), «Плач перапёлкі» (1990), «Чырвоны востраў» (1991), «Белые одежды» (1992), «Будулай, якога не чакаюць» (1994), «У жніўні 44-га…» (2001), «Свежына з салютам» (2001).

Валянціна Петрачкова: «Жыццё ў тэатры?!.. Мілыя мае! Як гэта складана, як гэта складана!..».

ЛІТАРАТУРА

1. **Валянціна** Петрачкова // І смех, і слёзы, і любоў... (ад ранку да вечара ў тэатры): да 85-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа / рэд.: С. М. Дашкевіч, М. Л. Пятрова ; фота Г. А. Жыгур. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2011. – [С. 43].

2. **Валянціна** Петрачкова // Коласаўцы: да 80-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа : альбом / рэд.: Л. Грамыка, С. Дашкевіч. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2006. – С. 49.

25 гадоў таму (1994) у Віцебску на базе завода «Эвістар» заснавана прадпрыемства па вытворчасці пячатных плат «Эвілам» як даччынае вытворчае РУП.

25 гадоў таму (1994) у Наваполацку спартыўны клуб «Хімік» ВА «Палімір» перайменаваны ў Палац спорту і культуры, з 2003 г. – камунальнае спартыўна–культурнае прадпрыемства «Палац спорту і культуры г. Наваполацка», у 2005 г. рэарганізаваны шляхам далучэння к камунальнаму спартыўнаму УП «Хакейны клуб «Хімік».

20 гадоў таму (1999) у в. Лявонпаль Мёрскага раёна заснаваны музей радзімазнаўства.

20 гадоў таму (1999) заснаваны Пастаўскі раённы архіў па асабоваму складу.

20 гадоў таму (1999) створаны Віцебскі народны ансамбль народнай песні «Сябрына» пры ВА «Маналіт». З 2007 г. дзейнічае пры ДУ «Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна». У 2007 г прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) у Пастаўскім і іншых раёнах Беларусі заснаваны Нацыянальны парк «Нарачанскі», дзяржаўная прыродаахоўная установа.

20 гадоў таму (1999) Віцебскі медыцынскі інстытут быў перайменаваны ў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт ордэна Дружбы народаў.

20 гадоў таму (1999) у Браславе гарадскі Дом культуры быў перайменаваны ў Браслаўскі раённы Дом культуры.

20 гадоў таму (1999) пабудаваны Віцебскі Палац спорту.

20 гадоў таму (1999) у Віцебску створана народная эстрадна-вакальная студыя «Канстанта» пры Доме культуры Віцебскай акадэміі

ветэрынарнай медыцыны. У 2008 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) створаны Верхнядзвінскі народны клуб аматараў моды «Вобраз» пры дзіцячай школе мастацтваў. У 2004 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) у Віцебску створаны ансамбль рускіх народных інструментаў выкладчыкаў на базе дзіцячай музычнай школы № 4. З 2005 г. – Віцебскі народны ансамбль «Кантраст», у 2006 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) у Полацку створана творчае аб'яднанне маладых мастакоў «Белый круг».

20 гадоў таму (1999) Гарадоцкі фальклорны калектыў «Глейна» быў створаны пры раённым метадычным цэнтры народнай творчасці культасветработы. У 2007 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) у Віцебску было заснавана замежнае ПУВП «Вителла» – прадпрымства па вытворчасці шакаладнай, какавазмяшчаючай глазуры, сухіх сумесяў для шакаладных паст, цукрыстых кандытарскіх вырабаў. З 2000 г. – рэзідэнт свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск».

20 гадоў таму (1999) створаны Віцебскі народны хор пры УП «Віцебскаблгаз». У 2009 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) Верхнядзвінскі эстрадны гурт «Праект» быў створаны пры СШ № 1 (з 2001 г. – пры раённым Доме культуры). У 2004 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) створана Віцебская студыя эстраднай песні «Форум» пры гарадскім Цэнтры культуры (з 2007 г. – Цэнтр

ПЕТРАЧКОВА
ВАЛЯНЦІНА ЦІМАФЕЕЎНА

80 год з дня нараджэння

(1939)

Петрачкова Валянціна Цімафееўна нарадзілася 21 мая 1939 года ў г. Рудня Смаленскай вобласці (Расія), беларуская актрыса. Заслужаная артыстка Беларусі (1984). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1986).

Валянціна Цімафееўна – выпускніца студыі Беларускага тэатра імя Якуба Коласа (1956–1958). У 1958–2014 гадах – у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа.

Петрачкова В. Ц. – выканаўца драматычных, камедыйных, вострахарактарных роляў. За пяцьдзясят шэсць гадоў на сцэне яна сыграла іх больш за 200. Створаныя ёю вобразы адметныя яркім знешнім малюнкам, пластычнай выразнасцю і псіхалагічнай дакладнасцю характарыстык.

Асноўныя ролі ў тэатры: Еўга Бабук («Званы Віцебска» У. Караткевіча), Галчыха («Без віны вінаватыя» А. Астроўскага), Луіза

Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», «Ветэран працы», «За заслугі ў выяўленчым мастацтве Беларусі», ордэнам Францыска Скарыны і інш.

ЛІТАРАТУРА

1. **Васильева, Л.** Юбилей мастера / Л. Васильева // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2014. – 9 снеж. – С. 2

2. **Ковалев, А. А.** Опалённая войной земля : тема народной памяти в творчестве художника-монументалиста Юрия Зуева / Александр Анатольевич Ковалёв // Мастацкая і музычная адукацыя. – 2017. – № 4. – С. 39–41.

3. **Лукьянова, Н.** Человек на своем месте / Н. Лукьянова // Твой город (Витебск). – 2014. – 10 апр. – С. 4.

4. **Соловьёва, Т.** Юрий Зуев: «Творчество – это вся моя жизнь...» / Т. Соловьёва // Витебский проспект. – 2012. – 16 февр. – С. 22.

5. **Терещенко, В.** Нить судьбы / В. Терещенко // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2015. – 18 ліп. – С. 3.

6. **Цыбульский, М. Л.** Зуев Юрий Пантелеймонович / Цыбульский, М. Л. // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 459.

7. **Юрий** Зуев. Монументальное искусство. Живопись. Скульптура. Графика. Архитектура. Витебск = Yury Zuev. Monumental art. Painting. Sculpure. Graphics. Architectyre. Vitebsk : альбом / авт.-сост. Ю. П. Зуев; вступ. ст. Л. Е. Дягилева. – Могилев : Обл. укруп. тип. им. Спиридона Соболя, САМПО, 2004. – 160 с.

8. **Юрий** Зуев, Почетный член Российской академии художеств [Изоматериал] / отв. за вып. Ю. Зуев. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2011.

культуры «Віцебск»). У 2002 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) створана Вусцеўскае аматарскае аб'яднанне «Жаночыя сакрэты» пры сельскай бібліятэцы Аршанскага раёна. У 2003 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) заснавана свабодная эканамічная зона «Віцебск».

20 гадоў таму (1999) заснаваны ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Казьянскі» ў Полацкім і Шумілінскім раёнах на базе былога аднайменнага паляўнічага заказніка.

20 гадоў таму (1999) створана РУП «Віцебскі станкабудаўнічы завод імя С.М. Кірава «ВІСТАН» шляхам далучэння да станкабудаўнічага завода імя С.М. Кірава Віцебскага спецыяльнага канструктарскага бюро зубаапрацоўчых, шліфавальных і заточных станкоў. Зараз – Віцебскі станкабудаўнічы завод «Вістан».

20 гадоў таму (1999) у пасёлку Дачны Аршанскага раёна пры сельскай бібліятэцы створана народнае аматарскае аб’яднанне «Пралеска». У 2003 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) створана Расонская ўзорная фальклорная група «Нежачкі» пры Цэнтры пазашкольнай работы. У 2005 г. – прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1999) у Пастаўскім раёне пры сельскім Доме культуры створаны Курапольскі народны клуб нацыянальнай кухні, гульні і абраду «Традыцыя». У 2003 г. – прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2004) у Пастаўскім раёне быў адкрыты дзіцячы рэабілітацыйны аздараўленчы цэнтр «Ветразь».

15 гадоў таму (2004) была створана Віцебская народная мужчынская вакальная група пры прыватным УП «Элект» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. У 2007 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2004) у в. Бычкі Ушацкага раёна быў заснаваны Быкава Васіля сядзіба-музей – філіял Ушацкага музея народнай славы.

15 гадоў таму (2004) ў в. Акцябрская створаны Віцебскі раённы Цэнтр народных мастацкіх рамёстваў «Адраджэнне».

15 гадоў таму (2004) створаны Віцебскі ўзорны аркестр народных інструментаў «Спадчына» пры СШ № 25. У 2008 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2004) створана Аршанская студыя эстрадных спеваў «Дубль №» пры гарадскім Цэнтры культуры. У 2007 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2004) у Віцебску створаны тэатр «Адзіны варыянт» пры ВДУ імя П. М. Машэрава (з 2007 г. – пры Цэнтры культуры «Віцебск»). У 2008 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў» і сучасная назва. Зараз – Віцебскі народны маладзёжны тэатр «Кола».

15 гадоў таму (2004) у Віцебску заснавана сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства па вытворчасці алкагольных і безалкагольных напояў ААТ «Дзвінскі бровар».

15 гадоў таму (2004) у Полацку пачала выходзіць серыя выданняў «Спадчына Полацкай зямлі», мэтай якой з'яўляецца публікацыя і перадрукоўка гістарычных, археалагічных і крыніцазнаўчых твораў, прысвечаных мінуламу Полацка.

15 гадоў таму (2004) адкрыты Пакроўскі жаночы манастыр у захаваных будынках Талачынскага Пакроўскага манастыра базыльянаў – помніка архітэктуры віленскага барока.

аснову для мытні на Расійска-Фінскай мяжы і атрымаў высокую ацэнку за архітэктурна-планіровачнае рашэнне.

Зуеў Ю. П. – галоўны мастак г. Кіраў (Расія) (1968–1978), галоўны мастак г. Віцебска (1980–1986). Па яго праектах і пад яго кіраўніцтвам адбывалася афармленне гарадоў, шматлікіх святаў, выстаў. З 1980 года мастак жыве і працуе ў Віцебску.

Юрый Зуеў працуе ў галіне манументальнага і станкавага жывапісу, скульптуры, архітэктуры, графікі, дэкаратыўный пластыкі.

Жывапісныя і графічныя кампазіцыі: «Цішыня» (1998), «Кіжы» (1984), «Успаміны пра галандцаў» (1984), «Бэз» (1993), «Ноч поўні» (1994), «Аракул» (1997), «Сустрэча паэта з Віцебскам» (1998–1999), «Мой крыж» (1998), «Што такое праўда» (2001), «Музыканты» (1996), «Апакаліпсіс у XXI стагоддзі» (2003–2004), які прысвечаны «Дыялог. Рэха Чарнобыля» (1986), «Кветкі. Вясна» (2003), «Віцебск тысячагадовы» (2003), «Перамога» (2004), «Пегас» (2004), «Нацюрморт. Галінка яблыні» (2000), «Калясніца» (2001), «Віяланчэліст» (2001); серыі работ з афрыканскімі і індыйскімі маскамі (1992), «Знакі задыяку» (1995). Пластычныя кампазіцыі: «Георгій-Перамаганосец» (1998), «А. С. Пушкін» (1996), «А. Шнітке і яго Дзявятай сімфоніі прысвячаецца» (1995), «Княгіня Вольга – заснавальніца горада» (1998).

Зуеў Ю. П. – аўтар мазаічных кампазіцый і роспісу «Прырода і чалавек» для жылых дамоў у Віцебску (1983–1985), скульптурных рэльефаў, роспісу, вітражоў для дзіцячага сада ПА «Віцябчанка» (1992), памятнага знака «Выкладчыкам і студэнтам, якія загінулі за Радзіму ў 1941–1945 гг.», устаноўленага каля ВДУ імя П. М. Машэрава (2005) і інш.

Зараз Юрый Панцеляймонавіч актыўна працуе ў сваёй майстэрні па вуліцы Леніна ў г. Віцебску, дае майстар-класы для студэнтаў мастацкіх спецыяльнасцяў ВДТУ і ВДУ імя П. М. Машэрава.

За вялікі ўклад у развіццё Беларускага выяўленчага мастацтва ўзнагароджаны шматлікімі дыпломамі, ганаровымі граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а таксама медалямі «XXX гадоў перамогі ў



ЗУЕЎ
ЮРЫЙ ПАНЦЕЛЯЙМОНАВІЧ

85 год з дня нараджэння

(1934)

Зуеў Юрый Панцеляймонавіч нарадзіўся 2 красавіка 1934 года ў г. Бійску Алтайскага краю (Расія) Беларускі мастак. Жыве ў г. Віцебску. Член Саюза мастакоў СССР (1986), член Беларускага саюза мастакоў (1987), Ганаровы член Расійскай акадэміі мастацтваў, лаўрэат архітэктурнай прэміі РСФСР, лаўрэат міжнародных мастацкіх выстаў і конкурсаў.

Юрый Панцеляймонавіч перажыў жудасныя гады Вялікай Айчыннай вайны, блакаду ў г. Ленінградзе, страціўшы там нагу. У 9 гадоў сам зрабіў сабе драўляны пратэз пад калена. Вырас без бацькі. У эвакуацыі дапамагаў салдатам, якія вярталіся з фронту. У 14-гадовым узросце, застаўшыся з хворай маці і бабуляй, ён быў вымушаны дапамагаць сям'і. Працаваў вартаўніком, рэтушорам фатаграфій, машыністам кампрэсара, маляром, мастаком-афарміцелем.

У 1962 годзе Зуеў Ю. П. скончыў Іркуцкае мастацкае вучылішча. Працаваў рэстаўратарам у Іркуцкім мастацкім музеі і мясцовым аддзяленні мастацкага фонду. У 1963 годзе паступае ў Вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя В. І. Мухінай (зараз – Санкт-Пецярбургская мастацка-прамысловая акадэмія імя А. Шцігліца). Ужо на трэцім курсе, архітэктурны праект Зуева быў прызнаны лепшым на конкурсе, узяты за

15 гадоў таму (2004) у Наваполацку заснавана прадпрыемства «Любава–Інвест» як сумеснае беларуска–польскае ТАА, якое спецыялізуецца на выпуску верхніх і бялізнавых швейных трыкатажных вырабаў дзіцячага і дарослага асартыменту.

10 гадоў таму (2009) створаны Гарадоцкі літаратурны клуб «Городнянка» пры цэнтральнай раённай бібліятэцы.

100 гадоў таму (1919) адбыўся першы з'езд прафсаюзаў Віцебскай губерні.

45 гадоў таму (1974) пушчана першая чарга Аршанскага інструментальнага завода.

1 студзеня– 100 гадоў таму (1919) у Віцебску нацыяналізаваны ўсе кінатэатры.

1 студзеня – 90 гадоў таму (1929) заснавана Віцебскае аддзяленне Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі. З 1938 г. – Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна.

1 студзеня – 45 гадоў таму (1974) адкрыты Наваполацкі політэхнічны інстытут. З 1993 г. – Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.

2 студзеня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Кляцкоў Мікалай Васільевіч, педагог, краязнаўца, другі сакратар Дубровенскага райкама ЛКСМБ (1967–1971), старшыня Дубровенскага гарадскога Савета дэпутатаў (1971–1974), настаўнік геаграфіі СШ № 2 г. Дуброўна (1974–2000), ураджэнец в. Крапіўна Аршанскага раёна.

2 студзеня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Напрэенка Уладзімір Пятровіч, беларускі акварэліст, атрымаў адукацыю ў Віцебскім педагагічным інстытуце (1970). Ураджэнец в. Антонаўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

2 студзеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Андрэйчанка Уладзімір Паўлавіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, у 1994–2008 гадах – старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта. Узнагароджаны ордэнам Айчыны II і III ступеняў. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (2001). З 2008 г. – старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвертага, пятага, шостага скліканняў. Ураджэнец в. Мар'янава Лёзненскага раёна.

2 студзеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Яленскі Мікалай Георгіевіч, беларускі вучоны ў галіне педагогікі і філалогіі, доктар педагагічных навук, прафесар, ураджэнец в. Акунёва Мёрскага раёна.

4 студзеня – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Пугачэўскі Палікарп Восіпавіч (1894–1939), военачальнік, камбрыг, ураджэнец Глыбоцкага раёна.

4 студзеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Ільніцкі Мікалай Мікалаевіч (1949–2006), музейны работнік, краязнаўца, дырэктар Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка (1994–2006), ураджэнец в. Баранава Полацкага раёна.

5 студзеня – 250 гадоў таму (1769) нарадзіўся Вітгенштэйн Пётр Хрысціянавіч (1769–1843), расійскі ваенны дзеяч, удзельнік вырашальных баёў у Айчынную вайну

прафесарам (1868).

Фармакалогія ў той час спалучалася з іншымі спецыяльнасцямі, чыталася на на лацінскай мове і уяўляла сабой нешта накшталт фармакапеі з тэарэтычнымі паказаннямі на выкарыстанне лякарстваў. З прыходам у акадэмію Іосіфа Вікенцьевіча пачаўся новы падыход да фармакалогіі. Гэты курс ён зрабіў самастойным, стварыў добрую лабараторыю, увёў лабараторны эксперыментальны метад фармакалагічных даследаванняў. Лекцыі ўпершыню чыталіся на ўзроўні тагачасных еўрапейскіх поглядаў.

У 1870 годзе Забелін І. В. разам з прафесарамі Багданоўскім Я. І., Заварыкіным Ф. М., Рудневым М. М. выдаваў «Журнал для нормальной и патологической гистологии, фармакологии и клинической медицины». З 1874 года вучоны-медык рэдагаваў свой часопіс «Современный лечебник», у якім змяшчаў працы, падрыхтаваныя ў фармакалагічнай лабараторыі.

Забелін І. В. – аўтар шматлікіх прац па фармакалогіі: «Аб уплыве кухоннай солі на засваенне арганізмам вапны, аднаўленне касцявой тканкі і засваенне жалеза», «Аб умовах выдзялення аміяку з лёгкіх» і інш.

Іосіф Забелін раптоўна памёр 7 снежня 1875 года. Пахаваны на Валкаўскіх могілках у Санкт-Пецярбургу.

ЛІТАРАТУРА

1. **Афанасьеў, В**. Адзін з першых фармаколагаў / В. Афанасьеў // Краязнаўчая газета. – 2014. –№ 18 (май). – С. 7.

2. **Забелін** Іосіф Вікенцьевіч // Асветнікі зямлі Беларускай : Х – пачатак ХХ ст.: энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; мастак У. М. Жук. – Мінск : БелЭн імя Петруся Броўкі, 2006. – С. 171–172.

3. **Степаненко, Н.** Начало экспериментальной фармакологии / Н. Степаненко // Медицинский вестник [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.medvestnik.by/ru/society/view/nachalo-eksperimentalnoj-farmakologii-18080-2018/. – Дата доступа: 28.11.2018.

Красавік

ЗАБЕЛІН

ІОСІФ ВІКЕНЦЬЕВІЧ

Да 185-годдзя з дня нараджэння

(1834)

Забелін Іосіф Вікенцьевіч (1834–1965) – вучоны-медык. Нарадзіўся 1 красавіка 1834 года ў Віцебскай губерні ў сям'і святара.

Першапачатковую адукацыю атрымаў у Полацкай семінарыі (1854). Па заканчэнні з залатым медалём Санкт-Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі (1858) атрымаў званне лекара. У ліку 10 лепшых выхаванцаў Забелін І. В. быў пакінуты на 3 гады пры акадэміі на спецыяльных курсах для навуковых даследаванняў. Адначасова займаўся ўрачэбнай дзейнасцю ў 2-ім ваенна-сухапутным шпіталі.

Першае яго навуковае даследаванне па фармакалогіі «Аб уплыве мыш'яковых соляў на метамарфоз рэчываў у арганізме». За наступную працу «Аб фізіялагічным уздзеянні лімонна-кіслага кафеіну» атрымаў ступень доктара медыцыны (1861) і званне дацэнта фармакалогіі. У 1862 годзе для спецыялізацыі ў галіне фармакалогіі Забелін І. В. быў накіраваны за мяжу, дзе наведаў лепшыя біёлагахімічныя лабараторыі.

Пасля вяртання працаваў у Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі прыват-дацэнтам (1864), ад'юнкт-прафесарам (1866), ардынарным

1812 на тэрыторыі Беларусі (Полацкай бітвы і інш.), генерал-фельдмаршал. Ураджэнец г. Нежын, паводле іншых звестак г. Пераяслаў-Хмяльніцкі (Украіна).

5 студзеня – 220 гадоў таму (1799) нарадзіўся Сямашка Іосіф (1799–1868), уніяцкі і праваслаўны дзеяч Расійскай імперыі, ініцыятар і актыўны ўдзельнік Полацкага царкоўнага сабора (1839), які прыняў рашэнне аб далучэнні уніяцкай царквы да праваслаўнай. З 1829 г. – вікарны епіскап мсціслаўскі Полацкай уніяцкай архіепархіі. Ураджэнец с. Паўлаўка Вінніцкай вобласці (Украіна).

5 студзеня – 55 гадоў таму (1964) нарадзіўся Канстанцінаў Валерый Міхайлавіч, беларускі вучоны ў галіне матэрыялазнаўства сплаваў для ахоўных пакрыццяў, тэрмічнай і хіміка-тэрмічнай апрацоўкі металаў і сплаваў, доктар тэхнічных навук, ураджэнец г. Полацка.

6 студзеня – 170 гадоў таму (1849) нарадзіўся Сямеўскі Васіль Іванавіч (1849–1916), гісторык, эканаміст, грамадскі дзеяч, ураджэнец г. Полацка.

6 студзеня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Лебяда Тодар (сапр. Шыракоў Пётр Фёдаравіч; 1914–1970), драматург, паэт, празаік, публіцыст, ураджэнец г. Віцебска.

7 студзеня – 130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Данілаў Сцяпан Мікалаевіч (1889–1978), вучоны ў галіне арганічнай хіміі, член-карэспандэнт АН СССР, кавалер двух ордэнаў Леніна, ордэна «Знак Пашаны», ураджэнец г. Віцебска.

7 студзеня – 55 гадоў таму (1964) нарадзіўся Бышнёў Ігар Іванавіч, беларускі вучоны-арнітолаг, эколаг, кандыдат біялагічных навук, рэжысёр, сцэнарыст, аператар дакументальнага кіно, ураджэнец в. Халамер'е Гарадоцкага раёна. У 1985–1999 гг. працаваў у Бярэзінскім біясферным запаведніку. Аўтар тэлеперадачы «Мільён пытанняў пра прыроду» на тэлеканале «Мір». Лаўрэат Спецыяльнай Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне кіно і тэлебачання (2003, 2006).

8 студзеня – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Башко Іосіф Станіслававіч (1889–1946), ваенны лётчык, Георгіеўскі кавалер, ураджэнец Віцебскай вобласці.

8 студзеня – 100 гадоў таму (1919) выйшаў у свет артыкул «Художественные заметки» Марка Шагала.

8 студзеня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Савіцкі Алесь (сапр. Аляксандр Ануфрыевіч; 1924–1915), беларускі пісьменнік, дзяржаўны дзеяч. Ганаровы грамадзянін г. Полацка, ураджэнец г. Полацка.

8 студзеня – 65 гадоў таму (1954) скасавана Полацкая вобласць – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР.

9 студзеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзілася Осіпава Марыя Барысаўна (1909–1999), удзельніца Мінскага камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1943), ураджэнка в. Серкавіцы Талачынскага раёна.

10 студзеня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Гейнэ Аркадзь Андрэевіч (1919–1942), паэт, ураджэнец г. п. Бешанковічы.

Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. У 1999 годзе атрымала ганаровае званне «Жанчына года Полацка», у 2003 годзе – «Жанчына года Віцебшчыны». У 2007 годзе ёй была прысуджана прэмія З. Тусналобавай-Марчанкі, у 2009 годзе атрымала званне «Ганаровы грамадзянін горада Полацка». У 2012 годзе за выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны асабісты ўклад у развіццё і множанне духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, культурнай спадчыны беларускага народа К. М. Пагарэлая ўдастоена дзяржаўнай узнагароды – медаля Францыска Скарыны.

ЛІТАРАТУРА

1. **Каленік, А**. Восень. Гучыць арган / А. Каленік // Полацкі веснік. – 2018. – 30 кастр. – С. 1.
2. **Кароткіна, Г**. Скарына зноў у Празе / Г. Кароткіна ; гутарыла А. Арыцкая // Літаратура і мастацтва. – 2013. – 1 сак. – С. 16.
3. **Малашеня, Л.** Особая награда / Л. Малашеня // Народнае слова. – 2012. – 29 лістап. – С. 10.
4. **Малашеня, Л**. Увидеть Париж и... сыграть в Нотр-Даме / Л. Малашеня // Витебские вести. – 2015. – 31 окт. – С. 13.
5. **Пагарэлая, К**. М. Арган лечыць не толькі душу / К. М. Пагарэлая ; гутарыў А. Пукшанскі // Звязда. – 2013. – 11 снеж. – С. 6.
6. **Пагарэлая, К**. М. Мару, каб у Беларусі з'явіўся конкурс арганістаў / К. М. Пагарэлая ; гутарыла Т. Салаўёва // Народная газета. – 2013. – 10 снеж. – С. 11.
7. **Погорелая, К.** М. София. Орган. Ксения / К. М. Погорелая ; беседовала Т. Соловьева // Віцьбічы = Витьбичи. – 2018. – 12 апр. – С. IV–V.
8. **Погорелая, К.** Орган на все времена / К. Погорелая ; беседовала И. Овсепьян // Советская Белоруссия. – 2015. – 19 нояб. – С. 10.
9. **Погорелая** Ксения Максимовна // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 304.

З 1988 года – тытулярны арганіст канцэртнага зала Сафійскага сабора Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Ксенія Пагарэлая – арганізатар і ўдзельнік адзінага ў Беларусі міжнароднага фестывалю арганнай музыкі «Званы Сафіі» ў г. Полацку, які праводзіцца з 1996 года, адзін з арганізатараў і член журы міжнароднага юнацкага арганнага конкурсу «Гатчына–Полацк», лаўрэат міжнароднага фестывалю-конкурсу духоўнай музыкі «Магутны Божа» (г. Магілёў), удзельнік праекта «Шэдэўры сусветнага арганнага мастацтва». У 2008 годзе пры яе ўдзеле арганізаваны камерны аркестр пад кіраўніцтвам Раіля Садыкава.

У рэпертуары К. Пагарэлавай творы розных эпох, стыляў, кампазітараў. Значнае месца адведзена творчасці сучасных беларускіх кампазітараў. У яе выкананні ўпершыню прагучалі арганныя сачыненні А. Кароткінай, Н. Давідоўскай, А. Літвіноўскага, Д. Лыбіна.

Артыстка мае фондавыя запісы на Беларускім радыё і тэлебачанні, Віцебскім абласным радыё. Музыкантка запісала тры кампакт-дыскі, у якіх прадстаўлена рэтраспектыва арганнай музыкі XVI стагоддзя.

У канцэртнай зале Сафійскага сабора адбываецца больш за 300 канцэртаў з яе ўдзелам. К. Пагарэлая неаднаразова ўдзельнічала ў міжнародных фестывалях у Германіі, Аўстрыі, Расіі, Польшчы, Украіне, Швейцарыі і інш. У праграмы канцэртных выступленняў за мяжой заўсёды ўключае музыку беларускіх кампазітараў. У 2015 годзе прадстаўляла Беларусь у парыжскім саборы Нотр-Дам.

З 1991 года К. Пагарэлая працуе ў Полацкай дзіцячай школе мастацтваў. У 2004–2011 гг. – выкладчык фартэпіяна і аргана ў Віцебскім філіяле Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Яе вучні – лаўрэаты абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

За поспехі ў канцэртнай і педагагічнай дзейнасці Ксенія Пагарэлая была ўзнагароджана граматамі Полацкага гарадскога, Віцебскага абласнога ўпраўлення культуры, Полацкага гарадскога Савета Дэпутатаў і граматай

10 студзеня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Сачак Міхаіл Рыгоравіч, беларускі вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Ганаровы акадэмік беларускай медыцынскай акадэміі. З 1966 г. працуе ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. У 1979–1996 гг. – рэктар Віцебскага медыцынскага інстытута. Узнагароджаны знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь». Ганаровы грамадзянін горада Віцебска. Лаўрэат ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2013».

11 студзеня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Зюлькоў Пётр Маркавіч (1924–1944), Герой Савецкага Саюза (1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Камандзір узвода кіравання батарэі мінамётнага палка ў баі за в. Трылесіна Шумілінскага раёна карэкціраваў агонь батарэі (1944), ураджэнец в. Конаўка Калужскай вобласці (Расія).

11 студзеня – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Паўлава Ала Іванаўна, педагог, краязнаўца, настаўнік гісторыі Ноўкінскай СШ Віцебскага раёна (1984–2010).

13 студзеня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Завадскі Уладзімір Георгіевіч (1919–1992), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец г. Оршы.

14 студзеня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Барздыка Міхаіл Фёдаравіч, беларускі мастак, графік, ураджэнец в. Шклянцы Докшыцкага раёна.

15 студзеня – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Скальскі Сцяпан Уладзіміравіч (1899–1972), беларускі акцёр. Працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа (1926–1965).

15 студзеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Фамін Яўхім Майсеевіч (1909–1941), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адзін з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці (1941), ураджэнец в. Калышкі Лёзненскага раёна.

15 студзеня – 90 гадоў таму (1929) нарадзілася Ліліна Злата Юнаўна (1882–1929), прафесар, рэвалюцыянерка, дзеяч міжнароднага жаночага руху, ураджэнка г. п. Друя.

15 студзеня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Башлакоў Юрый Андрэевіч, беларускі вучоны-гісторык, ураджэнец г. Оршы.

16 студзеня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Кірычук Васілій Паўлавіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Славацічы Валынскай вобл. (Украіна).

16 студзеня – 65 гадоў таму (1954) нарадзілася Кухарэнка Ніна Уладзіміраўна, беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ураджэнка г. Паставы.

18 студзеня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Смірноў Уладзімір Яфімавіч (1924–1943), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944). Камандзір аддзялення старшы сяржант

3. **Марціновіч, Д**. Сцэнаграфія. Віцебск / Д. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 24 лют. – С. 13.

4. **Цыбульский, М. Л.** Котович Татьяна Викторовна / М. Л. Цыбульский // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область. Кн. 1. – С. 524.

ПАГАРЭЛАЯ КСЕНІЯ МАКСІМАЎНА

60 год з дня нараджэння

Пагарэлая Ксенія Максімаўна нарадзілася 27 сакавіка 1959 года ў горадзе Краснадар (Расія). Беларуская арганістка.

Выпускніца Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага па класам фартэпіяна (прафесар М. А. Фёдарава) і аргана (прафесар Л. І. Ройзман). У 1983–1987 гг. – выкладчык фартэпіяна ў Далёкаўсходнім педагагічным інстытуце мастацтваў у г. Владзівасток (Расія).

матэрыялаў «Малевич. Классический авангард. Витебск» (11 выпускаў), «Духовная энергия театра» (1995).

Катовіч Т. В. – арганізатар рэспубліканскай канферэнцыі «Трансформация театра» ў г. Віцебску (1995), аўтар праекта даследчай лабараторыі міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі (1993), заснавальнік рэспубліканскай даследчай лабараторыі сцэнічных мастацтваў (1995).

Удзельнік і арганізатар міжнародных кангрэсаў, канферэнцый, фестываляў, выставачных праектаў у Расіі, Украіне Беларусі. Аўтар больш за 500 навуковых і творчых публікацый, манаграфій: «Игра с координатами смыслов: пространственно-временной континуум театра» (1999), «Энциклопедия русского авангарда» (2003), «Пространственно-временной континуум театра» (2005), «Режиссура ритуала» (2009), «Театральная культура Витебщины XX века» (2009), «Структура спектакля: Воля к постмодернизму» (2010), «Цвет – Театр – Хронотоп» (2010), «Сценография. Витебск» (2011), «Белорусский театр «Лялька»« (2012), «Скульптура. Объекты. Витебск» (2013), «Государственный молодежный театр «С улицы Роз»« (2014), «Новый Художественный театр» (2014), «Воскресенская церковь. Воскресенская улица» (2017), «Малевич _ УНОВИС: между/над опытом и рацио» (2017), «Мембраны: петли времени» (2017), «Особняк Вишняка = Школа Шагала» (2017), «Витебский набат. 1623» (2018), «Витебский УНОВИС» (2018), «Политические мистерии: октябрь 1918 – декабрь 1919» (2018), «Сакральный центр Витебска: эскизы» (2018), Супрематический канон» (2018).

ЛІТАРАТУРА

1. **Катовіч** Таццяна Віктараўна // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2012. – Т. 3 : Г–З. – С. 423

2. **Котович, Т. В**. Первый юбилей / Т. В. Котович ; беседовал А. Матеюн // Витебские вести. – 2016. – 30 июня. – С. 6.

Смірноў загінуў у баі за в. Шумшына Лёзненскага раёна. Ураджэнец г. Барнаула.

18 студзеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзілася Круцько Эльвіра Ціханаўна, беларускі вучоны ў галіне хіміі і тэхналогіі палімерных матэрыялаў, ураджэнка г. п. Бешанковічы.

19 студзеня – 80 гадоў таму (1939) нарадзілася Мархель Таццяна Рыгораўна, актрыса, заслужаная артыстка Беларусі. У 1970–1986 гг. працавала ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

20 студзеня – 100 гадоў таму (1919) пачаліся заняткі ў майстэрні М. Шагала ў Народным вучылішчы Віцебска.

22 студзеня – 50 гадоў таму (1969) нарадзілася Целяпушкіна Алена Іванаўна, беларуская спартсменка (конны спорт, трохбор'е), майстар спорту Беларусі, сярэбраны прызёр міжнародных спаборніцтваў па трохбор'і, ураджэнка в. Карчэўшчына Сенненскага раёна.

23 студзеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Ідаль Эдуард Антонавіч (парт. псеўданім Андрэй; 1909–1938), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

23 студзеня – 100 гадоў таму (1919) у Браславе адбылася першая канферэнцыя сялянскіх, рабочых і батрацкіх дэпутатаў.

23 студзеня – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Каплякоў Сяргей Віктаравіч, беларускі спартсмен (плаванне вольным стылем), майстар спорту СССР міжнароднага класа (1976), заслужаны майстар спорту СССР (1979), чэмпіён XXII Алімпійскіх

гульняў (1980), сярэбраны прызёр XXI Алімпійскіх гульняў (1976), прызёр чэмпіянатаў свету, чэмпіён Еўропы, трэнер, ураджэнец г. Оршы.

23 студзеня – 50 гадоў таму (1969) на I Віцебскай абласной канферэнцыі прафсаюза рабочых нафтавай і хімічнай прамысловасці была створана Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў хімічнай, горнай і нафтавай галін прамысловасці.

24 студзеня – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Кротава Наталля Уладзіміраўна, прафсаюзны работнік. З 1985 г. – дырэктар універмага Сенненскага райспажыўсаюза, таваразнаўца, эканаміст, намеснік дырэктара Віцебскай універсальнай базы аблспажыўсаюза (1988–1994), з 1994 г. – спецыяліст, вядучы, галоўны спецыяліст Віцебскага абласнога камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў спажыўкааперацыі, з 2002 г.– намеснік дырэктара. З верасня 2007 г. – старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў спажывецкай кааперацыі. Ураджэнка в. Прудзіны Крупскага раёна Мінскай вобласці.

25 студзеня – 95 гадоў таму (1924) у Віцебску быў адкрыты Прамысловы банк.

25 студзеня – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Вінніца Генадзь Рувімавіч, краязнавец, першы гісторык аршанскага яўрэйскага таварыства, ураджэнец г. Оршы.

драматычнага тэатра імя Я. Коласа. Пры яе ўдзеле створана выставачная зала. У мясцовым друку апублікаваны цыкл артыкулаў Катовіч Т. В., якія прысвечаны творчым партрэтам артыстаў-коласаўцаў. У гэты перыяд Таццяна Віктараўна актыўна праводзіць даследаванні тэатральнага метаду, прымае ўдзел у навуковых канферэнцыях у Беларусі і за яе межамі.

У 1999 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «Барокко как универсальный стиль художественной культуры Беларуси XVI–XVIII веков» і атрымала ступень кандыдата мастацтвазнаўства. У 2001–2007 гг. – дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. У верасні 2007 года Катовіч Т. В. абараніла доктарскую дысертацыю. З 2008 г. – прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры ВДУ імя П. М. Машэрава. Да 2009 года Катовіч Т. В. сумяшчае выкладанне з працай у тэатры. У 2010 годзе – прысвоена вучонае званне прафесара.

У цяперашні час Катовіч Т. В. – выкладчык дысцыпліны культуралагічнага і мастацтвазнаўчага напрамкаў («Тэорыя і гісторыя культуры», «Усеагульная гісторыя мастацтваў»), кіраўнік даследчай практыкі студэнтаў, навуковы кіраўнік дыпломных работ і магістарскіх дысертацый, кіраўнік студэнцкага клуба «Наследие».

У 2004 годзе Катовіч Т. В. узнагароджана Ганаровай граматай Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, у 2009 г. – Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, у 2010 г. – Ганаровай граматай аддзела культуры Віцебскага аблвыканкама, у 2012 г. – Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Навуковыя інтарэсы Катовіч Т. В. – тэатральнае мастацтва Беларусі, гісторыя тэатра, гісторыя выяўленчага мастацтва, Віцебская мастацкая школа, творчасць К. С. Малевіча, рускі авангард.

З 1973 года займаецца тэатральнай крытыкай, з 1994 года – праектамі, якія звязаны з авангардам. Таццяна Віктараўна – аўтар праекта міжнароднай канферэнцыі «Малевич. Классический авангард. Витебск», якая тройчы адбылася ў г. Віцебску (1994, 1996, 1998), зборнікаў

Сакавік

КАТОВІЧ

ТАЦЦЯНА ВІКТАРАЎНА

65 год з дня нараджэння

Катовіч Таццяна Віктараўна нарадзілася 26 сакавіка 1954 года ў г. Віцебску. Беларускі тэатразнаўца, педагог, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, выкладчык Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

У 1971 годзе скончыла сярэднюю школу № 3 г. Віцебска. У 1976 г. – факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна ў г. Мінску. З сакавіка 1977 года Катовіч Т. – карэспандэнт-арганізатар Віцебскага раённага радыё. З 1982 года – рэдактар Віцебскага абласнога радыё, з 1988 года – рэдактар Віцебскага абласнога тэлебачання.

У 1993 годзе паступіла ў аспірантуру Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры па спецыяльнасці «Тэорыя мастацтва».

З верасня 1997 года – памочнік галоўнага рэжысёра, кіраўнік інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Нацыянальнага акадэмічнага

26 студзеня – 455 гадоў таму (1564) на рацэ Ула каля г. Чашнікі адбылася Ульская бітва 1564, Чашніцкая бітва, бітва паміж войскамі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы ў часы Інфлянцкай вайны 1558–1582.

27 студзеня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Асмалоўскі Міхаіл Сцяпанавіч (1914–1977), беларускі архітэктар. У 1950 г. займаўся планіроўкай вёскі Лукомль Чашніцкага раёна.

27 студзеня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Альшэўскі Мікалай Міхайлавіч (1919–1944), Герой Савецкага Саюза (1945). Камандзір танка малодшы лейтэнант вызначыўся ў баі за раз’езд Пагост Аршанскага раёна, ураджэнец п. Сквіра Кіеўскай вобласці (Украіна).

28 студзеня – 100 гадоў таму (1919) была адкрыта Народная мастацкая школа. З 1920 г. – Дзяржаўныя майстэрні, з 1921 г. – мастацка-практычны інстытут, з 1923 г. – Віцебскі мастацкі тэхнікум, у 1939–1941 гг. – Віцебскае мастацкае вучылішча.

28 студзеня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Вінаградаў Міхаіл Кліменцьевіч, беларускі архітэктар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2004, 2008), ураджэнец в. Навасады Чашніцкага раёна.

29 студзеня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Баханькоў Арцём Яфімавіч (1924–2001), беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук, прафесар, ураджэнец в. Саламір'е Полацкага раёна.

29 студзеня – 80 гадоў таму (1939) нарадзілася Шабунёва Ларыса Яўгенаўна, педагог, краязнаўца, калекцыянер,

гісторык, дырэктар Слабадскай СШ Лепельскага раёна, ураджэнка м. Лёзна Віцебскай акругі.

30 студзеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Генкін Абрам Львовіч (1909–2001), кандыдат тэхнічных навук (1941), інжынер-віцэ-адмірал (1962), уладальнік Дзяржаўнай прэміі СССР (1962), ураджэнец г. Оршы.

30 студзеня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Клімаў Міхаіл Трафімавіч, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны настаўнік рабочай моладзі Беларусі. Працаваў на Аршанскім ільнокамбінаце (1960–1989).

100 гадоў таму (1919) сфарміравана віцебская камісія па справах мастацтва і мастацкай прамысловасці.

95 гадоў таму (1924) у Віцебску адкрылася калонія для непаўналетніх.

25 гадоў таму (1994) у Оршы адкрыты помнік памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія загінулі ў Афганістане.

2 лютага – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Гоманаў Уладзімір Кірылавіч (1929–1998), беларускі жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1990), ураджэнец г. Сянно.

2 лютага – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Морхат Віктар Іосіфавіч (1959–2013), беларускі вучоны ў галіне афтальмалогіі, доктар медыцынскіх навук (1998), прафесар, вынаходнік СССР (1988). З 1983 г. працаваў у Віцебскім медыцынскім

Н. Б. Лысова // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2014. – № 10. – С. 46–50.

5. **Чэмер, М**. Кніжныя навінкі для дзяцей і юнакоў ад Выдавецкага дома «Звязда» : Пятро Васючэнка. Дванаццаць подзвігаў Геракла. Раман-бурлеск / М. Чэмер // Настаўніцкая газета. – 2013. – 22 жн. – С. 16.

6. **Ярмалінская, В. М**. Тэатр Пятра Васючэнкі / Вераніка Ярмалінская // Роднае слова. – 2016. –№ 9. – С. 85–87.

«Сучасная беларуская драматургія» (2000), «Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм» (2004), зборнік літаратурна-крытычных прац «Адлюстраванні першатвора» (2004), «Ад тэксту да хранатопа» (2009).

Аўтар зборнікаў прозы «Белы мурашнік» (1993), «Прыгоды аднаго губашлёпа» (1999), кніг казак «Прыгоды паноў Кубліцкага і Заблоцкага» (1997), «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» (2003), «Каляровая затока» (2008), зборніка п'ес «Маленькі збраяносец» (1999), «Піраміда Ліннея: вершы» (2009), «Дванаццаць подзвігаў Геракла: раман-бурлеск» (2013), «Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага» (2018). Для прозы і драматургіі Васючэнкі П. В. характэрны гумар, іронія, гратэск, парадаксальнасць мыслення, падтэкст, развагі над культурнымі архетыпамі. У творах сінтэзуюцца сюжэты берарускага і сусветнага фальклору. Ён аўтар больш за 180 навукова-папулярных артыкулаў, кніг прозы, драматургіі, рэцэнзій, эсэ і казак. Спектаклі паводле яго п'ес ідуць на сцэнах многіх беларускіх тэатраў.

У 2004 годзе П. Васючэнка стаў лаўрэатам літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес». Творы П. Васючэнкі перакладаліся на англійскую, балгарскую, нямецкую, польскую, рускую, славацкую і чэшскую мовы.

ЛІТАРАТУРА

1. **Аляшкевіч, М. В**. Dungeons and Dragons: Лабірынты і цмокі Пятра Васючэнкі / Маргарыта Аляшкевіч // Дзікі голуб : зборнік сучаснай беларускай прозы і крытыкі / [уклад. Мікола Мінзер]. – С. 146–152.

2. **Васюченко** Пётр Васильевич // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 121.

3. **Іўчанка, В. М.** Васючэнка Пётр Васілевіч / В. М. Іўчанка // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Б–Г. – С. 226.

4. **Лысова, Н. Б**. Пераасэнсаванне антычнага міфа ў сучаснай беларускай прозе, або Новыя рысы вобраза «нацыянальнай катастрофы» /

інстытуце (з 1997 г. – загадчык кафедры). Ураджэнец г. Віцебск.

5 лютага– 130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Хозераў Іван Макаравіч (1889–1947), расійскі і беларускі мастацтвазнавец, гісторык архітэктуры. У 1926 г. разам з М. Шчакаціхіным даследаваў Полацкі Сафійскі сабор XI ст. Абследаваў верхнія часткі Полацкай Спаскай царквы XII ст. У 1928 г. правёў раскопкі Барысаглебскай и Пятніцкай цэркваў XII ст. Ураджэнец г. Смаленска (Расія)

6 лютага – 55 гадоў таму (1964) нарадзілася Беразоўская Таццяна Дзмітрыеўна, беларуская мастачка, настаўніца, ураджэнка г. Віцебска.

7 лютага – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Паўлаў Савелій Яфімавіч, пісьменнік, публіцыст, дзяржаўны дзеяч Беларусі, кандыдат гістарычных навук (1971), прафесар (1990) Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва. Ураджэнец в. Самуйлы Браслаўскага раёна.

8 лютага– 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Лапо Аркадзь Іванавіч (1904–1983), беларускі вучоны ў галіне селекцыі і раслінаводства. Акадэмік НАН Беларусі (1950, член-карэспандэнт 1940), Акадэміі аграрных навук Беларусі (1957), ураджэнец в. Жданаўка Шумілінскага раёна.

9 лютага– 225 гадоў таму (1794) у Віцебску адкрыта першая бібліятэка (пры Народным вучылішчы).

9 лютага– 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Сцепін Віктар Аляксандравіч (1919–2007), ваенны дзеяч,

удзельнік вызвалення Шумілінскага і Бешанковіцкага раёнаў у Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

10 лютага – 95 гадоў таму (1924) у сувязі з першым узбуйненнем БССР была ліквідавана Віцебская губерня, частка якой была перададзена Пскоўскай губерні РСФСР.

10 лютага – 55 гадоў таму (1964) адкрыты Віцебскі радыётэхнічны тэхнікум, з 1965 – Віцебскі політэхнічны тэхнікум, з 2001 – Віцебскі дзяржаўны політэхнічны тэхнікум, з 2009 – Віцебскі дзяржаўны політэхнічны каледж. З 2016 года – як падраздзяленне Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.

11 лютага – 100 гадоў таму (1919) у Віцебску арганізаваны сімфанічны аркестр.

12 лютага – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Іафінаў Самуіл Абрамавіч (1909–2002), вучоны ў галіне эксплуатацыі машынна–трактарнага парку, стваральнік навуковай школы, ураджэнец г. Віцебска.

12 лютага – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Гіргель Сяргей Сяргеевіч, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, ураджэнец в. Цімошкава Мёрскага раёна.

14 лютага – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Нікалаевіч Аляксей Мікалаевіч (1904–1975), военачальнік, генерал-лейтэнант (1958), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Астроўна Бешанковіцкага раёна.

ВАСЮЧЭНКА
ПЁТР ВАСІЛЕВІЧ

60 год з дня нараджэння

(1959)

Васючэнка Пётр Васілевіч нарадзіўся 15 лютага 1959 года ў г. Полацку. Беларускі празаік, крытык, драматург, літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук (1985). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі.

У 1981 г. скончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта , у 1983 г. – аспірантуру пры інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі . У 1984–1997 гг. – навуковы супрацоўнік інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, з 1997 года – загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

Пятро Васючэнка даследуе класічную і сучасную беларускую літаратуру: манаграфіі «Драматургія і час» (1991), «Драматургічная спадчынаЯнкі Купалы» (1994), «Пошукі страчанага дзяцінства» (1995),

ЛІТАРАТУРА

1. **Багушэўская** зямля натхніла на творчасць / падрыхт. В. Бандарэвіч // Голас Сенненшчыны. – 2018. – 4 верас. – С. 4.

2. **Бышнев, И. И**. «Берите бинокль, записную книжку, сапоги и – вперед. За окном много открытий» / И. И. Бышнев ; беседовала В. Гнилозуб // Белорусская нива. – 2013. – 19 дек. – С. 6.

3. **Бышнев, И. И**. Назад к природе с миллионом вопросов / И. И. Бышнев ; беседовала В. Попова // Советская Белоруссия. – 2014. – 4 янв. – С. 1–2. – (Прил.: ТВ твоего дома).

4. **Бышнёв** Игорь Иванович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 116.

5. Бышнёв Игорь Иванович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2006. – Т. 2 : А–Герань. – С. 576–577.

6. **«Кавалеры** рек, болот и лесов» / подгот. Е. Петрова // Віцебскі рабочы. – 2012. – 19 чэрв. – С. 5.

7. **Шчыпанава, М**. Спатканне з лесам / М. Шчыпанава, А. Лапіцкая // Літаратура і мастацтва. – 2018. – 25 мая. – С. 10.

14 лютага – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Яроменка Мікалай Мікалаевіч (1949–2001), акцёр тэатра і кіно, кінарэжысёр, народны артыст Расіі, лаўрэат прэміі УЛКСМ (1980), ураджэнец г. Віцебска.

15 лютага – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Васючэнка Пётр Васілевіч, беларускі празаік, крытык, драматург, ураджэнец г. Полацка.

16 лютага – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Заспіцкі Андрэй Міхайлавіч, беларускі скульптар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1977). Дзяржаўная прэмія Беларусі (1974, 1977). Аўтар помнікаў Ф. Скарыну ў Полацку (1973), «У гонар вызвалення Віцебска» ў Віцебску (1989, з М. Рыжанковым). Ураджэнец г. Мазавец (Польшча).

16 лютага – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Клокаў Сцяпан Антонавіч (1909–1992), краязнаўца, ваяваў у партызанскім атрадзе імя Сталіна ў Вялікую Айчынную вайну, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Расонскага (1944–1949) і Ветрынскага (1949–1952) райкамаў КП(б)Б, дырэктар СШ № 3, СШ № 8 г. Полацка (1952–1969), заслужаны настаўнік БССР (1967). Жыў у Полацку, ураджэнец в. Янкавічы Полацкага павета (зараз Расонскі раён).

17 лютага – 100 гадоў таму (1919) нарадзілася Кулакоўская Тамара Нікандраўна (1919–1986), беларускі вучоны ў галіне аграхіміі і глебазнаўства, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1969), прафесар (1974), акадэмік УАСГНІЛ (1975), заслужаны

дзеяч навукі Беларусі (1974), Герой Сацыялістычнай Працы (1979), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнка г. Полацка.

17 лютага – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Сяржантаў Іван Якаўлевіч (1919–1943), Герой Савецкага Саюза (1943). У гады Вялікай Айчыннай вайны – лётчык-знішчальнік на Паўднёвым фронце, ураджэнец в. Якаўлевічы Аршанскага раёна.

17 лютага – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Янчанка Сцяпан Яфімавіч (1924–1999), беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук (1975), прафесар (1976), заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі (1984), ураджэнец в. Анціпенкі Дубровенскага раёна.

17 лютага – 85 гадоў таму (1934) заснаваны вучгас «Падбярэззе» Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

17 лютага – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Шарай Рыгор Сцяпанавіч, краязнаўца, заснавальнік і кіраўнік маладзёжна-пошукавага клуба ЮНЕСКА «Русічы» на базе Аршанскага дзяржаўнага політэхнічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа, ураджэнец г. Оршы.

18 лютага – 140 гадоў таму (1879) у в. Завярэжжа Віцебскай губерні нарадзіўся Каржанеўскі Мікалай Леапольдавіч (1879–1958), географ, гляцыёлаг. Доктар геаграфічных навук. Аўтар Карты Паміра і Каталога ледавікоў Цэнтральнай Азіі.

22 лютага – 315 гадоў таму (1704) нарадзіўся Вяжбіцкі (Вяржбіцкі) Казімір Юзаф (1704–1755), каталіцкі рэлігійны

2000 годзе быў прызначаны намеснікам дырэктара Рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны».

У 2000 годзе Бышнёў І. І. стварыў прыватную фільм-студыю «Авес». Кінастудыя здымае фільмы пра прыроду, дзікіх жывёл і этнакультуру. Створана больш за 70 фільмаў і 30 сацыяльных ролікаў, у тым ліку для вядучых тэлекампаній Еўропы. Асноўная тэма – дзікая прырода Еўропы, Каўказа, Каспійскага рэгіёну і прыродныя змены пасля Чарнобыльскай катастрофы.

Бышнёў І. І. з'яўляецца аўтарам манаграфіі «Атлас наземных позвоночных: Березинский биосферный заповедник» (1996), 70 навуковых прац, больш за 300 прыродаахоўных публікацый, у тым ліку 10 навукова-папулярных кніг «Птицы над Березиной» (1993), «Животный мир Беларуси от «А» до «Я»« (2015), «Путешествие в мир природы Беларуси» (2016) і фотаальбомаў «Спеў глушачы», «Скарбы прыроды Беларусі» (2002), «Прыпяць жывая», «Вада Палесся». Ігар Бышнёў – пераможца конкурсаў імя Фармозава па прапагандзе аховы птушак Мензбіроўскага арніталагічнага Таварыства акадэміі навук Расіі.

З 2010 г. – рэжысёр тэларадыёкампаніі «Мір», аўтар тэлеперадачы «Мільён пытанняў пра прыроду». У яго рэжысёрскіх і сцэнарысцкіх работах навуковая і дакладнасць і асветніцкі характар спалучаюцца з высокім мастацкім узроўнем: «Живая вода» (2000), «Последние орлы», «Жабы на дорогах», «В царстве бакланов и цапель» (2002), «Живите в гармонии» (2003), «Аисты Ровбицка» (2005), «Зачарованнные болота» (2006), «Тропой волка» (2007), «Судьба зубра» (2008), «Река жизни», «Самый лучший домик» (2009), «Радиоактивные волки Чернобыля» (2011), «Кавалеры рек, болот и лесов» (2012), «Ширванский национальный парк» (2014), «Красный бор. Мир воды» (2017) і іншыя. У 2011 годзе фільм «Радиоактивные волки Чернобыля» перамог на найбуйнейшым у свеце фестывалі прыроднага кіно Jackson Hole Wildlife Film Festival і быў удастоены яшчэ 15 узнагарод.

БЫШНЁЎ

ІГАР ІВАНАВІЧ

55 год з дня нараджэння

(1964)

Бышнёў Ігар Іванавіч нарадзіўся 7 студзеня 1964 года ў в. Халамер'е Гарадоцкага раёна. Беларускі вучоны-арнітолаг, эколаг, рэжысёр, сцэнарыст, аператар шматлікіх дакументальных фільмаў пра беларускую прыроду, кандыдат біялагічных навук (1999), сябра Цэнтральнага савета ГА «Ахова птушак Беларусі», лаўрэат Спецыяльнай Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне кіно і тэлебачання (2003, 2006). Уладальнік Гран-Пры, прызёр і дыпламант міжнародных кінафестываляў у Расіі, Беларусі, Украіне, Італіі, Эстоніі, Польшчы, Румыніі і Індыі.

У 1968 годзе ён з бацькамі пераехаў у г. п. Багушэўск Сенненскага раёна. У 1980 годзе скончыў Багушэўскую сярэднюю школу № 2 з залатым медалём і паступіў на факультэт біялогіі і экалогіі Белдзяржуніверсітэта.

У 1985–1999 гг. працаваў у Бярэзінскім біясферным запаведніку. У 1999 годзе Ігар Іванавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю, займаўся даследаваннем супольнасцяў птушак прыродных экасістэм Беларусі. У

дзеяч, педагог, прафесар Віленскай акадэміі, ураджэнец Віцебскага ваяводства.

23 лютага – 160 гадоў таму (1859) нарадзіўся Ікаў Канстанцін Мікалаевіч (1859–1895), маскоўскі антраполаг, археолаг. У час экспедыцыі ў Мінскую і Віцебскую губерні (1886) сабраў матэрыялы для асноўнай працы па антрапаметрыі беларусаў, рускіх і ўкраінцаў.

23 лютага – 140 гадоў таму (1879) нарадзіўся Малевіч Казімір Севярынавіч (1879–1935), мастак, тэарэтык мастацтва, педагог, адзін з заснавальнікаў абстрактнага мастацтва і супрэматызма, у 1919–1922 гг. – выкладчык Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Ураджэнец г. Кіеў (Украіна).

23 лютага – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Казлоў Арсен Яўхімавіч (1919–1971), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец в. Газьба Гарадоцкага раёна.

23 лютага – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Саевіч Цімафей Аляксандравіч (1919–2003), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1945). З 1943 г. – на фронце, зрабіў 160 вылетаў на разведку ворага, ваяваў на тэрыторыі г. Віцебска і г. Полацка. Ураджэнец в. Сухаполь Архангельскага раёна.

23 лютага – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Жданко Рыгор Сямёнавіч (1924–1987), дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Крукоўшчына Ушацкага раёна.

25 лютага – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Макавецкі Фёдар Яфрэмавіч (1899–1974), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1943). Ураджэнец в. Багданаўка Талачынскага раёна.

25 лютага – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Лузгін Васіль Іванавіч (1914–1998), партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Ураджэнец в. Дрымаўшчына Чашніцкага раёна.

26 лютага – 100 гадоў таму (1919) ва Ушачах адкрылася польская нацыянальная школа.

28 лютага – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Кандрашоў Пётр Пятровіч (1924–1998), Герой Сацыялістычнай Працы. Працаваў у галіне сельскай гаспадаркі Віцебскай вобласці. З 1959–1984 – старшыня калгаса «Маладая гвардыя» Мёрскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (1945), ордэнам Славы III ступені (1945), ордэнам «Знак Пашаны» (1958), ордэнам Леніна (1966), ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), ордэнам Айчыннай вайны II ступені (1985), медалямі. Ураджэнец в. Дзямідавічы Магілёўскай вобл.

28 лютага – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Канапацкі Ібрагім Барысавіч (1949–2005), беларускі гісторык, грамадскі і рэлігійны дзеяч. Кандыдат

афармляў выданні УНОВИСа (сумесна з І. Чашнікам), ураджэнец г. Віцебска.

29 снежня – 90 гадоў таму (1929) прайшоў 1-ы з'езд калгаснікаў Гарадоцкага раёна.

29 снежня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Прудзікаў Віктар Сяргеевіч, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар ветэрынарных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі экалогіі. З 1976 г. працуе ў Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. З 2007 г. – загадчык кафедры патанатоміі і гісталогіі. Ураджэнец в. Кулішова Буда Смаленскай вобл.

29 снежня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Мянжынскі Валерый Станіслававіч, беларускі вучоны-гісторык, ураджэнец г. Віцебска.

30 снежня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Труфанаў Пётр Цярэнцьевіч (1909–1980), удзельнік вызвалення Бешанковіцкага раёна ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

лаўрэат літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес» (2012). Ураджэнец в. Бабча Лепельскага раёна.

25 снежня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Шэлег Анатоль Рыгоравіч (1909–1988), беларускі акцёр, народны артыст Беларусі. З 1931 г. – акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.

25 снежня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Пятаковіч Аляксандр Францавіч (1914–1988), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец г. Сянно.

25 снежня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Курыленка Уладзімір Цімафеевіч (1924–1942), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1942). З 1941 г. – партызан-падрыўнік атрада І. Шырокава, які дзейнічаў на тэрыторыі Смаленскай вобласці, ураджэнец в. Бабінічы Віцебскага раёна.

27 снежня – 40 гадоў таму (1979) адкрыты рух электравозаў на чыгуначным участку Орша–Вязьма.

28 снежня – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Васільева Галіна Сцяпанаўна, беларуская мастачка, член Беларускага саюза мастакоў (1993). Выкладчык кафедры дызайну Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (1992), дацэнт кафедры дызайну (1998). Ураджэнка г. Полацка.

29 снежня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Хідзекель Лазар Маркавіч (1904–1986), мастак, архітэктар, член авангарднага аб’яднання мастакоў УНОВИС, створанага К. С. Малевічам. Прымаў удзел у віцебскіх акцыях, вулічных праектах, выстаўках,

гістарычных навук (1970). Унёс вялікі ўклад у аднаўленне мячэці ў г. п. Відзы Браслаўскага раёна. Ураджэнец г. п. Смілавічы Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці.

80 гадоў таму (1939) адкрыўся Віцебскі абласны Дом народных мастацтваў. З 1980 г. – абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-выхаваўчай работы. Сучасная назва – ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці».

1 сакавіка – 90 гадоў таму (1929) нарадзілася Лось Еўдакія Якаўлеўна (1929–1977), паэтэса, аўтар шэрага зборнікаў, твораў для дзяцей, ураджэнка в. Старына Ушацкага раёна.

1 сакавіка – 30 гадоў таму (1989) заснаваны Аршанскі музей гісторыі і культуры горада, у 1992 г. – адкрыты для наведвальнікаў, з 1994 г. – філіял Музейнага комплекса гісторыі і культуры Аршаншчыны.

3 сакавіка – 100 гадоў таму (1919) нарадзілася Маршалава Ефрасіння Яфрэмаўна (1919–1999), Герой Сацыялістычнай Працы (1966). З 1944 г. – палявод у калгасе «Наперад!», у 1956–1975 гг. – звеннявая льнаводчага звяна калгаса імя ХХ з’езда КПСС Дубровенскага раёна.

3 сакавіка – 100 гадоў таму (1919) пачаў работу першы губернскі з'езд камсамола.

3 сакавіка – 90 гадоў таму (1929) нарадзілася Супрун Лідзія Якаўлеўна (1929–2014), беларускі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. З 1962 г. працавала ў Віцебскім медыцынскім універсітэце.

4 сакавіка – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Собаль Валянцін Енісеевіч, археолаг, кандыдат гістарычных навук (1988), ураджэнец г. Паставы Віцебскай вобласці.

5 сакавіка – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Філіпенка Леанід Мікалаевіч (1914–2012), Герой Савецкага Саюза (1945). Ганаровы грамадзянін г. Віцебска.

5 сакавіка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Клімчанка Яўген Іванавіч (1924–1989), Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі, заслужаны настаўнік рабочай моладзі, ураджэнец в. Лагаўшчына Талачынскага раёна.

5 сакавіка – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Бадзягін Уладзімір Іванавіч (1934–2002), спартсмен па пяцібор'і, трэнер па футболе. Заслужаны трэнер БССР (1982), чэмпіён II Спартакіяды БССР па сучасным пяцібор'і (1956), з 1958 г. – трэнер Віцебскага абласнога савета ДСТ «Чырвоны сцяг», з 1960 г. – старшы трэнер, з 1975 г. – кіраўнік футбольнай каманды «Дзвіна» (Віцебск). Ураджэнец г. Віцебска.

6 сакавіка – 150 гадоў таму (1869) нарадзіўся Арленеў Павел Мікалаевіч (сапр. Арлоў; 1869–1932), рускі

21 снежня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Ступеня Аляксандр Пятровіч, мастак, ураджэнец г. Полацка.

21 снежня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Ізаітка Анатоль Сяргеевіч (1954–2014), беларускі жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў (1995). З 1989 г. – мастак Віцебскага камбіната «Мастацтва», ураджэнец г. Полацка.

23 снежня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Бераў Міхаіл Залманавіч (сапр. Маісей; 1909–2003), беларускі кінааператар. Скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум (1930).

23 снежня – 50 гадоў таму (1969) узведзены ў строй 1-ы энергаблок Лукомскай ДРЭС.

24 снежня – 235 гадоў таму (1784) нарадзіўся Даленга-Хадакоўскі Зарыян Якаўлевіч (сапр. Чарноцкі Адам; 1784–1825), беларускі славяназнавец, адзін з пачынальнікаў беларускай, украінскай, рускай і польскай археалогіі, старажытнай гісторыі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Вывучаў гарадзішча Старое Сяло пад Віцебскам. Ураджэнец маёнтка Падгайна каля в. Гайна Лагойскага раёна Мінскай вобласці.

24 снежня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Рублеўскі Сяргей Васілевіч, празаік і паэт. У 1990–2008 гг. – галоўны рэдактар абласной газеты «Народнае слова». У 2008–2013 гг. – намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама, начальнікам аддзела па архівах і справаводстве. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (2003),

Віцебшчыны), гісторык, літаратуразнавец, ураджэнец в. Новае Сяло Шумілінскага раёна.

19 снежня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Пятрэнка Мікалай Макаравіч (1919–1997), дзеяч аматарскага мастацтва, кампазітар, педагог. Заслужаны настаўнік Беларусі (1966), з 1960 г. працаваў у Полацкім педагагічным вучылішчы. Ураджэнец в. Барбароў Мазырскага раёна Гомельскай вобласці.

20 снежня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Пузікаў Пётр Дзмітрыевіч (1919–1977), беларускі філосаф, аўтар навуковых прац, доктар філасофскіх навук, прафесар (1968), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1975), ураджэнец в. Падоры Шумілінскага раёна.

21 снежня – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Бердыган Казімір Іосіфавіч (1894–1972), вучоны, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец в. Паноры Верхнядзвінскага раёна.

21 снежня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Кашавой Пётр Кірылавіч (1904–1976), савецкі ваенны дзеяч. Маршал Савецкага Саюза (1968), Герой Савецкага Саюза (1944, 1945), удзельнік вызвалення Віцебска, Оршы, ураджэнец г. Александрыя Кіраваградскай вобласці (Украіна).

21 снежня – 100 гадоў таму (1919) нарадзілася Хейнман Фаіна Барысаўна, вучоны ў галіне марфалогіі нервовай сістэмы, франтавы хірург,капітан медыцынскай службы ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнка г. Віцебска.

21 снежня – 95 гадоў таму (1924) пачала працаваць Гарадоцкая гідраэлектрастанцыя.

акцёр. У 1889–1890 гг. – у складзе рускай тэатральнай трупы працаваў у Полацку.

6 сакавіка – 60 гадоў таму (1959) у Віцебску быў адкрыты ўнівермаг.

6 сакавіка – 55 гадоў таму (1964) нарадзіўся Міхно Уладзімір Фёдаравіч, журналіст, пісьменнік, ураджэнец Лепельскага раёна.

7 сакавіка – 135 гадоў таму (1884) у Санкт-Пецярбургу нарадзіўся Цшохер Альфрэд Аскаравіч, з 1919 г. – эмісар Віцебскай музычнай акругі, з 1921 г. выкладаў гісторыю музыкі ў Віцебскай Народнай кансерваторыі, у 1932 г. вярнуўся ў Санкт-Пецярбург.

7 сакавіка – 95 гадоў таму (1924) Віцебск наведаў рускі пісьменнік А. М. Талстой.

7 сакавіка – 75 гадоў таму (1944) у Віцебску быў адкрыты абласны Дом дзіцяці.

8 сакавіка – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Крэмень Анатоль Сцяпанавіч, Герой Сацыялістычнай Працы (1964), заслужаны будаўнік Беларусі (1963), былы будаўнік Віцебскага будаўнічага трэста № 9, Наваполацкага трэста № 16.

9 сакавіка – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Дзежыц Валянцін Канстанцінавіч (1904–1964), беларускі жывапісец, педагог. У 1931–1941 гг. – выкладчык мастацкага вучылішча ў Віцебску, з 1948 г. – Віцебскага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава. Ураджэнец г. Хельсінкі (Фінляндыя).

9 сакавіка – 90 гадоў таму (1929) створаны Боркавіцкі раён – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР.

Да 1930 г. – у Полацкай акрузе, у 1931 г. – скасаваны.

11 сакавіка – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Крапцоў-Зайчанка Мікалай Васілевіч (1914–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец г. Ужур Краснаярскага краю (Расія).

11 сакавіка – 65 гадоў таму (1954) нарадзілася Лазаковіч Тамара Васілеўна (1954–1992), беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіёнка XX Алімпійскіх гульняў (1972), чэмпіёнка свету, абсалютная чэмпіёнка Еўропы, абсалютная чэмпіёнка V Спартакіяды народаў СССР, чэмпіёнка СССР. З 1976 г. – дзяржаўны трэнер СССР па Віцебскай вобласці.

12 сакавіка – 190 гадоў таму (1829) нарадзіўся Грабніцкі Отан Мікалаевіч (1829–1865), удзельнік паўстання 1863–1864 гг. на Беларусі, ураджэнец Лепельскага раёна.

12 сакавіка – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Аўдошка Мікалай Пятровіч, Герой Сацыялістычнай Працы (1979). У 1954–1957 гг. – працаваў у Ветрынскім райкаме КПБ, з 1958 г. – у Полацкім гаркаме КПБ, з 1960 г. – у парткаме саўгаса «Банонь» Полацкага раёна.

12 сакавіка – 65 гадоў таму (1954) праведзены збор камсамольскага актыву г. Віцебска, прысвечаны адпраўцы

12 снежня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Пашкевіч Нічыпар Еўдакімавіч (1924–2003), беларускі крытык, літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук (1970), заслужаны работнік культуры Беларусі (1974), ураджэнец в. Філістава Талачынскага раёна.

13 снежня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Варонін Мікалай Мікалаевіч (1904–1976), расійскі археолаг, гісторык мастацтва, доктар гістарычных навук, прафесар (1946). Дзяржаўная прэмія СССР (1952), Ленінская прэмія (1965). Вывучаў збудаванні і фрэскі Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра каля Полацка. Ураджэнец г. Уладзімір (Расія).

14 снежня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Макаранка Уладзімір Сцяпанавіч (1929–2005), вучоны ў галіне паталагічнай фізіялогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец г. Віцебска.

15 снежня – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Юдовін Саламон Барысавіч (1894–1954), мастак, аўтар прац у станкавай і кніжнай графіцы, экслібрысе, ураджэнец г. п. Бешанковічы.

16 снежня – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Анцімонаў Леанід Сяргеевіч (1934–2012), беларускі графік, жывапісец, педагог, у 1964–2005 гг. выкладаў у ВДУ імя П. М. Машэрава, ураджэнец в. Куляшы Сенненскага раёна.

17 снежня – 130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Васілеўскі Даніла Мінавіч (1889–1963), краязнавец (даследчык

3 снежня – 95 гадоў таму (1924) нарадзілася Арцёменка Ганна Фёдараўна (1924–2010), Герой Сацыялістычнай Працы. У 1946–1948 гг. працавала ў Полацкім абласным ўпраўленні сельскай гаспадаркі, у 1950–1991 гг. – вязальшчыца панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя КІМ. Ураджэнка в. Беляі Полацкага раёна

4 снежня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Баразна Лявон Цімафеевіч (1929–1972), беларускі мастак, ураджэнец в. Новае Сяло Талачынскага раёна.

5 снежня – 95 гадоў таму (1924) нарадзілася Рубіцель Кацярына Захараўна (1924–2009), Герой Сацыялістычнай Працы (1966). З 1944 г. – у калгасе «Чырвоныя застенкі», з 1951 г. – палявод, у 1959–1972 гг. – звеннявая льнаводчага звяна калгаса «Прагрэс» Дубровенскага раёна, ураджэнка в. Чырвоныя Засценкі Дубровенскага раёна.

7 снежня – 90 гадоў таму (1929) адбылася 1-я канферэнцыя жанчын-калгасніц Віцебскай акругі.

11 снежня – 55 гадоў таму (1966) нарадзіўся Кавалеўскі Сяргей Мікалаевіч, журналіст, краязнаўца, удзельнік міжнароднай экспедыцыі ад вытокаў Заходняй Дзвіны да Віцебска, ураджэнец г. Віцебска.

12 снежня – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Турлай Андрэй Аляксеевіч (1894–1937), партыйны і прафсаюзны дзеяч Беларусі. З 1933 г. – сакратар, з 1935 г. – 1-ы сакратар Полацкага райкама КП(б)Б. Ураджэнец в. Кракаўка Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці.

першых 180 камсамольцаў ў Казахстан на асваенне цалінных зямель.

16 сакавіка – 80 гадоў член-карэспандэнт 1980), доктар тэхнічных навук (1975), прафесар (1977), заслужаны вынаходнік Беларусі (1978), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

16 сакавіка – 25 гадоў таму (1994) скончыла сваю дзейнасць мастацкае аб'яднанне «Квадрат».

17 сакавіка – 230 гадоў таму (1789) нарадзіўся Бучынскі Вінцэнцій (1789–1853), філосаф, тэолаг, крытык, заснавальнік і рэдактар першага на Беларусі літаратурна-навуковага часопіса «Полацкі штомесячнік» (1818–1820), выкладчык Полацкай езуіцкай акадэміі.

17 сакавіка – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Шаўроў Аляксей Сямёнавіч (1904–1974), дзяржаўны дзеяч Беларусі, заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання БССР (1966), ураджэнец в. Шабуні Віцебскага раёна.

17 сакавіка – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Забела Уладзімір Паўлавіч, беларускі рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1990), прафесар (1995). З 1970 г. – у Беларускім тэатры імя Я. Коласа, ураджэнец г. Вільнюса (Літва).

17 сакавіка – 30 гадоў таму (1989) у Оршы адкрыта Гарадская выставачная зала.

18 сакавіка – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Франкфурт Аляксандр Ізраілевіч (1904–1977), беларускі вучоны ў галіне ўнутранай медыцыны, доктар

медыцынскіх навук, прафесар. У 1959–1970 гг. працаваў у Віцебскім медыцынскім інстытуце. Ураджэнец п. Станаў Хмяльніцкай вобл. (Украіна).

18 сакавіка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Бяляўскі Васіль Мікалаевіч (1924–2008), беларускі мастак, ураджэнец в. Крашына Аршанскага раёна.

18 сакавіка – 75 гадоў таму (1944) нарадзілася Харытончык Зінаіда Андрэеўна, беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук (1987), прафесар (1988), ураджэнка г. Дзісна Мёрскага раёна.

20 сакавіка – 130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Родзевіч Часлаў Іванавіч (1889–1942), беларускі грамадскі дзеяч, збіральнік і прапагандыст фальклору. Уваходзіў у першую беларускую трупу Ігната Буйніцкага.

22 сакавіка – 95 гадоў таму (1924) нарадзілася Курносава Анастасія Захараўна (1924–1992), Герой Сацыялістычнай Працы (1975). З 1944 г. – свінарка калгаса «Расія» Віцебскага раёна, ураджэнка в. Партызанаўка Віцебскага раёна.

23 сакавіка – 105 гадоў таму (1914) нарадзілася Плыгаўка Лідзія Пятроўна (1914–2002), Герой Сацыялістычнай Працы (1966). З 1949 г. – калгасніца, у 1951–1970 гг. – звеннявая льнаводчага звяна калгаса «Парыжская камуна» Глыбоцкага раёна.

23 сакавіка – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Шпакаў Аляксей Пракоф'евіч (1929–2014), беларускі вучоны ў галіне заатэхнікі. З 1953 па 2009 год працаваў у Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

30 гадоў таму (1989) выйшаў першы нумар гарадской газеты «Витебский курьер».

15 гадоў;– таму (2004) у Віцебску пачала выдавацца газета «Вести ВГТУ».

1 снежня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Платонаў Уладзімір Пятровіч, беларускі матэматык, прафесар, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі і прэміі Ленінскага камсамола, ураджэнец в. Стайкі Аршанскага раёна.

2 снежня – 135 гадоў таму (1884) нарадзіўся Пустынін Міхаіл Якаўлевіч (сапр. Разенблат; 1884–1966), літаратар, журналіст. У Віцебску жыў і працаваў у 1918–1922 гг

2 снежня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Васільеў Васіль Вячаслававіч, беларускі мастак, педагог, ураджэнец г. Оршы. Працуе ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце.

2 снежня – 30 гадоў таму (1989) на I абласной канферэнцыі прадстаўнікоў першасных прафсаюзных арганізацый кааператываў Віцебскай вобласці была створана Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў розных формаў прадпрымальніцтва «Садружнасць».

3 снежня – 160 гадоў таму (1859) у Віцебску пачаў працаваць тэлеграф.

3 снежня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Кананюк Віталь Іванавіч, генерал-маёр, спецыяліст у галіне ваеннай навукі, прафесар, ураджэнец в. Вышадкі Гарадоцкага раёна.

Глыбоччыны». Ураджэнец в. Тройца Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці.

29 лістапада – 155 гадоў таму (1864) нарадзіўся Багдановіч Карл (1864–1947), падарожнік, геолаг, географ, ураджэнец Віцебскай губерні. Даследаваў Закаспійскі край, хрыбет Капетдаг, Персію (1886–1887), узначальваў экспедыцыю па ўзбярэжжы Ахоцкага мора і Камчаткі.

30 лістапада – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Лынькоў Міхась (Міхаіл Ціханавіч; 1899–1975), пісьменік, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1968), народны пісьменнік Беларусі, узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, ураджэнец в. Зазыбы Віцебскага раёна.

30 лістапада – 100 гадоў таму (1919) выдадзены каталог Першай дзяржаўнай выставы віцебскіх мастакоў.

105 гадоў таму (1914) у Віцебску створаны артылерыйскія майстэрні, з 1918 г. – завод сельскагаспадарчых машын. зараз – Віцебскі станкабудаўнічы завод «ВІСТАН».

75 гадоў таму (1944) у Віцебску пачала работу адноўленая фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі».

75 гадоў таму (1944) у г. п. Шаркаўшчына пачала выдавацца раённая газета «Сялянская праўда». З 1967 г. – «Кліч Радзімы».

65 гадоў таму (1954) адкрыты Лепельскі краязнаўчы музей.

23 сакавіка – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Ласкаўнёў Аляксандр Пятровіч, беларускі вучоны ў галіне матэрыялазнаўства. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (2009), доктар тэхнічных навук (2004). Ураджэнец г. п. Расоны.

24 сакавіка – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Агалінская Людміла Васільеўна, краязнаўца, бібліятэкар, ураджэнка в. Гаі Верхнядзвінскага раёна.

24 сакавіка – 95 гадоў таму (1924) нарадзілася Крупская Ганна Міхайлаўна (1924–1994), Герой Сацыялістычнай Працы (1966), ураджэнка в. Мураўшчына Полацкага раёна.

25 сакавіка – 25 гадоў таму (1994) у Полацку адкрыты музей-бібліятэка Сімяона Полацкага, філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка

26 сакавіка – 120 гадоў таму (1899) у в. Рамашкава Талачынскага раёна нарадзіўся Бладыка Нікіфар Міхайлавіч (1899–?), беларускі педагог.

26 сакавіка – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Казаравец Мікалай Уладзіміравіч, беларускі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі, член-карэспандэнт НАН Беларусі (2004), доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар (2000). Ураджэнец в. Харкі Пастаўскага раёна.

26 сакавіка – 65 гадоў таму (1954) нарадзілася Катовіч Таццяна Віктараўна, беларускі тэатразнаўца, педагог, доктар мастацтвазнаўства (2007), прафесар (2010). Член Беларускага саюза мастакоў. З

2001 г. выкладае ў ВДУ імя П. М. Машэрава, ураджэнка г. Віцебска.

27 сакавіка – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Піменаў Васіль Васільевіч (1954–2005), удзельнік вайны ў Афганістане, Герой Савецкага Саюза (1984). Камандзір батальёна парашутна-дэсантнага палка вызначыўся ў кастрычніку 1983 г. пры разгроме буйной групоўкі душманаў. Ураджэнец г. Віцебска.

27 сакавіка – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Пагарэлая Ксенія Максімаўна, беларуская арганістка. З 1988 г. – арганістка канцэртнага зала Полацкага Сафійскага сабора, з 2004 г. – выкладчык Віцебскага філіяла Беларускай акадэміі музыкі. Ураджэнка г. Краснадар (Расія).

28 сакавіка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Томскі Аляксей Арсеньевіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1945). Камандзір узвода аўтаматчыкаў вызначыўся ў Лёзненскім раёне.

28 сакавіка – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Навуменка Якаў Паўлавіч (1959–2012), беларускі эстрадны спявак, заслужаны артыст Беларусі (1997), ураджэнец г. Орша.

30 сакавіка – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Зарака-Заракоўскі Баляслаў Францавіч (1894–1963), савецкі і польскі военачальнік, генерал–лейтэнант (СССР, 1946), генерал дывізіі (ПНР, 1945), удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай

26 лістапада – 100 гадоў таму (1919) створана Заходнедзвінская ваенная флатылія (1919–1924) загадам РВСР з 2-га атрада Ваенна-рачной флатыліі Савецкай Латвіі (база ў г. Віцебску), аператыўнае аб’яднанне баявых рачных караблёў у грамадзянскую вайну на Заходнім фронце.

26 лістапада – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Рабцэвіч Валянцін Навумавіч (1934–2008), беларускі нумізмат, археолаг, доктар гістарычных навук (1996). У 1979–2007 гг. – кіраўнік археалагічнай экспедыцыі БДУ, якая праводзіла раскопкі старажытна-рускіх курганоў у Віцебскай, Гомельскай, Мінскай абласцях. Ураджэнец в. Краснае Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці.

27 лістапада – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Звездачотаў Мікалай Пятровіч (1904–1985), акцёр Беларускага тэатра імя Я. Коласа (1929–1977), народны артыст Беларусі (1944), ураджэнец г. Пензы (Расія).

27 лістапада – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Жыгуноў Алесь (сапр. Аляксандр Міхайлавіч), беларускі паэт. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (2006). Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (1995), «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2014). Узнагароджаны нагрудным знакам Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру» (2014 г.). Працуе ў газеце «Веснік

цэнтральнай райбальніцы. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2015). Узнагароджаны Ганаровым Знакам «2000 лет Христианству», нагрудным знакам Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру» (2017). Ураджэнец г. п. Шуміліна.

24 лістапада – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Беранштэйн Фелікс Якаўлевіч (1904–1977). З 1935 г. – загадчык кафедр біяхіміі Віцебскага ветэрынарнага інстытута і Віцебскага медыцынскага інстытута. У 1945–1972 гг. – у Віцебскім ветэрынарным інстытуце (да 1971 г. – загадчык кафедры арганічнай біялагічнай хіміі), ураджэнец г. Роўна (Украіна).

24 лістапада – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Фамін Мікалай Пятровіч (1914–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944). Стралковы батальён пад камандаваннем маёра 22.06.1944 г. каля в. Карташы Шумілінскага раёна прарваў умацаваную абарону праціўніка. Ураджэнец с. Вялікі Сурмет Арэнбургскай вобласці (Расія).

25 лістапада – 305 гадоў таму (1714) нарадзіўся Жаброўскі Тамаш (1714–1758), беларускі архітэктар, матэматык, магістр філасофіі і вольных навук (1752), выкладчык Полацкага калегіума, кіраўнік будаўніцтва езуіцкага кляштара ў Полацку, ураджэнец г. Навагрудак (Расія).

войнаў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец г. Полацка.

31 сакавіка – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Хоміч Франц Ігнатавіч, педагог, краязнаўца, матарыст-матрос у Беламорска-Анежскім параходстве, на цеплаходзе «Балтийский-70» (1966–1970), настаўнік працы і чарчэння ў школах Пастаўскага раёна (1970–2004), жыхар в. Дунілавічы Пастаўскага раёна, ураджэнец в.Седлярова Дунілавіцкага раёна Полацкай вобласці (зараз – Пастаўскі раён).

120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Раскін Аўсей Львовіч (1899–?), прафсаюзны і гаспадарчы работнік. У 1910–1918 гг. – рабочы–шавец віцебскіх і полацкіх прыватных прадпрыемстваў. З 1921 г. – адказны сакратар Полацкага павятовага прафбюро, з 1923 г. – старшыня Віцебскага губернскага аддзела прафсаюза харчавікоў. Ураджэнец г. Полацка Віцебскай вобласці.

100 гадоў таму (1919) пачала выдавацца газета «Известия Городокского исполнительного комитета Совета рабочих и крестьянских депутатов». З 1991 г. – «Гарадоцкі веснік».

70 гадоў таму (1949) нарадзілася Каваленка Лілія Васільеўна, віцебскі майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У маляванках распрацоўвае тэму народнага свята.

1 красавіка – 185 гадоў таму (1834) нарадзіўся Забелін Іосіф Вікенцьевіч (1834–1875), вучоны-медык, ураджэнец Віцебскай губерні.

2 красавіка – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Афтаназі Раман (1914–2004), польскі бібліятэкар, гісторык, дакументазнаўца, даследчык гісторыі культуры Віцебшчыны.

2 красавіка – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Зуеў Юрый Панцеляймонавіч, беларускі мастак. Жыве ў г. Віцебску.

2 красавіка – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Шапо Уладзімір Дзмітрыевіч (1949), беларускі мастак, ураджэнец г. п. Відзы Браслаўскага раёна.

3 красавіка – 100 гадоў таму (1919) быў адкрыты 1-ы губернскі з'езд настаўнікаў і работнікаў народнай адукацыі.

3 красавіка – 90 гадоў таму (1929) прынята пастанова Віцебскага выканкама «Аб электрыфікацыі Віцебскага раёна ў сувязі з пускам Асінстроя».

4 красавіка – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Кашыра Юрый Фадзеевіч (1904–1943), беларускі рымска-каталіцкі святар, ураджэнец в. Александрова Мёрскага раёна.

5 красавіка – 130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Кардовіч Іосіф Мітрафанавіч (1889–1967), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Друцк Талачынскага раёна.

5 красавіка – 110 гадоў таму (1909) нарадзілася Нікіфарава Марыя Філіпаўна (1909–?), прафсаюзны работнік. У 1926 г. пачала працоўную дзейнасць рабочай швейнай фабрыкі, ураджэнка г. Віцебска.

СССР міжнароднага класа, чэмпіёнка свету, прызёр чэмпіяната Еўропы. Трэнер-выкладчык аддзялення спартыўнай гімнастыкі (дзяўчыны) СДЮШАР № 1 г. Віцебска. Ураджэнка г. Віцебска.

21 лістапада – 200 гадоў таму (1819) нарадзіўся Паплонскі Ян (1819–1885), педагог, кандыдат філасофіі, арганізатар, ураджэнец г. п. Відзы Браслаўскага раёна.

21 лістапада – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Іларыёнаў Сцяпан Іларыёнавіч (1904–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

21 лістапада – 115 гадоў таму (1904) нарадзілася Пятрова Кацярына Васілеўна (1904–1985), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі. Працавала ў Віцебскім ветэрынарным інстытуце.

21 лістапада – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Зімянін Міхаіл Васільевіч (1914–1995), сакратар ЦК КПСС, грамадскі і партыйны дзеяч Беларусі і СССР, журналіст, Герой Сацыялістычнай Працы (1974), ураджэнец г. Віцебска.

22 лістапада – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Улюценка Віктар Васільевіч (псеўданім Антон Параскевін), краязнаўца, калекцыянер, урач, член Беларускага саюза журналістаў (2007), член Саюза пісьменнікаў Беларусі (2012). У 1983–1986 гг. – галоўны ўрач Шумілінскай гарпасялковай бальніцы, працаваў загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення Шумілінскай

1998–2007 гг. – у Віцебскім філіяле Інстытута сучасных ведаў, з 2007 г. – у ВДУ імя П. М. Машэрава. Ураджэнец в. Малыя Стайкі Гарадоцкага раёна.

16 лістапада – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Канапелька Анатоль Мікалаевіч (1939–2002), паэт, перакладчык, літаратуразнавец. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (2003, пасмяротна). Ураджэнец г. п. Расоны.

18 лістапада – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Шалахаў Георгій Акімавіч (1899–1987), генерал-лейтэнант. У гады Вялікай Айчыннай вайны – начальнік штаба арміі і грамадзянскіх войск на Дальнім Усходзе, намеснік начальніка штаба 1-га Далёкаўсходняга фронту, удзельнік вайны з Японіяй (1945), ураджэнец в. Пушча Гарадоцкага раёна.

18 лістапада – 95 гадоў таму (1924) Віцебскі філіял літаратурнага аб'яднання «Маладняк» быў арганізацыйна аформлены ў складзе 5 чалавек. Існаваў да лістапада 1928 года.

18 лістапада – 85 гадоў таму (1934) прайшла I канферэнцыя жанчын-калгасніц Сенненскага раёна.

19 лістапада – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Канцавы Міхаіл Пятровіч (1949), беларускі мастак, скульптар, ураджэнец г. Барані Аршанскага раёна.

20 лістапада – 55 гадоў таму (1964) нарадзілася Аржанікава Таццяна Пятроўна, беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), майстар спорту

5 красавіка – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Рамашкін Цімафей Цярэнцьевіч (1919–1954), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1954), ураджэнец в. Марчанкі Гарадоцкага раёна.

5 красавіка – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Чалей Іван Вацлававіч, інжынер-тэхнолаг, доктар тэхнічных навук, член Рэгіянальнай беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі Санкт-Пецярбурга, ураджэнец г. Паставы Віцебскай вобласці.

6 красавіка – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Крачкоўскі Анатоль Вячаслававіч, краязнаўца, журналіст, член Саюза журналістаў Беларусі (1991). З 1990 г. – карэспандэнт, загадчык сельгасаддзела, адказны рэдактар газеты «Зара» Бешанковіцкага раёна, працаваў у Бешанковіцкім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі. Аўтар кніг па гісторыі Бешанковіччыны. Ураджэнец в. Круляўшчызна Докшыцкага раёна.

7 красавіка – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Галуза Іларыён Рыгоравіч (1899–1977), вучоны ў галіне заалогіі і паразіталогіі, акадэмік АН Казахстана (1946), доктар біялагічных навук, прафесар (1943), лаўрэат дзяржаўнай прэміі СССР (1951), ураджэнец в. Даргейкі Сенненскага раёна.

8 красавіка – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Глагоўская Алена, палітолаг, гісторык, краязнаўца,журналіст, беларускі грамадскі дзеяч, жыве ў Гданьску.

Даследуе дзейнасць беларускага мастака з Браслаўшчыны Пётры Сергіевіча.

9 красавіка – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Шчарбіна Васілій Васільевіч (1914–1942), удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1943). З ліпеня 1941 г. – камандзір разведвальна-дыверсійнага атрада, які дзейнічаў на тэрыторыі Полацка, ураджэнец ст. Нікітаўка Данецкай вобласці.

11 красавіка – 75 гадоў таму (1944) пачалася Полацка-Лепельская бітва 1944 (11.04.1944–15.05.1944) – баі партызанскіх брыгад Полацка-Лепельскай партызанскай зоны супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

12 красавіка – 115 гадоў таму (1904) нарадзілася Лі Соф'я Дзмітрыеўна (1904–1980), беларуская мастачка, заслужаны работнік культуры Беларусі (1975), ураджэнка в. Обаль Сенненскага раёна.

12 красавіка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Цвярскі Аляксандр Давыдавіч (1924–1990), пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў СССР, ураджэнец г. Віцебска.

13 красавіка – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Модэль Міхась (1904–1980), пісьменнік, крытык, беларускі тэатразнавец, ураджэнец в. Камень Лепельскага раёна.

14 красавіка – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Пянькоўскі Валянцін Антонавіч (1904–1969), савецкі военачальнік,

кадэцкага корпуса – генералу Р. І. Кандраценку. Ураджэнец г. Полацка.

11 лістапада – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Заборскі Георгій Уладзіміравіч (1909–1999), беларускі архітэктар, народны архітэктар СССР (1981), заслужаны будаўнік Беларусі (1961), акадэмік Расійскай акадэміі архітэктуры і будаўнічых навук (1995), адзін з аўтараў генплана г. Полацка (1949), ураджэнец г. Мінска.

12 лістапада – 110 гадоў таму (1909) нарадзілася Кроз Дора Захараўна (1909–1997), беларуская артыстка оперы (лірыка-каларатурнае сапрана), ураджэнка г. Сянно.

12 лістапада – 100 гадоў таму (1919) у Віцебску створаны гарадскі народны хор пад кіраўніцтвам М. В. Анцава (1865–1945).

15 лістапада – 110 гадоў таму (1909) было адчынена Лужаснянскае ніжэйшае сельскагаспадарчае вучылішча – першая сельскагаспадарчая ўстанова Віцебскай губерні. Зараз – Лужаснянскі аграрны каледж Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

15 лістапада – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Слямнёў Міхаіл Аляксандравіч, вучоны-філосаф, доктар філасофскіх навук, прафесар (1982), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1990), выдатнік народнай адукацыі Беларусі, выдатнік асветы СССР. З 1971 г. – у Інстытуце філасофіі і права АН Беларусі, у Віцебскім педагагічным інстытуце (з 1982 г. – загадчык кафедры). У

7 лістапада – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Сушко Павел Міхайлавіч (1909–1974), паэт, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Сушкі Дзісненскага павета Віленскай губерні (зараз – Мёрскі раён).

7 лістапада – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Васілеўскі Павел Антонавіч, партыйны, гаспадарчы і прафсаюзны дзеяч, удзельнік размініравання тэрыторыі Віцебскай вобласці пасля Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Карпаўцы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці.

8 лістапада – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Жыткевіч Зміцер (1904–1955), паэт, празаік, ураджэнец в. Халамер'е Гарадоцкага раёна.

8 лістапада – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Камінскі Іван Іларыёнавіч (1919–1974), удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец в. Масоры Сенненскага раёна.

9 лістапада – 95 гадоў таму (1924) у Віцебскім раёне быў адкрыты санаторый «Сасноўка».

11 лістапада – 55 гадоў таму (1964) нарадзіўся Супрановіч Андрэй Міхайлавіч, мецэнат, адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў навукова-папулярнай серыі «Наследие Полоцкой земли», адзін з заснавальнікаў і дырэктар «Полоцкого книжного издательства», на свае грошы паставіў у Полацку помнік герою руска-японскай вайны, гадаванцу Полацкага

генерал арміі (1961). У Вялікую Айчынную вайну удзельнік вызвалення Віцебска, Полацка, ураджэнец г. Магілёва.

14 красавіка – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Аляксееў Іван Епіфанавіч (1909–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1943), ураджэнец г. Полацка.

14 красавіка – 50 гадоў таму (1969) нарадзіўся Сотнікаў Сяргей Мікалаевіч, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў, член Беларускага саюза дызайнераў. З 1999 г. – выкладае ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава, ураджэнец г. Магілёва.

15 красавіка – 100 гадоў таму (1919) Віцебск наведала руская актрыса Марыя Ярмолава 1853–1928).

16 красавіка – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Шацько Рыгор Іванавіч, беларускі акцёр. Артыст, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. З лістапада 1997 года па 2012 год працаваў дырэктарам тэатра. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь (1999). Лаўрэат Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» – за міжнародную культурную дзейнасць (2002). Ураджэнец в. Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці.

17 красавіка – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Гапяёнак Мікалай Іванавіч (1919–2008), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, лётчык, Герой Савецкага

Саюза (1945), кандыдат ваенных навук (1960), ураджэнец в. Глінішча Гарадоцкага раёна.

17 красавіка – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Пахомаў Мікалай Ільіч (1919–1988), партыйны дзеяч Беларусі, журналіст, удзельнік партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, кандыдат гістарычных навук (1954), прафесар (1978). У 1959–1964 гг. – сакратар Віцебскага абкама КПБ, у 1963–1964 гг. – 2-і сакратар Віцебскага прамысловага абкама КПБ, ураджэнец в. Вольшчына Гарадоцкага раёна.

17 красавіка – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Фалей Антаніна Уладзіміраўна, беларуская мастачка, член Беларускага саюза мастакоў (1998). З 1987 г. – выкладае ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Працуе ў галіне тэкстылю, графікі і акварэлі, аб'екта. Ураджэнка г. Баранавічы Брэсцкай вобласці.

18 красавіка – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Ран Лазар Саулавіч (1909–1989), графік, жывапісец. У 1932 г. – скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум.

18 красавіка – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Смірноў Канстанцін Васільевіч, Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Удзельнік партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, з 1944 г. – старшыня калгаса імя Дзімітрава Талачынскага раёна. Ураджэнец в. Пярвушына Кастрамской вобласці (Расія).

эміграцыі, ураджэнец в. Таргуны Докшыцкага раёна.

5 лістапада – 115 гадоў таму (1904) нарадзілася Хадасевіч-Ляжэ Надзея Пятроўна (1904–1983), французская мастачка, ураджэнка в. Асецішча Докшыцкага раёна.

5 лістапада – 80 гадоў таму (1939) нарадзілася Пятрушына Вера Андрэеўна (1939–2010), Герой Сацыялістычнай Працы. У 1954–1994 гг. – свінарка племзавода «Рэканструктар» Талачынскага раёна. Ураджэнка в. Кутавец Крупскага раёна Мінскай вобласці.

6 лістапада – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Цябут Дзмітрый Васілевіч (1914–1987), партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Пуканаўка I Полацкага раёна.

6 лістапада – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Гарулёў Мікола (Мікалай Аляксандравіч; 1919–1980), беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі (1979), ураджэнец в. Баева Дубровенскага раёна

7 лістапада – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Тарасенка Васіль Радзівонавіч (1899–1972), беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук (1947), дацэнт (1932). У 1961–1962 гг. даследаваў Верхні замак у г. Полацку, ураджэнец г. Петрыкаў (Польшча).

Віцебскага навукова-даследчага ветэрынарнага інстытута, ураджэнец г. п. Обаль Шумілінскага раёна.

1 лістапада – 85 гадоў таму (1934) у Віцебску заснавана бальніца-медыцынскі інстытут, з 1938 г. – Віцебскі медыцынскі інстытут. У Вялікую Айчынную вайну эвакуіраваны ў Чалябінск, з 1943 г. – у Яраслаўль (на базе Віцебскага медыцынскага інстытута быў створаны Яраслаўскі медыцынскі інстытут), з 1946 г. – у Віцебску, з 1999 г. – Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт ордэна Дружбы народаў (ВДМУ).

3 лістапада – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Прышывалка Анатоль Пятровіч (1924–1997), беларускі фізік, ураджэнец в. Нізгалава Бешанковіцкага раёна.

4 лістапада – 130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Разэнгольц Аркадзь Паўлавіч (1889–1938), савецкі ваенны і дзяржаўны дзеяч, удзельнік 1-й расійскай (1905–1907) і Кастрычніцкай рэвалюцый, ураджэнец г. Віцебска.

4 лістапада – 95 гадоў таму (1924) заснаваны Віцебскі ветэрынарны інстытут на базе Віцебскага вышэйшага сельскагаспадарчага тэхнікума (з 1921 г.), з 1918 г. – губернскага ветэрынарна-заалагічнага музея, з 1913 г. – ветэрынарнай бактэрыялагічнай лабараторыі, з 1944 г. – Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны.

4 лістапада – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Карніловіч Сяргей (1929–1993), беларускі грамадскі дзеяч у

18 красавіка – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Магучы Валерый Уладзіміравіч, віцебскі скульптар. Ураджэнец в. Кавердзякі Брэсцкага раёна.

19 красавіка – 75 гадоў таму (1944) нарадзілася Беліцкая Людміла Іванаўна, краязнаўца, даследуе гісторыю і культуру г. Віцебска, ураджэнка г. п. Лёзна Віцебскай вобласці.

20 красавіка – 120 гадоў таму (1899) заснавана Віцебскае таварыства апекі над дзецьмі.

20 красавіка – 25 гадоў таму (1994) у Оршы заснаваны музей Уладзіміра Караткевіча, філіял Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны. 26 лістапада 2000 года, да 70-годдзя з дня нараджэння пісьменніка, быў адкрыты будынак музея з невялікай экспазіцыяй толькі ў адной зале. З лютага 2002 г. музей адчыніў дзверы для наведвальнікаў.

21 красавіка – 100 гадоў таму (1919) нарадзілася Раўдзіна Тамара Уладзіміраўна (1919–1991), археолаг. Кандыдат гістарычных навук (1975), даследавала старажытны г. Браслаў (1956). Ураджэнка г. Дзвінск, зараз Даўгаўпілс (Латвія).

22 красавіка – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Валерый Іосіфавіч Атрашкевіч (1939–1990), аўтар навуковых даследаванняў па гісторыі беларускай літаратуры, паэт, дацэнт Магілёўскага педінстытута, ураджэнец в. Красная Горка Ушацкага раёна.

22 красавіка – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Кухто Сяргей Васілевіч (1959–1999), беларускі жывапісец, ураджэнец г. Віцебска.

23 красавіка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Шалуха Барыс Фёдаравіч (1924–2003), краязнавец, педагог, ураджэнец в. Заложжа Аршанскага раёна.

25 красавіка – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Іваноў Уладзімір Усцінавіч, беларускі акварэліст, дырэктар Віцебскага камбіната «Мастацтва» (1988–1992), старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Беларускага саюза мастакоў (1995–2001), ураджэнец в. Мурожніца Шумілінскага раёна.

26 красавіка – 65 гадоў таму (1954) нарадзілася Канявалава Наталля Юр'еўна, беларускі вучоны ў галіне біяхіміі, ураджэнка г. п. Відзы Браслаўскага раёна. Працуе ў ВДМУ.

27 красавіка – 65 гадоў таму (1954) нарадзілася Трафімовіч Тамара Рыгораўна, беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук (2004), ураджэнка в. Бельчыца Полацкага раёна.

28 красавіка – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Бязлюдаў Артур Іосіфавіч(1934–1996), дзяржаўны дзеяч Беларусі, вучоны-эканаміст, ураджэнец г. Барані Аршанскага раёна.

29 красавіка – 90 гадоў таму (1929) нарадзілася Паўлава Марыя Пятроўна, вучоны ў галіне педыятрыі і гематалогіі, ураджэнка в. Падмішнеўе Шумілінскага раёна.

Рэспублікі Беларусь і Беларускага саюза тэатральных дзеячаў, прызам Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка» і інш. Ураджэнец в. Хоўхлава Маладзечанскага раёна.

150 гадоў таму (1869) у Віцебску гастраляваў славуты піяніст і кампазітар А. Р. Рубінштэйн (1829–1894).

100 гадоў таму (1919) у Віцебск прыехаў мастак Казімір Малевіч (1878–1935).

95 гадоў таму (1924) у г. п. Лёзна створана Лёзненская цэнтральная раённая бібліятэка пры Народным доме. З 1930 г. – самастойная ўстанова, з восені 1944 г. – раённая бібліятэка. У 1976 г. пры пераходзе да цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы ўзначаліла сетку бібліятэк раёна і набыла статус цэнтральнай раённай.

25 гадоў таму (1994) заснаваны Віцебскі філіял установы адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін».

1 лістапада– 145 гадоў таму (1874) нарадзіўся Вышалескі Сяргей Мікалаевіч (1874–1958), эпізаатолаг, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарнай медыцыны, акадэмік НАН Беларусі (1928), прафесар (1924), заслужаны дзеяч навукі СССР (1940), Ганаровы член ВАСХНІЛ (1956). З 1928 г. – загадчык кафедры эпізааталогіі Віцебскага ветэрынарнага інстытута, адначасова дырэктар

27 кастрычніка – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Гаўрылаў Пётр Філіпавіч (1914–1968), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944).

28 кастрычніка – 95 гадоў таму (1924) адкрыўся I Віцебскі акруговы з'езд камсамола.

29 кастрычніка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Буглоў Яўген Данілавіч, вучоны-патафізіёлаг, доктар медыцынскіх навук, ураджэнец в. Стрыжнева Лёзненскага раёна.

29 кастрычніка – 95 гадоў таму (1924) створаны Кузняцоўскі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–1927). Былы Лосвідскі раён, які ўваходзіў у Віцебскую акругу, быў перайменаваны. 26.03.1927 г. – скасаваны, тэрыторыя далучана да Віцебскага раёна.

31 кастрычніка – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Кокштыс Тадэвуш Антонавіч, беларускі акцёр, народны артыст Беларусі (1984). Артыст, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, у якім працуе з 1958 года. Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, ордэнам «Знак Пашаны», Знакам і Ганаровай граматай Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», прэміяй імя Ігната Буйніцкага Міністэрства культуры

29 красавіка – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Шайко Сяргей Васільевіч, краязнаўца, педагог, гісторык, дырэктар СШ № 1 імя З. І. Азгура г. Сянно, намеснік старшыні Сенненскага райвыканкама (1996), удзельнік стварэння Сенненскага раённага краязнаўчага музея, ураджэнец УССР.

120 гадоў таму (1899) адбылася першая рабочая маёўка ў Віцебску.

100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Галецкі Пётр Антонавіч (1919–1942), удзельнік партызанскага руху на Віцебшчыне і Смаленшчыне ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1965), ураджэнец в. Майдан Талачынскага раёна.

1 мая – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Кандраценка Міхаіл Барысавіч (1924–2004), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Трыніўкі Віцебскага раёна. Працаваў на торфапрадпрыемстве «Дабееўскі Мох» Шумілінскага раёна.

1 мая – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Касалапаў Якаў Ягоравіч (1934–1982), беларускі кампазітар. З 1966 г. – выкладчык Віцебскага музычнага вучылішча і музычнай школы № 1 г. Віцебска. Займаўся апрацоўкай музычнага фальклору Віцебшчыны, ураджэнец г. Оршы.

1 мая – 80 гадоў таму (1939) у Віцебску адкрыты помнік А. С. Пушкіну.

1 мая – 60 гадоў таму (1959) дала ток Клясціцкая ГЭС на рацэ Нішча Расонскага раёна. Яго атрымалі вёскі Кавалі, Маркова, Забалоцце, Сінск, Лапешчына, Казімірова, Пушча.

2 мая – 205 гадоў таму (1814) нарадзіўся Касовіч Каятан Андрэевіч (1814–1883), беларускі і расійскі вучоны ў галіне ўсходазнаўства, санскрытолаг, ураджэнец г. Полацка.

3 мая – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Крук Віктар Фёдаравіч, беларускі жывапісец з г. п. Шаркаўшчына. Ураджэнец в. Крукоўшчына Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці.

4 мая – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Фрадкін Марк Рыгоравіч (1914–1990), беларускі і расійскі кампазітар, народны артыст СССР (1985), Дзяржаўная прэмія СССР (1979), ураджэнец г. Віцебска.

5 мая – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Сліц Антон Іванавіч (1894–1945), ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік грамадзянскай вайны, вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944), кавалер ордэна Леніна (1944, 1945), ураджэнец Віцебскай губерні.

5 мая – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Самуйлаў Іван Савельевіч (1924–2006), Герой Сацыялістычнай Працы (1973), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1948 г. – палявод, у 1951–1989 гг. – брыгадзір паляводчай комплекснай брыгады калгаса «Новае жыццё» Лёзненскага раёна, ураджэнец в. Засігава Лёзненскага раёна.

23 кастрычніка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Лепешаў Іван Якаўлевіч (1924–2014), беларускі мовазнавец, ураджэнец в. Іскозы Дубровенскага раёна.

23 кастрычніка – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Кудзін Васіль Савельевіч (1929–1987), Герой Сацыялістычнай Працы (1966). З 1954 г. – механізатар, з 1964 г. – звеннявы бульбаводчага звяна калгаса імя Энгельса Талачынскага раёна, ураджэнец г. Талачына.

24 кастрычніка – 155 гадоў таму (1864) нарадзіўся Бялыніцкі-Біруля Аляксей Андрэевіч (1864–1937), заолаг, географ, краязнавец, вучоны, удзельнік Палярнай экспедыцыі (1900–1901), ураджэнец Аршанскага раёна.

25 кастрычніка – 135 гадоў таму (1884) нарадзіўся Дубінскі Сяргей Антонавіч (1884–1937), беларускі археолаг. Даследаваў гарадзішчы і курганныя могільнікі каля Віцебска, Полацка. У 1926–1928 гг. – вывучаў гарадзішча Германы каля г. Орша. Ураджэнец в. Наройкі Бельскага павета Гродзенскай губерні.

25 кастрычніка – 70 гадоў таму (1949) нарадзілася Ісаёнак Марыя Іванаўна, беларускі жывапісец, ураджэнка в. Кісялі Гарадоцкага раёна.

27 кастрычніка – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Лаўрыновіч Эдуард Віктаравіч (1909–1982), удзельнік партызанскага руху ў Гомельскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец в. Кулакова Верхнядзвінскага раёна.

(1988), прафесар (1989), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1997), ураджэнец г. Віцебска.

21 кастрычніка – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Кірпічоў Іларыён Паўлавіч (1914–1999), удзельнік савецка-фінляндскай вайны, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1940), ураджэнец в. Якаўлевічы Аршанскага раёна.

21 кастрычніка – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Навіцкі Уладзімір Іосіфавіч, беларускі вучоны–гісторык, доктар гістарычных навук (1990), прафесар (1995), лаўрэат прэміі НАН Беларусі і Сібірскага аддзялення РАН імя акадэміка В. А. Капцюга (2003), ураджэнец в. Боркавічы Верхнядзвінскага раёна.

22 кастрычніка – 20 гадоў таму (1999) створана Віцебскае абласное ўпраўленне Міністэрства па надзвычайных сітуацыях у выніку рэарганізацыі Віцебскага абласнога ўпраўлення ваенізаванай пажарнай службы МУС Рэспублікі Беларусь.

23 кастрычніка – 115 гадоў таму (1904) нарадзілася Іванова Праскоўя Сцяпанаўна (1904–1970), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарнай паразіталогіі, доктар ветэрынарных навук (1949). У 1956–1970 гг. – загадчык кафедры паразіталогіі Віцебскага ветэрынарнага інстытута, ураджэнка с. Вялікае Воснае Валагодскай вобласці (Расія).

6 мая – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Асінскі Ігар Мікалаевіч, журналіст, лаўрэат Прэміі прафсаюзаў Беларусі, кандыдат гістарычных навук (1978), ураджэнец в. Заессе Чашніцкага раёна.

7 мая – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Ліпчык Міхаіл Яўстаф'евіч, беларускі баяніст, заслужаны артыст Беларусі (1989), ураджэнец г. Глыбокае.

7 мая – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Урублеўская Святлана Паўлаўна, беларуская мастачка. З 1983 г. выкладае ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце.

8 мая – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Ганчароў Мікалай Іванавіч (1934–1991), мастак, графік, мастацтвазнавец, пісьменнік, ураджэнец в. Заполле Віцебскага раёна.

8 мая – 70 гадоў таму (1949) нарадзілася Смірнова Ларыса Мікалаеўна, заслужаны архітэктар Беларусі (2004), ураджэнка г. Полацка.

9 мая – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Дзеніскевіч Мікалай Міхайлавіч (1904–1937), дзяржаўны дзеяч Беларусі. З 1926 г. – інструктар Аршанскага абкама КПБ, з 1928 г. – сакратар Асвейскага райкама КПБ, з 1930 г. – інструктар Полацкага акружнога камітэта КПБ, вядучы аргаддзелам Лепельскага райкама КПБ.

9 мая – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Груца Аляксей Пятровіч (1924–2017), беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук (1969), прафесар (1971). Лаўрэат дзяржаўнай прэміі СССР (1971). Ураджэнец в. Пішчыкі Дубровенскага раёна.

9 мая – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Рубанік Васіль Васільевіч, беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай акустыкі, доктар тэхнічных навук (2005), член-карэспандэнт НАН Беларусі. З 1976 г. працаваў у Віцебскім аддзяленні Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, у 1998–2002 гг. – загадчык кафедры фізікі Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта. З 2002 года –дырэктар дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут тэхнічнай акустыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». У 2014 годзе ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Ураджэнец в. Бутава Ушацкага раёна.

13 мая – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Давыдаў Абрам Мардухавіч, вучоны ў галіне тэрапіі, загадчык кафедры Віцебскага медыцынскага інстытута, ураджэнец г. Себежа Віцебскай губерні.

13 мая – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Сакалоўскі Міхаіл Ігнацьевіч, падводнік, военачальнік, віцэ-адмірал (2005), кандыдат тэхнічных навук, член-карэспандэнт Акадэміі ваенных навук. У 1976–2004 гг. – служба на Паўночным флоце, ураджэнец г. Віцебска.

14 мая – 205 гадоў таму (1814) нарадзіўся Касовіч Каятан Андрэевіч (1814–1883), вучоны ў галіне ўсходазнаўства, адзін з першых санскрытолагаў Расіі, ураджэнец г. Полацка.

14 мая – 180 гадоў таму (1839) нарадзіўся Каплінскі Васіль Тэлясфоравіч (1839 – пасля 1883), удзельнік рэвалюцыйнага руху 1860-х гадоў, ураджэнец Докшыцкага раёна.

Аршанскага павета (зараз – Дубровенскі раён).

15 кастрычніка – 75 гадоў таму (1944) быў адкрыты дзіцячы сад пры фабрыцы «КІМ» у г. Віцебску.

16 кастрычніка – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Караткевіч Дзмітрый Андрэевіч (1904–1943), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага антыфашысцкага падполля ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Драздова Талачынскага раёна.

17 кастрычніка – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Бабіна Марыя Паўлаўна, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, тэрапеўт, ветсанэксперт, доктар ветэрынарных навук (2003), прафесар (2011). З 1986 г. – у ВДАВМ (з 2005 г. – загадчык кафедры ветэрынарна-санітарнай экспертызы), ураджэнка г. Турава Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

18 кастрычніка – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Благавешчанскі Аляксей Сяргеевіч (1909–1994), савецкі ваенны дзеяч, Герой Савецкага Саюза (1938), генерал-лейтэнант авіяцыі (1943), удзельнік вызвалення г. Оршы і г. Віцебска ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец г. Брэста.

18 кастрычніка – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Пронька Павел Сяргеевіч, беларускі біяхімік, ураджэнец г. Паставы.

20 кастрычніка – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Мельнічэнка Эдуард Міхайлавіч (1939–2001), вучоны-стаматолаг, доктар медыцынскіх навук

12 кастрычніка – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Пятаў Уладзіслаў Уладзіміравіч, беларускі вучоны ў галіне парашковай металургіі і матэрыялазнаўства машынабудаўнічых матэрыялаў, доктар тэхнічных навук (2005), прафесар (2007). З 1982 г. – у Віцебскім тэхналагічным універсітэце.

13 кастрычніка – 135 гадоў таму (1884) нарадзіўся Пачопка Баляслаў Антонавіч (1884–1940), культурна-асветніцкі і рэлігійны дзеяч, рэдактар і выдавец першай беларускай каталіцкай газеты «Беларус», дырэктар Свіслацкай беларускай настаўніцкай семінарыі, ураджэнец Віцебшчыны.

13 кастрычніка – 20 гадоў таму (1999) заснавана Віцебская рымска-каталіцкая епархія, Віцебская дыяцэзія – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі ў межах Віцебскай вобласці.

14 кастрычніка – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Глушко Міхаіл Фёдаравіч (1944–1998), беларускі мастак, жывапісец, ураджэнец в. Буда Сенненскага раёна.

14 кастрычніка – 55 гадоў таму (1964) нарадзіўся Жук Ігар Леанідавіч, беларускі мастак, ураджэнец г. Оршы.

15 кастрычніка – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Ракіта Сяргей (сапр. Законнікаў Сяргей Васілевіч; 1909–1942), паэт, ураджэнец в. Ліцвінава

14 мая – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Клопаў Анісім Андрэевіч (1914–1995), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец в. Наваселле Ушацкага раёна.

16 мая – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Акулінін Аркадзь Андрэевіч (1909–1986), беларускі вучоны ў галіне анатоміі хатніх жывёл, доктар біялагічных навук (1959), прафесар (1960). У 1947–1969 – загадчык кафедры анатоміі Віцебскага ветэрынарнага сельскагаспадарчага інстытута, ураджэнец с. Вялікая Лазаўка Тамбоўскай вобласці (Расія).

16 мая – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Мурзіч Васіль Іванавіч (1909–1979), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец г. Невеля Віцебскай губерні (зараз Пскоўская вобласць (Расія)). З 1928 г. працаваў у Віцебскім дэпо.

18 мая – 60 гадоў таму (1959) у г. п. Шуміліна адкрыта музычная школа.

19 мая – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Авекаў Іван Аўдзеевіч (1919–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, лётчык, Герой Савецкага Саюза (1943), ураджэнец в. Асінаўка Дубровенскага раёна.

19 мая – 65 гадоў таму (1954) нарадзілася Апіёк Тамара Уладзіміраўна, беларускі вучоны-гісторык, ураджэнка в. Андрыянава Дубровенскага раёна.

21 мая – 80 гадоў таму (1939) нарадзілася Петрачкова Валянціна Цімафееўна, заслужаная артыстка Беларусі (1984). Пасля заканчэння студыі Беларускага тэатра імя Я. Коласа (1958) да 2015 года

працавала ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа. Ураджэнка г. Рудня Смаленскай вобласці (Расія).

22 мая – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук (1993), прафесар (1995), ураджэнец г. Віцебска.

22 мая – 60 гадоў таму (1959) у Лёзна адкрыта дзіцячая музычная школа.

22 мая – 55 гадоў таму (1964) нарадзіўся Пушкін Ігар Аляксандравіч, беларускі вучоны-гісторык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання. Адзін з ініцыятараў, стваральнікаў і першы дырэктар Музея гісторыі горада Магілёва (1992–2001). Ураджэнец г. Оршы.

23 мая – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Бруцкі Анатоль Паўлавіч, журналіст, краязнаўца, у 1982–1989 – рэдактар шумілінскай раённай газеты «Герой працы», у 1990–1994 – прэс-сакратар Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, у 1994–2013 гг. – у апараце Віцебскага аблвыканкама, ураджэнец в. Белавуша Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.

23 мая – 105 гадоў таму (1914) нарадзілася Круганава Ефрасіння Акімаўна (1914–1983), беларускі геабатанік, кандыдат біялагічных навук (1953). Ураджэнка в. Старыя Вайханы Гарадоцкага раёна.

9 кастрычніка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Аксёнаў Аляксандр Нічыпаравіч (1924–2009), дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі. З 1965 г. – 1-ы сакратар Віцебскага абкама КПБ. Ураджэнец в. Кунтараўка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.

10 кастрычніка – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Альхоўскі Мікалай Іванавіч (1909–1978), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец в. Межава Аршанскага раёна.

10 кастрычніка – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Строчка Іван Іванавіч (1919–2001), ваенны дзеяч, Герой Савецкага Саюза (1944). З 1941 г. – у гады Вялікай Айчыннай вайны на Паўднёвым, 1-м і 4-м Украінскім франтах, удзельнік баёў на Паўночным Каўказе, Украіне, Польшчы. Ураджэнец в. Пажарышча Бешанковіцкага раёна.

10 кастрычніка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Вінаградаў Міхаіл Мікалаевіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец в. Таржок Цвярской вобласці.

10 кастрычніка – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Сафроненка Аляксандр Вікенцьевіч, беларускі журналіст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974), ураджэнец в. Рэчыца Полацкага раёна.

4 кастрычніка – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Ласкін Барыс Савельевіч (1914–1983), сцэнарыст, ураджэнец г. Оршы.

6 кастрычніка – 100 гадоў таму (1919) арганізаваны Віцебскі губернскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК).

7 кастрычніка – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Рубанаў Сяргей Фёдаравіч (1914–1987), Герой Сацыялістычнай Працы (1968). заслужаны настаўнік Беларусі (1957), кандыдат педагагічных навук (1969), ураджэнец в. Жабыкі Дубровенскага раёна.

7 кастрычніка – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Халіп Уладзімір Трафімавіч, драматург, мастацтвазнавец, празаік, публіцыст, тэатразнавец, ураджэнец в. Двор Пліна Ушацкага раёна.

7 кастрычніка – 55 гадоў таму (1964) СШ № 43 г. Віцебска прысвоена імя Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова.

8 кастрычніка – 160 гадоў таму (1859) нарадзіўся Брадоўскі Антон Рафаілавіч (1859–1928), калекцыянер, музейны работнік, заснавальнік Віцебскага губернскага музея (зараз – Віцебскі абласны краязнаўчы музей).

8 кастрычніка – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Барадулін Сяргей Дзмітрыевіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

23 мая – 95 гадоў таму (1924) нарадзілася Навумава Соф'я Фадзееўна (1924–2000), беларускі вучоны ў галіне хіміі высокамалекулярных злучэнняў, доктар хімічных навук (1974). Ураджэнка в. Заазер'е Сенненскага раёна.

25 мая – 375 гадоў таму (1644) суддзя земскі браслаўскі Севасцян Святаполк Мірскі заснаваў праваслаўны манастыр у Мёрах.

25 мая – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Пацалуеўскі Аляксандр Пятровіч (1894–1948), мовазнавец, вучоны-цюрколаг, ураджэнец Віцебскай губерні.

26 мая – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Караткоў Аркадзь Цімафеевіч, беларускі архітэктар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984). У 1960–1970 гг. – кіраўнік групы Віцебскага філіяла інстытута «Белдзяржпраект», з 1988 г. – у Наваполацку (з 1990 г. – галоўны архітэктар). Ураджэнец г. Полацка.

27 мая – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Бохан Дзмітрый Мікітавіч (1924–1944), удзельнік Аршанскага антыфашысцкага падполля, ураджэнец в. Падгайшчына Аршанскага раёна.

27 мая – 65 гадоў таму (1954) нарадзілася Цытрон Галіна Станіславаўна, беларускі вучоны ў галіне глебазнаўства, ураджэнка в. Калінаўка Дубровенскага раёна.

27 мая – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Косінец Аляксандр Мікалаевіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, беларускі вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі

Беларусі, ураджэнец в. Роскі Сялец Аршанскага раёна. У 1997–2005 гг. – рэктар Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, у 2005–2008 гг. – намеснік прем'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, у 2008–2014 гг. – старшыня Віцебскага аблвыканкама, у 2014–2016 гг. – глава Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з мая 2017 года – памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

28 мая – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Перхаровіч Франц Іосіфавіч (1894–1961), генерал-лейтэнант (1945), Герой Савецкага Саюза (1945). Удзельнік 1-й Сусветнай і грамадзянскай войнаў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Заляддзе Докшыцкага раёна.

28 мая – 15 гадоў таму (2004) адкрыты Полацкі дзіцячы музей, філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

29 мая – 120 гадоў таму (1899) была заснавана Віцебская льнопрадзільная фабрыка «Дзвіна». Адкрыта 01.09.1900 г. Зараз – ААТ «Віцебскія дываны».

29 мая – 80 гадоў таму (1939) нарадзілася Максімава Ларыса Паўлаўна, беларуская піяністка, заслужаная артыстка Беларусі (1982). Ураджэнка г. Віцебска.

29 мая – 80 гадоў таму (1939) нарадзілася Пісарава Людміла Іванаўна (1939–2011), заслужаная артыстка Беларусі (1976). Закончыла студыю пры Беларускім тэатры імя Я. Коласа (1964), у 1964–2004 гг. працавала ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя

Віцебскім філіяле Міжнароднага інстытута сацыяльных і працоўных адносін (1997–1998), у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава (1998–2009). У 2009–2012 гг. – дырэктар Віцебскага філіяла Міжнароднага інстытута сацыяльных і працоўных адносін. У 2013–2014 гг. – у Пскоўскім дзяржаўным універсітэце. З 2015 – у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава, з 2016 – дэкан гістарычнага факультэта.

2 кастрычніка – 85 гадоў таму (1934) нарадзілася Чарняўская Тамара Ігнацьеўна, беларускі гісторык архітэктуры. Аўтар даследаванняў па гістарычнай планіроўцы і забудове Віцебска, помнікаў архітэктуры Беларусі: «Архитектура Витебска» (1980). Дзяржаўная прэмія Беларусі (1990) за кнігу «Свод памятников истории и культуры Белоруссии».

3 кастрычніка – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Летнікаў Фелікс Арцем'евіч, расійскі вучоны ў галіне геалогіі і геахіміі, заснавальнік навуковай школы па флюідным рэжыме літасферы і геаэнергетыцы геалагічных працэсаў, сінергетыкі геалагічных сістэм, акадэмік Расійскай АН, ураджэнец г. Полацка.

вайну (1941–1944) – у эвакуацыі, з 1942 г. – тэхнікум чыгуначнага транспарту, з 2008 г. – Аршанскі дзяржаўны каледж чыгуначнага транспарту Беларускай чыгункі. Сучасная назва – Аршанскі каледж – філіял установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту».

80 гадоў таму (1939) у г. Браславе пачала выдавацца раённая газета «Звязда». У 1941–1944 гг. – «Смерть фашизму» (друкавалася пры штабе партызанскай брыгады імя Жукава), з 1963 г. – «Браслаўская звязда».

50 гадоў таму (1969) у Верхнядзвінску была адкрыта дзіцячая музычная школа.

20 гадоў таму (1999) у г. Наваполацку на базе спартыўнага клуба «Вымяральнік» (дзейнічаў з 1990 г.) заснавана СДЮШАР «Алімп» ААТ «Вымяральнік». З жніўня 2009 г. – сучасная назва.

1 кастрычніка – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Юрчанка Трафім Пятровіч, прафсаюзны і партыйны дзеяч. У 1949–1952 гг. – 2-і сакратар Віцебскага абкама КП(б)Б. Ураджэнец с. Гупалаўка Катоўскага раёна Днепрапятроўскай вобласці (Украіна).

1 кастрычніка – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Абазоўскі Канстанцін Антонавіч (1919–1944), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944), лётчык-штурмавік, ураджэнец в. Абухова Бешанковіцкага раёна.

1 кастрычніка – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Космач Веньямін Аркадзьевіч, беларускі вучоны–гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар. Працаваў ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце (1985–1997), у

Я. Коласа. Узнагароджана ордэнам Францыска Скарыны (2002). Ураджэнка г. п. Руба Віцебскага раёна.

30 мая – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Гаранскі Георгій Кірылавіч (1909–2002), галоўны архітэктар Оршы, аўтар Кургана Бессмяротнасці, адзін з аўтараў помніка «Кацюша», ураджэнец г. Оршы.

100 гадоў таму (1919) адбылася Першая справаздачная выстава Віцебскага мастацкага вычылішча.

75 гадоў таму (1944) была здзейснена Віцебска-Аршанская аперацыя 1944 – наступальная аперацыя войскаў 1-га Прыбалтыйскага (генерал арміі І. Х. Баграмян) і 3-га Беларускага (генерал арміі І. Д. Чарняхоўскі) франтоў у Вялікую Айчынную вайну, састаўная частка Беларускай наступальнай аперацыі 1944 г. «Баграціён».

30 гадоў таму (1989) адбыўся першы конкурс «Віцебская прыгажуня», у якім перамагла Марыя Кежа – будучая Міс СССР-1990.

1 чэрвеня – 130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Палонік Нікіфар Іванавіч (1889–?), прафсаюзны і гаспадарчы работнік. З сярэдзіны 1920 гг. на савецкай і гаспадарчай працы. Ураджэнец в. Селішча Барысаўскага раёна Мінскай вобласці.

2 чэрвеня – 80 гадоў таму (1939) адкрылася карцінная галерэя Ю. М. Пэна. Дзейнічала да ліпеня 1941 г.

3 чэрвеня – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Кудраеў Уладзімір Георгіевіч (1899–1963), прафсаюзны, дзяржаўны

і партыйны дзеяч Беларусі. З 1943 г. – 1-ы сакратар Беластоцкага, з 1944 г. – Віцебскага абкамаў КП(б)Б. Ураджэнец г. Рагачоў Гомельскай вобласці.

5 чэрвеня – 165 гадоў таму (1854) нарадзіўся Пэн Юдаль (Іегуда) Маісеевіч (1854–1937), жывапісец, педагог, заснавальнік Віцебскай школы-майстэрні. З 1891 г. жыў у Віцебску, з 1919 г. – кіраўнік майстэрні Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, у 1923–1926 гг. выкладаў у навучальных установах г. Віцебска. Ураджэнец г. Новааляксандраўск (зараз г. Зарасай, Літва).

5 чэрвеня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Анісенка Валерый Данілавіч, беларускі акцёр, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2002), прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2005), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2011), кавалер ордэна Ф. Скарыны. У 1965–1977 гг. – акцёр беларускіх тэатраў імя Я. Коласа і Я. Купалы. У 2012–2017 гг. – мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Ураджэнец г. Талачына.

6 чэрвеня – 120 гадоў таму (1899) заснавана Аршанская цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. С. Пушкіна як публічная бібліятэка. У Вялікую Айчынную вайну – знішчана, у 1944 г. – адноўлена, з 1959 г. – у спецыяльна пабудаваным будынку.

педагог. Заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі (1923), у 1921–1923 гг. працаваў у Віцебску (выкладаў у народнай кансерваторыі, з 1922 г. – у музыкальным тэхнікуме). Ураджэнец г. Санкт-Пецярбурга.

28 верасня – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Анішчык (Гутар) Ганна Анфімаўна, беларускі мастак, ураджэнка в. Кулакова Пастаўскага раёна.

30 верасня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Рылаў Валерый Дзмітрыевіч (1919–1944), Герой Савецкага Саюза (1944). Камандзір аддзялення роты сувязі адным з першых 24.06.1944 г. пад агнём праціўніка на плыце і ўплаў пераправіўся цераз р. Заходняя Дзвіна каля в. Буй Бешанковіцкага раёна і ўстанавіў сувязь камандавання палка з яго ўдарнай групай, ураджэнец г. Яранска Кіраўскай вобласці (Расія).

125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Мышалаў Саламон Мееравіч, прафсаюзны і партыйны дзеяч, з 1930 г. – адказны сакратар Лепельскага райкама КП(б)Б, з 1934 г. – сакратар, 1-ы сакратар Дубровенскага райкама КП(б)Б, ураджэнец в. Амельна Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

90 гадоў таму (1929) заснаваны Аршанскі эксплуатацыйны тэхнікум на базе школы фабрычна-завадскога навучання, якая рыхтавала памочнікаў машыністаў і дзяжурных па станцыі. У Вялікую Айчынную

г. Полацку, пры якім адкрыў школу і бібліятэку. З 1660 г. – архімандрыт полацкага Барысаглебскага манастыра. Ураджэнец г. Магілёва.

26 верасня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Чарнышэнка Іосіф Дзмітрыевіч (1924–1995), беларускі вучоны ў галіне педагогікі, доктар педагагічных навук, прафесар (1978), заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі (1984). З 1966 г. працаваў у Віцебскім педагагічным інстытуце (ВДУ імя П. М. Машэрава). Ураджэнец с. Кавалёўка Кіеўскай вобласці (Украіна).

27 верасня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Савіцкі Валянцін Мікалаевіч (1919–2006), беларускі жывапісец, ураджэнец в. Звянячы Талачынскага раёна.

27 верасня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Сіпараў Іосіф Мікітавіч (1924–1994), беларускі вучоны ў галіне хірургіі і анкалогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар (1975). З 1963 г. – хірург Віцебскага абласнога аддзела аховы здароўя, з 1966 г. працаваў у Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Ураджэнец в. Задарожжа Сенненскага раёна.

28 верасня – 190 гадоў таму (1829) нарадзіўся Кусцінскі Міхаіл Францавіч (1829–1905), археолаг, калекцыянер, краязнавец. У 1850–1890 гг. упершыню на Беларусі пачаў фатаграфаваць працэс раскопак і складаць фотатэку помнікаў старажытнасцей Віцебскай і суседніх губерняў, ураджэнец в. Завідзічы Лепельскага раёна.

28 верасня – 150 гадоў таму (1869) нарадзіўся Дубасаў Мікалай Аляксандравіч (1869–1935), рускі піяніст,

7 чэрвеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Філацьеў Іван Андрэевіч (1909–1944), Герой Савецкага Саюза (1944). Памочнік камандзіра ўзвода малодшы сяржант вызначыўся ў баі пры вызваленні тэрыторыі Віцебскай вобласці, ураджэнец с. Лознае Валгаградскай вобласці.

7 чэрвеня – 100 гадоў таму (1919) створаны губернскі прафсаюз пажарных.

7 чэрвеня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Скарынкін Уладзімір Максімавіч, паэт, перакладчык, лаўрэат Нацыянальнай прэміі Італіі (1998), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы (2000), рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты купідон» (2012), ураджэнец г. Віцебска.

8 чэрвеня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Максімаў Фёдар Лазаравіч (1914–2006), беларускі народны майстар у галіне драўлянай скульптуры і жывапісу, ураджэнец в. Каралі (Каралёва) Віцебскага раёна.

8 чэрвеня – 25 гадоў таму (1994) фабрыка мастацкіх вырабаў у Верхнядзвінску была ператворана ў АТ «МІЛА».

9 чэрвеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Міт Сяргей Міхайлавіч (1909–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза (1945). Камандзір танкавага ўзвода лейтэнант захапіў з экіпажам пераправу на р. Адроў каля в. Засеклі Аршанскага раёна (1944). Ураджэнец в. Чарняцова Наўгародскай вобласці (Расія).

11 чэрвеня – 100 гадоў таму (1919) у Віцебску знаходзіўся з агітцягнікам «Кастрычніцкая рэвалюцыя» старшыня УЦВК Міхаіл Іванавіч Калінін.

12 чэрвеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзілася Румянцава Зоя Міхайлаўна, прафсаюзны дзеяч. Працавала загадчыкам аддзела Браслаўскага райкама ЛКСМБ. Ураджэнка г. Мінска.

12 чэрвеня – 55 гадоў таму (1964) нарадзіўся Багніч Сяргей Анатольевіч, беларускі вучоны ў галіне спектраскапіі арганічных злучэнняў, ураджэнец г. Гарадка.

13 чэрвеня – 185 гадоў таму (1834) нарадзіўся Вераніцын Канстанцін Васільевіч (сапр. Васільеў; 1834–1904), літаратар, магчымы аўтар паэмы «Тарас на Парнасе», ураджэнец в. Астраўляны Гарадоцкага раёна.

13 чэрвеня – 110 гадоў таму (1909) створана Віцебская вучоная архіўная камісія (1909–1919) – гістарычнае таварыства, якое займалася збіраннем архіўных, фальклорна-этнаграфічных і археалагічных матэрыялаў.

14 чэрвеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Кавалёў Іван Аляксандравіч (1909–1998), доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнец в. Аралава Полацкага раёна.

15 чэрвеня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Басулаеў Анатоль Фядотавіч (1904–1964), расійскі мастак тэатра, галоўны мастак Беларускага другога дзяржаўнага тэатра ў г. Віцебску (1934–1938).

15 чэрвеня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Бандарэнка Уладзімір Карпавіч (1939–2001), педагог, краязнаўца. З 1995 г. жыў у г. п. Лёзна, даследаваў паданні

21 верасня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Раманоўскі Пётр Міхайлавіч (1919–1977), беларускі мастак, ураджэнец г. Оршы.

21 верасня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Цюцюнаў Анатоль Дзмітрыевіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі. Ураджэнец в. Бяленева Сенненскага раёна.

22 верасня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Домнін Уладзімір Іванавіч, контр-адмірал, ураджэнец г. Паставы.

23 верасня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Вольскі Артур Віталевіч (сапр. Вольскі-Зэйдэль; 1924–2002), паэт, драматург. У 1938–1941 гг. вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы.

24 верасня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Пецюкевіч Мар'ян Язэпавіч (1904–1983), беларускі этнограф, актыўны дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху перыяду Заходняй Беларусі, ураджэнец в. Цяцеркі Браслаўскага раёна.

25 верасня – 65 гадоў таму (1954) нарадзілася Мельнікава Зоя Пятроўна, беларускі літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук (2004), прафесар. Працуе ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна. Ураджэнка в. Навасёлкі Докшыцкага раёна.

25 верасня – 60 гадоў таму (1959) пачалося будаўніцтва Полацкай ЦЭЦ для нафтаперапрацоўчага завода. Зараз – Наваполацкая цеплаэлектрацэнтраль.

26 верасня – 400 гадоў таму (1619) нарадзіўся Іяўлевіч (Яўлевіч) Ігнацій (1619–1686), беларускі педагог, пісьменнік, грамадскі і царкоўны дзеяч. З 1655 г. – ігумен Богаяўленскага манастыра ў

20 верасня – 275 гадоў таму (1744) нарадзіўся Кварэнгі Джакама (1744–1817), італьянскі архітэктар. У Полацку паводле яго праекта (1782) пабудаваны Полацкі Богаяўленскі манастыр-царква і 2-павярховы жылы корпус (келлі манахаў). Ураджэнец Вале-Іманья каля г. Бергама ў Ламбардыі (Італія).

20 верасня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Тапівалдзіеў Мамадалі (1919–1969), удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай абласцей у Вялікую Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза (1944). Узнагароджаны медалём «Залатая Зорка» (1944), ордэнам Леніна (1944), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі і інш. Ураджэнец кішлака Пандыган Ферганскай вобл. (Узбекістан).

20 верасня – 75 гадоў таму (1944) створана Полацкая вобласць – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР. Існавала да 08.01.1954 г. (раёны, якія раней уваходзілі ў Віцебскую вобласць, былі зноў уключаны ў яе склад, астатнія былі перададзены ў Маладзечанскую вобласць).

20 верасня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Барсукоў Ігар Аляксеевіч, беларускі фотамастак. З 1981 г. – выкладчык і фатограф Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, член Беларускага саюза дызайнераў (2000). Ураджэнец г. Віцебска.

роднага краю, цікавіўся тэмай «Яўрэі на Лёзненшчыне».

16 чэрвеня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Тоўкач Анатоль Іларыёнавіч (1929–2004), беларускі жывапісец. З 1956 г. працаваў на Віцебскім камбінаце «Мастацтва». Ураджэнец в. Засялечча Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

19 чэрвеня – 100 гадоў таму (1919) у Віцебску прайшоў першы на Беларусі камуністычны суботнік.

19 чэрвеня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Быкаў Васіль Уладзіміравіч (1924–2003), беларускі пісьменнік, празаік, драматург, публіцыст, грамадскі дзеяч, народны пісьменнік Беларусі (1980), Герой Сацыялістычнай Працы (1984). Ураджэнец в. Бычкі Ушацкага раёна.

19 чэрвеня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Гяноў Уладзімір Мікалаевіч, беларускі спартсмен і трэнер (вадналыжны спорт), майстар спорту (1974), суддзя всесаюзнай катэгорыі (1980), заслужаны трэнер Беларусі (1989). З 1976 г. – трэнер-выкладчык Наваполацкай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву па вадналыжным спорце імя М. Л. Гянова.

20 чэрвеня – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Сяргейчык Цімафей Мікалаевіч (1899–1977), акцёр, народны артыст Беларусі. У 1926–1975 гг. працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

20 чэрвеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Кандрацьеў Пётр Васільевіч (1909–1943), удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 і Вялікай

Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1940), ураджэнец г. Віцебска.

20 чэрвеня – 60 гадоў таму (1959) заснавана турысцка-аздараўленчае прыватнае даччынае УП «Браслаўскія азёры» як турбаза. З 1989 г. – турысцка-экскурсійны, з 1996 г. – турысцка-аздараўленчы комплекс, з 2002 г. – у ведамстве турысцка-экскурсійнага УП «Беларустурыст».

21 чэрвеня – 155 гадоў таму (1864) нарадзіўся Глебаў Іван Аляксандравіч (1864 – пасля 1917), беларускі гісторык, педагог, ураджэнец г. Віцебска.

22 чэрвеня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Полазаў Канстанцін Мікалаевіч (1914–1977), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец. г. Віцебска.

23 чэрвеня – 100 гадоў таму (1919) арганізаваны Віцебскі губернскі аддзел Усерасійскага прафсаюза работнікаў мастацтва.

23 чэрвеня – 75 гадоў таму (1944) пачалася Беларуская аперацыя (23.06.–29.08.1944), адна з найбуйнейшых наступальных аперацый Савецкай Арміі ў Вялікую Айчынную вайну (кодавая назва «Баграціён»).

23 чэрвеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзілася Алпеева Тамара Міхайлаўна, беларускі філосаф, культуролаг, ураджэнка г. Лепеля.

23 чэрвеня – 35 гадоў таму (1984) адкрыты музей працоўнай і баявой славы пасёлка Асінторф Дубровенскага раёна.

24 чэрвеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзілася Яфімцава Алена Пятроўна (1934–1977), беларускі вучоны ў

17 верасня – 80 гадоў таму (1939) адбылося аб'яднанне заходніх раёнаў Віцебшчыны з Савецкай Віцебшчынай.

18 верасня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Стулаў Іван Андрэевіч (1904–1964). З 1938 г. – першы сакратар Віцебскага абкама КП(б)Б. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Ураджэнец в. Шамбова Валагодскай вобласці (Расія).

18 верасня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Матыль Іван Аляксандравіч (1914–1961), журналіст, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Дуброўскія Талачынскага раёна.

18 верасня – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Чубанаў Канстанцін Дзмітрыевіч, вучоны ў галіне экалогіі і лесазнаўства, ураджэнец г. Віцебска.

19 верасня – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Абрамава Іна Аляксандраўна, краязнаўца, гісторык, музейны работнік, старшы захавальнік фондаў цэнтра культурна-выхаваўчай работы УУС Віцебскага аблвыканкама. Аўтар-складальнік кніг «Витебская губернская милиция, (1917–1924 гг.)», «Витебская милиция, (1924–1938 гг.)», «Всегда на посту. 100 лет витебской милиции». Ураджэнка г. Каменка-Бугская Львоўскай вобласці.

14 верасня – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Сухарукаў Аляксей Васільевіч, музейны работнік, краязнаўца, загадчык Музея-сядзібы І. Я. Рэпіна «Здраўнёва», ураджэнец в. Шмані Гарадоцкага раёна.

16 верасня – 115 гадоў таму (1904) нарадзілася Кашэльнікава Раіса Мікалаеўна (1904–1980), беларуская актрыса. народная артыстка Беларусі (1957). Працавала ў Беларускім другім дзяржаўным тэатры ў г. Віцебску. Ураджэнка в. Баршчоўка Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці.

17 верасня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Ханяк Анатоль Сямёнавіч, педагог, краязнаўца. Кулямётчык, палітрук узвода партызанскага атрада ў Вялікую Айчынную вайну (1942–1944), намеснік дырэктара Лепельскай школы-інтэрната (1946–1961), намеснік старшыні Лепельскага райвыканкама (1961–1966), старшыня Лепельскага раённага камітэту раённага кантролю (1966–1979), дырэктар Лепельскага раённага краязнаўчага музея (1980–1983), Ганаровы грамадзянін г. Лепеля, ураджэнец в. Замошша Лепельскага павета Віцебскай губерні (зараз – Лепельскі раён).

17 верасня – 95 гадоў таму (1924) нарадзілася Клачкова Валянціна Аляксееўна, удзельніца партызанскага руху на Ушаччыне, партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі.

галіне біяхіміі. Працавала ў Віцебскім медыцынскім інстытуце.

25 чэрвеня – 95 гадоў таму (1924) нарадзілася Тамашова Лілія Фёдараўна (1924–2016), літаратуразнаўца, педагог, дзякуючы якому ў школьную праграму трапілі творы Васіля Быкава. Ураджэнка в. Цеплякі Сенненскага раёна.

25 чэрвеня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Кірпічнікаў Анатоль Мікалаевіч, расійскі археолаг, гісторык. Доктар гістарычных навук (1975), прафесар (1991), заслужаны дзеяч навукі Расійскай федэрацыі (1991). У 1950–1960 гг. у складзе архітэктурна–археалагічнай экспедыцыі М. К. Каргера ўдзельнічаў у раскопках помнікаў архітэктуры XII ст. у г. Полацку. Ураджэнец г. Санкт-Пецярбурга.

25 чэрвеня – 75 гадоў таму (1944) пры вызваленні Віцебшчыны здзейсніў подзвіг Юрый Васілевіч Смірноў (1925–1944), Герой Савецкага Саюза.

26 чэрвеня – 170 гадоў таму (1849) нарадзіўся Плюшчэўскі-Плюшчык Уладзімір Аляксеевіч (1849–1926), беларускі энтамолаг. Жыў і працаваў у г. Віцебску.

26 чэрвеня – 75 гадоў таму (1944) Віцебск вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

26 чэрвеня – 75 гадоў таму (1944) Дубровеншчына вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

26 чэрвеня – 45 гадоў таму (1974) у Віцебску адкрыты помнік воінам Савецкай Арміі, партызанам і падпольшчыкам Беларусі.

27 чэрвеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Знаёмы Сяргей (сапр. Клопаў Сяргей Змітравіч; 1909–1937?), пісьменнік, ураджэнец в. Звонь Ушацкага раёна.

27 чэрвеня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Эльперын Ісаак Тавелевіч, вучоны ў галіне цепламасаабмену, ураджэнец г. Дзвінска Віцебскай губерні.

27 чэрвеня – 75 гадоў таму (1944) Орша вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

27 чэрвеня – 70 гадоў таму (1949) наразіўся Хвастоў Міхаіл Міхайлавіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, дыпламат, ураджэнец в. Казлоўшчына Пастаўскага раёна.

28 чэрвеня – 135 гадоў таму (1884) нарадзілася Нікановіч-Сахарава Вольга Фёдараўна (1884–1943), беларуская пісьменніца, педагог, фалькларыстка, ураджэнка в. Казаноўка Чашніцкага раёна.

28 чэрвеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзілася Караткевіч Валянціна Браніславаўна (1934–1983), беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук (1965). Аўтар працы «Помнікі гісторыі Віцебска» (1975), ураджэнка с. Белаводскае (Кыргызстан).

28 чэрвеня – 75 гадоў таму (1944) Лепельскі раён вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

29 чэрвеня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Левін Барыс Міхайлавіч (1914–1990), беларускі акцёр, заслужаны артыст Беларусі (1967). З 1931 г. працаваў у Віцебскім тэатры рабочай моладзі, у 1938–1983 гг. – у Беларускім тэатры імя Я. Коласа, ураджэнец г. Віцебска.

10 верасня – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Варэйкіс Іосіф Міхайлавіч (1894–1939), партыйны і дзяржаўны дзеяч, у 1920–1921 гг. – старшыня Віцебскага губвыканкама.

12 верасня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Матукоўскі Мікалай Ягоравіч (1929–2001), беларускі драматург, журналіст, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат прэміі Саюза журналістаў СССР (1984), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988), ураджэнец в. Калюціна Расонскага раёна.

13 верасня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Ляўданскі Эдуард Ігнатавіч, вучоны ў галіне хімічнай тэхналогіі і тэхнікі, доктар тэхнічных навук (1990), прафесар (1990). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976), ураджэнец в. Верацеі Докшыцкага раёна.

13 верасня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Мемус Аляксандр Іосіфавіч, віцебскі мастак, краязнаўца, у 1974–1999 гг. выкладаў у Віцебскім дзяржаўным універсітэце. Ураджэнец в. Прусы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці.

13 верасня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Лабанок Алесь Іванавіч (1944–2005), акцёр, заслужаны артыст Беларусі (1996). У 1969–2005 гг. працаваў у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа. Ураджэнец г. Мар’іна Горка Мінскай вобласці.

Талачынскага раёна (1953–1979), ураджэнка в. Вугалеўшчына Талачынскага раёна.

7 верасня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Асіпенка Алесь (сапр. Аляксандр Харытонавіч; 1919–1994), беларускі пісьменнік, сцэнарыст, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1974), лаўрэат літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1981), ураджэнец в. Пушкары Віцебскага раёна.

7 верасня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Марчанка Валерый Рыгоравіч, пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, гвардыі падпалкоўнік у адстаўцы. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Чырвонай Зоркі Рэспублікі Афганістан, 26 медалямі.

8 верасня – 505 гадоў таму (1514) пад Оршай адбылася Аршанская бітва 1514 паміж войскамі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы.

9 верасня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Янкоўскі Іван Дзмітрыевіч (1924–2009), Герой Сацыялістычнай Працы (1966). У гады Вялікай Айчыннай вайны удзельнічаў у партызанскім руху. Ураджэнец в. Забаенне Лепельскага раёна.

9 верасня – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Міксюк Святлана Фёдараўна, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук (2003), з 1992 г. працуе ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Ураджэнка г. Віцебска.

29 чэрвеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Градаў Юрый Міхайлавіч, заслужаны архітэктар Беларусі (1979), аўтар мемарыяльных комплексаў «Кацюша» ў Оршы, «Прарыў» ва Ушацкім раёне, «Праклён фашызму» ў Докшыцкім раёне.

29 чэрвеня – 75 гадоў таму (1944) Ушацкі раён быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

29 чэрвеня – 75 гадоў таму (1944) пачалася Полацкая аперацыя 1944 (29.06.–04.07.1944), наступальная аперацыя войскаў 1-га Прыбалтыйскага фронту (генерал арміі І. Х. Баграмян) у Вялікую Айчынную вайну.

30 чэрвеня – 45 гадоў таму (1974) ва Ушацкім раёне адкрыты мемарыяльны комплекс «Прарыў» у гонар прарыва партызанамі варожай блакады (05.05.1944) падчас Полацка-Лепельскай бітвы ў Вялікую Айчынную вайну.

95 гадоў таму (1924) створана Аршанскае акруговае краязнаўчае таварыства.

75 гадоў таму (1944) у г. Докшыцы была заснавана хата-чытальня. У 1945 г. перайменавана ў раённую бібліятэку, з 1977 г. – Докшыцкая цэнтральная раённая бібліятэка.

75 гадоў таму (1944) за прарыў Віцебскага ўмацаванага раёна і вызваленне г. Віцебска ў ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі ў Вялікую Айчынную вайну 62 злучэнні і часткі 39-й, 43-й, 1-й паветранай арміі 3-га Беларускага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў атрымалі найменне «Віцебскія злучэнні і часткі».

1 ліпеня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Юркін Барыс Іванавіч (1919–1944), Герой Савецкага Саюза (1945). Камандзір аддзялення стралковага палка ў ноч на 26.06.1944 г. з аддзяленнем пераправіўся праз Заходнюю Дзвіну ў раёне г. п. Ула Бешанковіцкага раёна і знішчыў гранатай варожы дзот, ураджэнец г. Арэнбурга (Расія).

1 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) Бягомльскі і Докшыцкі раёны вызвалены ад намецка-фашысцкіх захопнікаў у ходзе Мінскай і Полацкай аперацыі 3-га Беларускага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў ва ўзаемадзеянні з патрызанамі брагады «Жалязняк».

1 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) Шаркаўшчына была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

1 ліпеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзілася Цяпкова Таццяна Канстанцінаўна, беларуская фалькларыстка, ураджэнка в. Малое Кашо Гарадоцкага раёна.

2 ліпеня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Серыкаў Іван Арцёмавіч (1919–1997), танцоўшчык, балетмайстар, педагог, рэжысёр, збіральнік харэаграфічнай спадчыны беларусаў. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1968), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1962 г. – мастацкі кіраўнік і балетмайстар Віцебскага народнага ансамбля песні і танца «Маладосць» Палаца культуры ўпраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва. У 1989–1997 гг. – балетмайстар Віцебскага абласнога навуковага метадычнага

грамадскага аб'яднання «Фотамастацтва». Член Беларускага саюза дызайнераў.

3 верасня – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Джумантаева Тамара Аляксандраўна, музейны работнік, краязнаўца. Кандыдат культуралогіі, дацент кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дырэктар Нацыянальнага Полоцкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Ураджэнка г. Полацка.

3 верасня – 90 гадоў таму (1929) нарадзілася Іванюта Ганна Логвінаўна (1929–2008), Герой Сацыялістычнай Працы, звеннявая льнаводчага звяна калгаса «Расія» (з 1970 г. – калгас імя Леніна) Талачынскага раёна.

4 верасня – 160 гадоў таму (1859) нарадзіўся Эпімах-Шыпіла Браніслаў Ігнатавіч (1859–1934), дзеяч беларускай культуры, выдавец, фалькларыст, мовазнавец, літаратуразнавец, правадзейны член Інбелкульта, ураджэнец фальварка Будзькаўшчына Полацкага раёна.

4 верасня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Дамашкевіч Мікалай Фёдаравіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, старшыня Сенненскага райвыканкама (1984–1985), 1-ы сакратар Сенненскага райкама КПБ (1985–1991).

5 верасня – 95 гадоў таму (1924) нарадзілася Кароткая Валянціна Пракопаўна, Герой Сацыялістычнай Працы, былая звеннявая калгаса «XVIII партз'езд»

95 гадоў таму (1924) у г. Віцебску пачала выходзіць газета «История военно-революционного комитета города Витебска». У розныя гады называлася «Заря Запада», «Віцебскі пралетарый», «Віцебскі рабочы».

80 гадоў таму (1939) пачала выходзіць у друк раённая газета «Новы шлях» у г. Паставы. У розныя гады выходзіла пад назвамі «За Победу», «Савецкі шлях», «Звязда». З 1991 г. – «Пастаўскі край».

80 гадоў таму (1939) у Глыбокім пачала выдавацца раённая газета «За свабоднае жыццё», «Сцяг камунізму», «Шлях перамогі». З 1991 г. – «Веснік Глыбоччыны».

15 гадоў таму (2004) у Віцебску заснавана Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа першаснай арганізацыі прафсаюза рабочых Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

15 гадоў таму (2004) заснаваны ў г. Дуброўна Дубровенскі раённы Дом рамёстваў.

1 верасня – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Даркевіч Уладзіслаў Пятровіч (1934–2016), беларускі археолаг, гісторык, доктар гістарычных навук, ураджэнец г. Віцебска.

1 верасня – 60 гадоў таму (1959) была адкрыта вячэрняя музычная школа ў Віцебску.

1 верасня – 60 гадоў таму (1959) у Чашніках адкрылася музычная школа.

2 верасня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Бранштэтар Павел Леанідавіч, беларускі фотамастак, ураджэнец в. Максімаўка Гарадоцкага раёна. У 1984–2001 гг. – фатограф у інстытуце «Віцебксельбудпраект», з 2004 г. – выкладчык кафедры дызайну Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Член беларускага

Цэнтра народнай творчасці. Ураджэнец в. Норкі Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

3 ліпеня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Караткевіч Уладзімір Аляксандравіч (1939–1999), беларускі рэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі(1997). У 1961–1964 гг. – у Беларускім тэатры імя Я. Коласа. Ураджэнец г. Чачэрска Гомельскай вобласці.

3 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Швальбо Уладзімір Ільіч (1944), спартыўны педагог, заслужаны трэнер СССР і Беларусі, майстар спорту СССР. Ганаровы грамадзянін Віцебска, ураджэнец г. Віцебска.

3 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) Браслаўскі раён вызвалены ад нямецка-фашыстскіх захопнікаў.

3 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) Беларусь вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

3 ліпеня – 30 гадоў таму (1989) быў адкрыты санаторый-прафілакторый «Лясное» ў в. Дамашкавічы Докшыцкага раёна, з 2006 г. – санаторый КДБ.

4 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) Мёры вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

4 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) Полацк вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

4 ліпеня – 25 гадоў таму (1994) адкрыты для наведвальнікаў Міёрскі гісторыка-этнаграфічны музей, дзяржаўная ўстанова культуры.

5 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) (1944) Паставы вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

5 ліпеня – 50 гадоў таму (1969) быў адкрыты Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова.

6 ліпеня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Рабцаў Ілья Мікалаевіч (1904–1963), заслужаны будаўнік Беларусі (1962), у 1939–1941 гг. – старшыня Віцебскага аблвыканкама, у сакавіку–верасні 1942 г. – член Віцебскага падпольнага абкама КП(б) Беларусі. Ураджэнец в. Задарожжа Горацкага раёна Магілёўскай вобласці.

6 ліпеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Вярхоўскі Сяргей Барысавіч (1909–1963), ваенны марак, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, контр-адмірал (1944), ураджэнец в. Ільіно Віцебскага раёна.

6 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) часцямі 29–ай стралковай дывізіі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вызвалены г. п. Друя Браслаўскага раёна.

6 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) загадам ВГК удастоены ганаровага наймення «Аршанскія» 41 злучэнні і частка 11-й гвардзейскай, 31-й и 1-й паветранай арміі 3-га Беларускага фронту за вызваленне г. Оршы (27.06.1944) у ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі.

6 ліпеня – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Казак Іван Уладзіміравіч, беларускі мастак, скульптар, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец г. п. Бешанковічы.

7 ліпеня – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Лісаў Аляксандр Генадзевіч, гісторык, кандыдат мастацтвазнаўства (1998), дактарант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, педагог,

29 жніўня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Вальноў Уладзімір Мікалаевіч, беларускі графік, жывапісец, ураджэнец в. Гародна Бешанковіцкага раёна.

29 жніўня – 65 гадоў таму (1954) нарадзілася Лысенка Ірына Міхайлаўна, вучоны ў галіне педыятрыі, доктар медыцынскіх навук, ураджэнка г. Віцебска.

30 жніўня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Шаура Рыгор Фёдаравіч, беларускі мастацтвазнавец, мастак, педагог, доктар мастацтвазнаўства (1996), прафесар (1997). Лаўрэат Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2001). Ураджэнец в. Малы Поўсвіж Лепельскага раёна.

31 жніўня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Лукашэнка Аляксандр Рыгоравіч, палітычны дзеяч. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Ураджэнец г. п. Копысь Аршанскага раёна.

31 жніўня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Мартаў Юрый Барысавіч (1944–2007), беларускі вучоны ў галіне хірургіі. З 1972 г. – працаваў у Віцебскім медыцынскім інстытуце, з 2002 г. – у клінічнай бальніцы хуткай дапамогі г. Віцебска.

Верасень

105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Жалязняк Рыгор Самуілавіч (1914–1942), паэт, ураджэнец г. Віцебска.

100 гадоў таму (1919) заснавана Бешанковіцкая цэнтральная раённая бібліятэка ў доме купца Раппапорта.

23 жніўня – 145 гадоў таму (1874) нарадзіўся Вольферц Валерыян Юльевіч (1874–1946), ветэрынарна-санітарны эксперт, доктар ветэрынарных навук (1939), прафесар (1934). З 1927 г. – загадчык кафедры ветэрынарна-санітарнай экспертызы Віцебскага ветэрынарнага інстытута, ураджэнец г. Чыстапаль (Татарстан).

24 жніўня – 100 гадоў таму (1919) у Віцебску адбыўся першы губернскі з'езд работнікаў мастацтва.

25 жніўня – 70 гадоў таму (1949) нарадзілася Мальчэўская Яўгенія Еўдакімаўна (1949–2008), паэтка, ураджэнка в. Замошша Чашніцкага раёна.

28 жніўня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Мінін Аляксандр Аляксандравіч (1924–2002), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1945). У 1942–1943 гг. – разведчык 3-й Беларускай партызанскай брыгады, з лістапада 1943 г. – на фронце. Ураджэнец в. Арлея Полацкага раёна.

28 жніўня – 70 гадоў таму (1949) нарадзілася Петрык Ларыса Леанідаўна, беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), заслужаны майстар спорту, чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў (1968), чэмпіёнка міра, прызёр чэмпіяната Еўропы. З 1955 г. жыла ў Віцебску.

28 жніўня – 45 гадоў таму (1974) Віцебск быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

29 жніўня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Ціхановіч Валянцін Мікалаевіч (1909–1978), мастак, адзін з пачынальнікаў анімалістычнага жанру ў беларускай графіцы. У 1933 г. скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум.

член Беларускага Саюза мастакоў (2014), з 1986 г. працаваў у ВДУ імя П. М. Машэрава, з 1992 г. – выкладчык, з 1999 г. – дацэнт на кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры, з 2017 г. – дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі ВДАВМ. Ураджэнец г. Шчучын Гродзенскай вобласці.

7 ліпеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Вашук Уладзімір Васільевіч, беларускі хімік, доктар хімічных навук (2001). Аўтар навуковых работ па хіміі цвёрдага цела. Ураджэнец в. Весялова Лепельскага раёна.

8 ліпеня – 175 гадоў таму (1844) нарадзіўся Кірпічоў Канстанцін Львовіч (1844–1910), інжынер-генерал, прафесар. Паходзіў з полацкага дваранства.

8 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вызвалены г. Браслаў.

8 ліпеня – 70 гадоў таму (1949) у Віцебску адкрыты гарадскі парк культуры і адпачынку імя Фрунзе.

9 ліпеня – 135 гадоў таму (1884) нарадзіўся Барадзін Міхаіл Маркавіч (сапр. Грузенберг; 1884–1951), рэвалюцыянер, савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч, ураджэнец г. п. Янавічы Віцебскага раёна.

10 ліпеня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Порахаў Фёдар Фёдаравіч (1914–1998), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, загадчык кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута (1964–1993).

10 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) пачалася Рэжыцка-Дзвінская аперацыя 1944, наступальная аперацыя савецкіх войскаў 2-га Прыбалтыйскага фронту (генерал

арміі А. І. Яроменка) у Вялікую Айчынную вайну. У ходзе аперацыі вызвалены райцэнтры Расоны, Верхнядзвінск (12 ліпеня), Асвея (17 ліпеня), чыгуначная станцыя Бігосава (18 ліпеня).

12 ліпеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Іваноў Павел Іванавіч (1909–1989), беларускі акцёр, рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі (1940). З 1929 г. – у Беларускім тэатры імя Я. Коласа. Ураджэнец г. Саратаў (Расія).

12 ліпеня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Кірылін Пётр Аляксеевіч (1954–2018), беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў (1996). Ураджэнец г. Віцебска.

14 ліпеня – 220 гадоў таму (1799) нарадзіўся Патоцкі Леан Станіслававіч (1799–1864), мемуарыст, пісьменнік, крытык, удзельнік паўстання 1830–1831, падарожнік, ураджэнец г. п. Коханава.

14 ліпеня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Апанасевіч Павел Андрэевіч, акадэмік НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1978), Дзяржаўнай прэміі СССР (1982), ураджэнец в. Стараселле Докшыцкага раёна.

15 ліпеня – 125 гадоў таму (1894) нарадзіўся Данкееў Уладзімір Уладзіміравіч (1894–1917), расійскі ваенны лётчык, Георгіеўскі кавалер, паручнік (1917), удзельнік 1-й Сусветнай вайны, ураджэнец г. Дзвінска Віцебскай губерні, зараз г. Даўгаўпілс (Латвія).

15 ліпеня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Макіёнак Іван Андрэевіч (1914–1944), удзельнік Вялікай Айчыннай

20 жніўня – 95 гадоў таму (1924) вёска Вярхоўе – цэнтр сельсавета Бешанковіцкага раёна Віцебскай акругі (1924–1930), з 1938 г. – Віцебскай вобласці. З 2017 года г. п. Вярхоўе – у складзе Чыгуначнага раёна г. Віцебска.

20 жніўня – 95 гадоў таму (1924) вёска Антаполле увайшла ў склад Чэрэйскага раёна Барысаўскай акругі, з 1927 г. – Аршанскай акругі, з 1931 г. – Чашніцкага раёна, з 1938 г. – Віцебскай вобласці.

20 жніўня – 95 гадоў таму (1924) вёска Вяркуды увайшла ў склад Ульскага раёна Полацкай акругі, з 1931 г. – Ушацкага раёна, з 1938 г. – Віцебскай вобласці.

20 жніўня – 95 гадоў таму (1924) вёска Гарбачэва ўвайшла ў склад Расонскага раёна (1924–1930), з 1935 г. – Полацкай акругі, з 1938 г. – Віцебскай вобласці.

20 жніўня – 95 гадоў таму (1924) вёска Верхняе Крывіна ўвайшла ў склад Бешанковіцкага раёна Віцебскай акругі (1924–1930). З 1938 г. – Віцебскай вобласці.

20 жніўня – 95 гадоў таму (1924) вёска Вялікія Дольцы – цэнтр сельсавета ва Ушацкім раёне Полацкай акругі (1924–1930). З 1938 г. – Віцебскай вобласці.

20 жніўня – 25 гадоў таму (1994) у в. Бачэйкава Бешанковіцкага раёна адбыўся I Міжнародны пленэр «Малевич. УНОВИС. Современность». У 1996 г. – у в. Ліпкі Лепельскага раёна.

21 жніўня – 145 гадоў таму (1874) нарадзіўся Беняшэвіч Уладзімір Мікалаевіч (1874–1938), гісторык царкоўнага права, візантыст, палеограф, ураджэнец г. п. Друя Браслаўскага раёна.

14 жніўня – 225 гадоў таму (1794) нарадзіўся Балінскі Міхаіл Ігнатавіч (1794–1863), гісторык, археолаг, музеязнавец, дзеяч асветы, магістр філасофіі (1815). Ураджэнец мёнтка Цярэспаль Полацкага павета.

14 жніўня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Хігрын Барыс Львовіч (1909–1941), удзельнік абароны г. п. Бялынічы ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1941), ураджэнец г. Оршы.

15 жніўня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Струеў Андрэй Сцяпанавіч (1904–1969), военачальнік, генерал-маёр артылерыі, ураджэнец г. Полацка.

15 жніўня – 95 гадоў таму (1924) у складзе Полацкай акругі ўтвораны сучасны Полацкі раён.

15 жніўня – 55 гадоў таму (1964) у Бешанковічах адкрыта дзіцячая музычная школа.

18 жніўня – 120 гадоў таму (1899) нарадзіўся Саўчанка Емяльян Рыгоравіч (1899–1966), военачальнік, генерал-маёр, ураджэнец г. Верхнядзвінска.

19 жніўня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Ганчароў Валянцін Уладзіміравіч (1939–1999), краязнаўца, настаўнік, даследчык гісторыі Бешанковіцкага раёна, аўтар прац «Л. І Сапега», «Бой пад Астроўна ў 1812 годзе».

20 жніўня – 95 гадоў таму (1924) вёска Дабрынь – цэнтр Дабрынскага сельсавета Аршанскай акругі (1924–1930), з 1938 г. – Віцебскай вобласці, з 1962 г. – Аршанскага раёна, з 1965 г. – Дубровенскага раёна.

20 жніўня – 95 гадоў таму (1924) вёска Багданава ўвайшла ў склад Сенненскага раёна Віцебскай акругі (1924–1930), з 1938 г. – Віцебскай вобласці.

вайны, Герой Савецкага Саюза (1945). З 1941 г. – на Чарнаморскім флоце. Удзельнік абароны Севастопаля, вызвалення Марыупаля, Наварасійска, Бярдзянска. Ураджэнец в. Гарадзілавічы Верхнядзвінскага раёна.

15 ліпеня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Кірпічэнка Аляксандр Андрэевіч (1939–2007), беларускі вучоны ў галіне псіхіятрыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец в. Чырына Віцебскага раёна. Працаваў у Віцебскім медыцынскім універсітэце.

16 ліпеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Крыўко Мікалай Нілавіч, беларускі мовазнавец, кандыдат філалагічных навук, ураджэнец в. Манякова Мёрскага раёна.

17 ліпеня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Чарнышоў Віктар Паўлавіч (1919–2008), беларускі архітэктар, заслужаны будаўнік Беларусі (1965). Працаваў галоўным архітэктарам г. Оршы, начальнікам Віцебскага філіяла Белдзяржпраекта, начальнікам Упраўлення па будаўніцтве і архітэктуры Віцебскага аблвыканкама. Ураджэнец г. Луганск (Украіна).

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Асвейскі раён у Полацкай акрузе (у складзе акругі да 26.07.1930 г. і з 21.06.1935 г.), адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–1959). З 20.02.1938 г. – у Віцебскай, з 20.09.1944 г. – у Полацкай, з 08.01.1954 г. – у Віцебскай абласцях. 08.08.1959 г. – скасаваны, тэрыторыя далучана да Дрысенскага раёна.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створана Віцебская акруга – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў БССР (1924–1930). Існавала да 26.07.1930 г.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Дрысенскі раён. Да 1930 г., з 1935 г. – у Полацкай акрузе, з 1938 г. – у Віцебскай вобласці, з 1944 г. – у Полацкай вобласці, з 1954 г. – у Віцебскай вобласці). Існаваў да 25.12.1962 г. З 1962 г. – Верхнядзвінскі раён.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) быў створаны Бягомльскі раён (1924–20.01.1960) у Барысаўскай акрузе.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Бешанковіцкі раён. Да 1930 г. – у Віцебскай акрузе, з 1938 г. – у Віцебскай вобласці.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) быў створаны Валынецкі раён у Полацкай акрузе – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–09.03.1929).

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Ветрынскі раён у складзе Полацкай акругі, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў БССР (17.07.1924–08.07.1931, 12.02.1935–20.01.1960).

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Гарадоцкі раён. Да 1930 г. – у Віцебскай акрузе, з 1938 г. – у Віцебскай вобласці.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Віцебскі раён. Да 1930 г. – у Віцебскай акрузе, у 1931 г. – скасаваны, у 1937 г. – адноўлены, з 1938 г. – у Віцебскай вобласці.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Багушэўскі раён – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР.

11 жніўня – 140 гадоў таму (1879) нарадзіўся Даўгапольскі Цодзік Львовіч (псеўд. Гарадокер; 1879–1959), пісьменнік, ураджэнец г. Гарадка.

11 жніўня – 45 гадоў таму (1974) у г. Полацку адкрыты помнік Францыску Скарыну.

12 жніўня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Караткоў Аляксей Іванавіч (1904–1943), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

12 жніўня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Галушкін Барыс Лаўрэнцьевіч (1919–1944), адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай і Мінскай абласцях у Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец г. Шахты Растоўскай вобласці (Расія).

13 жніўня – 130 гадоў таму (1889) нарадзіўся Савіцкі Іосіф Паўлавіч (1889–?), прафсаюзны работнік. З 1923 г. – старшыня Аршанскага ўчастка прафсаюза чыгуначнікаў. Ураджэнец в. Блудзень Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

13 жніўня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Захараў Іван Кузьміч (1909–1982), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944), заслужаны работнік культуры БССР (1980). Ураджэнец в. Ганявічы Лагойскага раёна Мінскай вобласці.

13 жніўня – 70 гадоў таму (1949) у Віцебскім раёне адкрыта цэнтральная ашчадная каса.

9 жніўня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Гірса Ніканор Міхайлавіч, партыйны дзеяч Беларусі. Працаваў начальнікам упраўлення народнай адукацыі Віцебскага абласнога Савета народных дэпутатаў.

9 жніўня – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Лазоўскі Дзмітрый Мікалаевіч, беларускі вучоны ў галіне будаўнічай механікі, доктар тэхнічных навук (1998), прафесар (1999). У 1999–2003 гг. – дэкан інжынерна-будаўнічага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, з 2003 г. – рэктар універсітэта. Ураджэнец в. Навінцы Мёрскага раёна.

10 жніўня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Белахвосцікаў Аляксандр Яфімавіч (1914–1943), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Віцебскага антыфашысцкага падполля ў Вялікую Ачынную вайну, ураджэнец в. Ляхавік Аршанскага раёна.

10 жніўня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Луцэвіч Андрэй Піліпавіч (1919–1944), Герой Савецкага Саюза (1944). Камандзір гарматнага разліку старшы сяржант вызначыўся пры фарсіраванні Заходняй Дзвіны на тэрыторыі Віцебскай вобласці (1944), ураджэнец в. Заазер'е Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

10 жніўня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Ставер Алесь (сапр. Аляксандр Сяргеевіч; 1929–1995), беларускі паэт, празаік, драматург, ураджэнец в. Маргавіца Докшыцкага раёна.

10 жніўня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Чысцякоў Мікалай Дзмітрыевіч, краязнаўца, гісторык, ураджэнец засц. Чарнічка-1 Докшыцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства (зараз – Докшыцкі раён).

Да 1930 г. – у Аршанскай акрузе, у 1931 г. – скасаваны, у 1935 г. – адноўлены, з 1938 г. – у Віцебскай вобласці, у 1960 г. – скасаваны.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Дубровенскі раён.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Дрэтунскі раён у Полацкай акрузе. Існаваў да 03.07.1925 г.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Езярышчанскі раён у Віцебскай акрузе (17.07.1924–26.07.1929, 18.03.1958–25.12.1962).

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Коханаўскі раён у Аршанскай акрузе (17.07.1924–08.07.1931, (09.09.1946–17.12.1956).

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Копыскі раён у Аршанскай акрузе. Існаваў да 08.07.1931 г.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Расонскі раён, да 26.07.1930 г. – у Полацкай акрузе.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Полацкі раён, да 26.07.1930 г. і з 21.06.1935 г. – у Полацкай акрузе.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створана Полацкая акруга, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР. 26.07.1930 г. – скасавана, 21.06.1935 г. – зноў утворана (5 раёнаў: Ветрынскі, Дрысенскі, Асвейскі, Полацкі і Расонскі), 20.02.1938 г. – скасавана (усе раёны ўключаны ў Віцебскую вобласць).

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Лёзненскі раён. Да 26.07.1930 г. – у Віцебскай акрузе, з 20.02.1938 г. – у Віцебскай вобласці.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Лепельскі раён, да 09.06.1927 г. – у Барысаўскім, да 26.07.1930 г. – у Полацкім раёнах.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Мяжанскі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–1931). Да 26.07.1930 г. – у Віцебскай акрузе.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Лосвідскі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР. З 29.10.1924 г. – Кузняцоўскі раён, цэнтр перанесены ў г. Віцебск.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Суражскі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–1960). Да 26.07.1930 г. – у Віцебскай акрузе, з 20.02.1938 г. – у Віцебскай вобласці, 20.01.1960 г. – скасаваны.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Сенненскі раён, да 26.07.1930 г. – у Віцебскай акрузе.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Ушацкі раён, да 26.07.1930 г. – у Полацкай акрузе.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створана Аршанская акруга, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–1930). Уключала частку тэрыторыі Віцебскага, Магілёўскага, Мсціслаўскага, Сенненскага і Чавускага паветаў. 26.07.1930 г. – скасавана.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Аршанскі раён, да 26.07.1930 г. – у Аршанскай акрузе.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Ляднянскі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР

таксікалагічнай хіміі, доктар фармацэўтычных навук (1990), кандыдат хімічных навук, прафесар. З 1986 г. – загадчык кафедры таксікалагічнай і аналітычнай хіміі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Член Нью-Ёркскай акадэміі навук (ЗША). Аўтар больш за 400 навуковых і вучэбна-метадычных работ. Ураджэнец в. Мядзвёдка Віцебскага раёна.

7 жніўня – 90 гадоў таму (1929) у Віцебску была адкрыта прафшкола кулінараў.

7 жніўня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Шкуратаў Генадзь Васілевіч (1949–2007), беларускі акцёр, заслужаны артыст Беларусі. Працаваў у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа.

7 жніўня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Трусаў Алег Анатолевіч, беларускі археолаг, гісторык архітэктуры, публіцыст, кандыдат гістарычных навук (1981). У 1999–2017 гг. – старшыня Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны. Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Распрацаваў методыку архітэктурна-археалагічнага вывучэння манументальных помнікаў дойлідства Беларусі. Праводзіў раскопкі Благавешчанскай царквы ў Віцебску.

8 жніўня – 60 гадоў таму (1959) скасаваны Асвейскі раён.

медалём імя І. У. Мічурына, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1945). Доктар сельскагаспадарчых навук (1967), прафесар (1968). У 1959–1968 гг. – загадчык кафедры прыватнай жывёлагадоўлі Віцебскага ветэрынарнага інстытута, у 1960–1965 гг. – дэкан заатэхнічнага факультэта. Ураджэнец г. Кастрама (Расія).

4 жніўня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Сальнікаў Уладзімір Аляксандравіч (1924–1982), беларускі канструктар радыёэлектроннай апаратуры і вылічальнай тэхнікі. Працоўную дзейнасць пачаў на Віцебскім заводзе электравымяральных прыбораў (1953).

5 жніўня – 175 гадоў таму (1844) нарадзіўся Рэпін Ілья Яфімавіч (1844–1930), расійскі жывапісец, графік, педагог. У 1892–1904 гг. перыядычна працаваў у маёнтку Здраўнёва ў Віцебскім раёне. Ураджэнец г. Чугуеў Харкаўскай вобласці (Украіна).

5 жніўня – 95 гадоў таму (1924) нарадзіўся Жураўскі Аркадзь Іосіфавіч (1924–2009), беларускі мовазнавец, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1980), доктар філалагічных навук (1968), прафесар (1970), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1978), ураджэнец в. Янава Талачынскага раёна.

6 жніўня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Гарбуноў Цімафей Сазонавіч (1904–1969), дзяржаўны і партыйны дзеяч БССР, гісторык, ураджэнец в. Саннікі Бешанковіцкага раёна.

6 жніўня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Жабянцяеў Аляксандр Ільіч, вучоны ў галіне аналітычнай і

(1924–1931). 08.07.1931 г. – скасаваны, тэрыторыя далучана да Дубровенскага раёна.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Чарэйскі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–1931), часткова на тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці. Да 09.06.1927 г. – у Барысаўскім, да 26.07.1930 г. – у Аршанскім акругах, 08.07.1931 г. – скасаваны, сельсаветы перададзены Крупскаму і Чашніцкаму раёнам.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Чашніцкі раён, да 26.07.1930 г. – у Віцебскай акрузе.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Ульскі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка (1924–1931, 1946–1956). Да 26.07.1930 г. – у Полацкай акрузе.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Сіроцінскі раён, да 26.07.1930 . – у Віцебскай акрузе, з 20.02.1938 г. – у Віцебскай вобласці, 23.11.1961 г. перайменаваны ў Шумілінскі, 25.12.1962 г. – скасаваны, сельсаветы перададзены Бешанковіцкаму, Віцебскаму, Гарадоцкаму і Полацкаму раёнам. 30.07.1966 г. створаны зноў.

17 ліпеня – 95 гадоў таму (1924) створаны Талачынскі раён, да 26.07.1930 г. – у Аршанскай акрузе.

17 ліпеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Ламан Пётр Аляксандравіч, беларускі акцёр, паэт, празаік, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. У 2016 годзе ўзнагароджаны медалём

Францыска Скарыны. Ураджэнец в. Маласельцы, Карэліцкага раёна, Гродзенскай вобласці.

17 ліпеня – 60 гадоў таму (1959) нарадзілася Русілка Вольга Іванаўна, беларуская паэтэса, літаратуразнаўца. З 1984 г. працуе ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава (у 1992–2015 гг. – загадчык кафедры беларускай літаратуры). Кандыдат філалагічных навук (1987), дацэнт. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (2004) і «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2014). Ураджэнка в. Бершты Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці.

18 ліпеня – 115 гадоў таму (1904) нарадзілася Радзялоўская Алена Паўлаўна (1904–1971), беларуская актрыса. Працавала ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

18 ліпеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Вішнеўскі Сяргей Антонавіч (1909–1992), беларускі мастак, фатограф, арганізатар фотаатэлье. Працаваў настаўнікам малявання ў Докшыцкай СШ, мастаком-афарміцелем, ураджэнец г. Шаўляй (Літва).

18 ліпеня – 90 гадоў таму (1929) нарадзіўся Кавалевіч Аляксей Пятровіч (1929–2014), журналіст, паэт, краязнаўца, настаўнік, даследчык гісторыі Мёрскага раёна, аўтар кніг краязнаўчай тэматыкі, ураджэнец в. Мілявічы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці.

18 ліпеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Арлоў Алег Рыгоравіч (1934–1995), беларускі жывапісец, педагог. У

аблвыканкаме. Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, па справах моладзі, рэлігій і нацыянальнасцей.

31 ліпеня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Касцюшка Іван Іванавіч (1919–2018), гісторык-славіст, доктар гістарычных навук, прафесар, першы галоўны рэдактар часопіса «Советское славяноведение». Ураджэнец в. Букарава Талачынскага раёна.

100 гадоў;– таму (1919) у Віцебску створаны музей сучаснага мастацтва.

20 гадоў;– таму (1999) у Полацку на базе дзіцячага садка № 17 створаны Цэнтр развіцця дзіцяці.

1 жніўня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Сарокін Уладзімір Канстанцінавіч (1914–1997), кампазітар, ураджэнец г. Полацка.

2 жніўня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Анапрыенка Фрыдрых Аляксандравіч, краязнавец, гісторык, складальнік карты валуноў Шуміліншчыны, ураджэнец Данецкай вобласці.

4 жніўня – 115 гадоў таму (1904) нарадзіўся Горскі Мікалай Аляксеевіч (1904–1968), беларускі вучоны ў галіне селекцыі сельскагаспадарчых жывёл. Узнагароджаны ордэнам Леніна, залатым

27 ліпеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Вавілаў Антон Уладзіміравіч, беларускі вучоны ў галіне машынабудавання, механізацыі будаўніцтва і нетрадыцыйнай энергетыкі, доктар тэхнічных навук (1991), прафесар (1992). Акадэмік Беларускай горнай акадэміі (1996), Беларускай інжынернай акадэміі (1997), член Расійскай акадэміі архітэктуры і будаўнічых навук (1999). Ураджэнец г. Паставы.

28 ліпеня – 70 гадоў таму (1949) нарадзіўся Чукін Валерый Віктаравіч (1949–2016), беларускі мастак, Член Беларускага саюза мастакоў (1975). З 1987 г. – член творчага аб'яднання «Квадрат». Ураджэнец в. Сітнякі Кіеўскай вобласці (Украіна).

28 ліпеня – 65 гадоў таму (1954) нарадзіўся Ермалёнак Вітольд Антонавіч, настаўнік, гісторык, краязнавец, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (1999), лаўрэат ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2009». Ураджэнец в. Жаймяны Браслаўскага раёна.

29 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) нарадзілася Воранава Людміла Пятроўна (1944–1997), беларускі графік, закончыла Віцебскі педагагічны інстытут (1967).

29 ліпеня – 70 гадоў таму (1949) адкрыта атэлье мод у г. Віцебску.

29 ліпеня – 60 гадоў таму (1959) нарадзіўся Гнуценка Пётр Уладзіміравіч, беларускі журналіст, грамадскі дзеяч, ураджэнец в. Уна Лёзненскага раёна. З 1984 г. працаваў у газеце «Рабочее слово» (Віцебскі тэлезавод). З 1997 г. – у Віцебскім

1966–1994 гг. выкладаў у Віцебскім педагагічным інстытуце.

18 ліпеня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Шутаў Генадзь Фёдаравіч (1939–2017), беларускі мастак, акварэліст, графік, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. У 1976–1986 гг. – старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Саюза мастакоў Беларусі. Ураджэнец г. Запарожжа (Украіна).

18 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) нарадзіўся Наско Эміль Вікенцьевіч, беларускі кампазітар, ураджэнец в. Валкалата Докшыцкага раёна.

19 ліпеня – 150 гадоў таму (1869) нарадзіўся Вітан-Дубейкаўскі Лявон Іванавіч (сапр. Дубяйкоўскі, Дубейкаўскі; 1869–1940), беларускі архітэктар, педагог, паэт. Аднаўляў касцёлы ў Оршы, вёсцы Смаляны на Аршаншчыне, спраектаваў Відзаўскую Успенскую царкву (1922), Дрысвяцкі Петрапаўлаўскі касцёл на Браслаўшчыне.

19 ліпеня – 110 гадоў таму (1909) нарадзіўся Грыцавец Сяргей Іванавіч (1909–1939), двойчы Герой Савецкага Саюза (1939). Скончыў Арэнбургскую ваенную школу лётчыкаў (1932), школу паветранага бою (1936), загінуў у авіякатастрофе каля в. Балбасава Аршанскага раёна (1939), ураджэнец в. Бараўцы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

19 ліпеня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Барсукоў Міхаіл Захаравіч (1919–1979), беларускі архітэктар, ураджэнец в. Лучна Полацкага раёна.

19 ліпеня – 100 гадоў таму (1919) нарадзіўся Салянікаў Анатоль Данілавіч (1919–2010), ваенны дзеяч, Герой

Савецкага Саюза (1944), з 1942 г. – камандзір эскадрыллі штурмавікоў на Бранскім, 2–м Прыбалтыйскім франтах у Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Чурылава Аршанскага раёна.

20 ліпеня – 105 гадоў таму (1914) нарадзіўся Багарад Рыгор Абрамавіч (1914–2004), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец г. Віцебска.

20 ліпеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзілася Каробушкіна Таццяна Мікалаеўна, беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук (1977). Даследавала старажытны Полацк. Ураджэнка в. Кубышка Цвярской вобласці (Расія).

22 ліпеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзілася Салавей Ларыса Фёдараўна, мастацтвазнаўца, заслужаны настаўнік БССР (1975), член Беларускага саюза мастакоў (1984) – Ураджэнка г. Оршы.

23 ліпеня – 80 гадоў таму (1939) нарадзіўся Кірвель Анатоль Мяфодзьевіч (1939–2008), пісьменнік, ураджэнец в. Вітунічы Докшыцкага раёна.

23 ліпеня – 75 гадоў таму (1944) за вызваленне г. Полацка ў ходзе Полацкай аперацыі 1944 ганаровыя найменні «Полацкія вайсковыя злучэнні і часці» паводле загада ВГК ад 23.07.1944 г. атрымалі 31 злучаная і часць 4-й ударнай, 6-й гвардзейскай і 3-й паветранай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту.

24 ліпеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Гарбук Генадзь Міхайлавіч (1934–2018), народны артыст Беларусі (1980). У 1958–1962 гг. – акцёр Беларускага тэатра імя Я. Коласа, у 1962–2018 гг. – акцёр

Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1966), Дзяржаўнай прэміі СССР (1984), прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2007), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (1995). Ураджэнец в. Глыбачка Ушацкага раёна.

25 ліпеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Лебедзь Сямён Сцяпанавіч, беларускі вучоны ў галіне машынабудавання, доктар тэхнічных навук, ураджэнец в. Казяны Браслаўскага раёна.

27 ліпеня – 90 гадоў таму (1929) нарадзілася Асіповіч Жанна Сямёнаўна (1929–2006), беларускі вучоны-медык у галіне анатоміі. Доктар медыцынскіх навук (1975), прафесар (1980). З 1959 г. выкладала ў Віцебскім медыцынскім інстытуце. З 1960 г. – загадчык кафедры анатоміі і фізіялогіі Віцебскага педагагічнага інстытута. З 1992 г. – прафесар кафедры асноў медыцынскіх ведаў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. Ураджэнка г. Віцебска.

27 ліпеня – 85 гадоў таму (1934) нарадзіўся Карасёў Мікалай Піліпавіч (1934–2017), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар ветэрынарных навук (1988), прафесар (1990). З 1959 г. – старшы навуковы супрацоўнік у Бярэзінскім біясферным запаведніку, з 1970 г. – у Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Ураджэнец в. Пісарава Шумілінскага раёна.